Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 44 (4435) 2 лістапада 2007 г.

У нумары:

Дарагія ўспаміны

Міхась Міцкевіч — малодшы сын Якуба Коласа — расказвае пра свайго бацьку.

Стар. 4

Шляхамі моўных удасканаленняў

Пра новую рэдакцыю «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».

Стар. 7

Бясконцым здаваўся дзень...

Старонкі з аповесці Вадзіма Кораня пра няпростыя падзеі ў жыцці Якуба Коласа восенню 1930 года.

Стар. 9

Якуб Колас і Аляксандр Фадзееў

Цёплыя сяброўскія сувязі двух пісьменнікаў увасабляюць еднасць двух народаў.

Стар. 13

Мінск як сімвал духу творчага

Мінскія адрасы Якуба Коласа — нашы святыя мясціны.

Стар. 14

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2008 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў: 1 месяц — 6400 руб. Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска: 1 месяц — 8300 руб. Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: першае паўгоддзе, на 1 месяц — 4400 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска: 1 месяц — 6500 руб. Падпісны індэкс — 63880

ПАДПІСАЦЦА НА ШТОТЫДНЁВІК «ЛіМ» МОЖНА З ЛЮБОГА МЕСЯЦА

Якубу Коласу

Мы выляталі з-пад твайго крыла,
Як птушаняты,
у палёт свой першы.
І праз гады нас вабіла, вяла
Пявучая і поўная святла
Паэзія і праўда тваіх вершаў.

Няхай нам тых не дасягнуць высот,
Дзе ты лунаў, нібы арол свабодны,
Ты навучыў нас, як любіць народ,
Як з ім ісці плячо ў плячо ўпярод
І як адданым быць краіне роднай!..

Эдуард ВАЛАСЕВІЧ

Думы Якуба Коласа

Вы адчуйце,
што я не каменны,
Не бяздумна
на плошчы сяджу.
Я — жывы, і штоміг,
задуменны,
Пільна ў вашыя вочы гляджу.

Бачу, бачу, браткі-беларусы,
Горды нораў краіны маёй.
Я народам яе ганаруся
І квітнеючай роднай зямлёй.

Волю ён не аддаў у кайданы
І будуе свой велічны дом,
Шчырай працы і міру адданы,
Не скароны далярам, рублём...

Я спяваць вам узнёсла гатовы,
Толькі боязна часам, браты,
Каб не трапіла матчына мова
У ганебны палон нематы.

Мне трывожна бывае
за горад,
Што ад вёскі-матулечкі ўцёк:
Той спазнае пакутнае гора,
Хто забудзе
свой чысты выток.

А яшчэ я нярэдка самотны,
Дарагія браточкі, таму,
Што заблуды
з глыбіняў народных
Прагнуць бедаў
рупліўцу свайму.

Прэч разлады,
адкіньце заганы!
Шчырай працы настала пара.
З Боскай ласкі
народам абраны
Шлях да згоды, да волі, дабра.

Сын святой Беларусі любімай,
Я з высокіх святлістых нябёс
Слаўлю дзень твой
стваральны, Радзіма,
Веру ў твой
найшчаслівейшы лёс.

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Прэм'ера ў Пінску

Да юбілею Якуба Коласа Палескі драматычны тэатр горада Пінска звярнуўся да драмы лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Георгія Марчука "Адзавіся, брат", прысвечанай маладым гадам паэта, яго жыццю і працы на Палессі. Ролю паэта выканаў Павел Рыжоў, ролю следчага — Павел Мамонаў. Рэжысёр-пастаноўшчык і афарміцель спектакля — галоўны рэжысёр тэатра Іван Базан. У гэтым спектаклі занята ўся трупа тэатра, якая працуе з натхненнем і этузіязмам. Спектакль зрабіўся падзеяй у культурным жыцці горада, карыстаецца вялікім поспехам у моладзі.

Марыя РУДОВІЧ

Фэст пачынаецца!

4 лістапада ў сталічнай філармоніі ўрачыста адкрыецца XXXIV Міжнародны фестываль мастацтваў "Беларуская музычная восень". Вялікая зала запрашае на канцэрт Акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі з удзелам расійскіх гасцей (дырыжор Юрый Кочнеў, салістка Вольга Юр'ева). А ў Малой зале імя Р. Шырмы выступіць Дзяржаўны камерны хор Беларусі пад кіраўніцтвам Наталлі Міхайлавай. У праграме, прысвечанай 125-годдзю Янкі Купалы і Якуба Коласа, прагучаць творы А. Атрашкевіч, А. Безенсон, С. Бельцюкова, М. Васючкова, І. Лучанка, У. Прохарава ды іншых беларускіх кампазітараў.

С. ВЕТКА

Святло нязгаснага слова

Літаратурная дзейнасць Якуба Коласа працягвалася амаль шэсцьдзесят гадоў. Першыя свае вершы ён напісаў падчас навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Колас быў не толькі паэтам, але і выдатным педагогам. Каля трыццаці гадоў працаваў ён на ніве асветы, вучыў дзяцей і дарослых, ствараў школы і бібліятэкі, праводзіў вялікую асветную работу. Адметны паэт быў таксама драматургам, публіцыстам, перакладчыкам. Створанае ім у гэтых галінах творчасці і па сёння не страціла сваёй значнасці і каштоўнасці.

"Нязгаснае слова паэта". Менавіта такую назву мела літаратурная імпрэза, прымеркаваная да 125-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, якая ладзілася ў інфармацыйна-выставачным цэнтры Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

На выстаўцы, арганізаванай у рамках гэтага мерапрыемства, увазе наведвальнікаў прапаноўваліся фрагменты велізарнай і разнастайнай літаратурнай спадчыны песняра, што зберагаецца ў фондах установы. Гэта і грунтоўныя выданні кшталту шматтомных зборaў твораў, і асобныя зборнікі, кнігі, выдадзеныя ў розныя часы, у тым ліку і ў перакладах на іншыя мовы народаў свету. Асаблівую цікавасць сярод прыжыццёвых выданняў выклікаюць кнігі з дарчымі надпісамі пісьменніка розным асобам.

Увазе гасцей вечарыны — электронная прэзентацыя "Я прыйшоў у жыццё не для сябе самога — я прыйшоў дзеля вас...". У экспазіцыі — узоры эпісталярнай спадчыны паэта. Бо, як вядома, Якуб Колас вёў шырокую перапіску: яго карэспандэнтамі былі людзі самага рознага ўзросту і сацыяльнага статуса. Дапаўняюць выстаўку фотаздымкі песняра, яго родных, блізкіх, а таксама творы мастацтва, прысвечаныя Коласу.

У мерапрыемстве бралі ўдзел нашчадкі Якуба Коласа, супрацоўнікі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея песняра, Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, бібліятэкары, моладзь...

Юбілей літаратурнага класіка — гэта не проста юбілей аднаго чалавека, гэта юбілей народа, бо з лёсаў яго лепшых сыноў складаецца лёс Бацькаўшчыны.

На здымку: уваходная вежа кляштара бенедыктынак, у будынках якога з 1875 года па 1919-ы размяшчалася Нясвіжская настаўніцкая семінарыя.

Тэкст і фота
Віктара Кавалёва

Родныя вобразы

У Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы пры падтрымцы Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі прайшлі Другія Мінскія паэтычныя чытанні, назвай якіх стаў такі знаёмы яшчэ са школьных часоў радок "Вобразы мілыя роднага краю..." Гэта вечарына, як, дарэчы, і многія іншыя сёлетнія імпрэзы, была прысвечана 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Міхась Пазнякоў, Мікола Шабовіч, Мікола Мятліцкі, Навум Гальпяровіч ды іншыя прачыталі свае новыя творы. Чытанні прысвячаліся юбілеям песняроў, а значыць і без вершаў, адрасаваных класікам, не абышлося. Падчас вечарыны спяваў і вядомы бард Алесь Камоцкі...

Паралельна з чытаннем вершаў на экране дэманстраваліся слайды, якія адлюстроўвалі асноўныя этапы жыцця і творчасці класікаў, знаёмілі прысутных з выявамі іх першых зборнікаў, фотаздымкамі іхніх сваякоў. Супрацоўнікі бібліятэкі зрабілі таксама выставу твораў класікаў-юбіляраў.

Анатоль ВАСІЛЬЧАНКА

Фота аўтара

Творцу... вучонаму... педагогу...

У галерэі "Лабірынт", што ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, адкрылася юбілейная кніжна-дакументальная выстаўка "Беларусь, ён дастойны змагар твой і сын", прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Сумеснымі намаганнямі яе наладзілі галоўная бібліятэка краіны і Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.

Чым далей адыходзім мы ад таго часу, калі загучала мастацкае слова песняра, тым больш пераконваемся ў яго жыватворчай сіле. Народны паэт Беларусі, адзін з заснавальнікаў сучаснай айчыннай літаратуры і літаратурнай мовы, вучоны, грамадскі дзеяч, педагог, акадэмік НАН Беларусі, Якуб Колас пяцьдзесят гадоў працаваў на ніве нацыянальнай культуры і асветы.

У экспазіцыі выстаўкі — больш як 200 дакументаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама арыгінальныя дакументы пра міжнародную, навуковую і грамадскую дзейнасць Коласа з Нацыянальнага архіва нашай краіны. Да слова, шэраг матэрыялаў выстаўляецца ўпершыню.

Ва ўрачыстым адкрыцці выстаўкі бралі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў культуры і інфармацыі Беларусі, дырэктары і супрацоўнікі бібліятэк, Нацыянальнага архіва Беларусі, выдавецтваў... Свае замалёўкі на тэмы коласаўскіх твораў прадставілі артысты тэатра і кіно.

В. К.

«Факультэт паэзіі» запрашае...

Першага лістапада ў аддзеле беларускай літаратуры Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна адбылася вечарына-прэзентацыя зборніка вершаў маладых паэтаў "Факультэт паэзіі". У кнігу ўвайшлі творы цяперашніх і колішніх студэнтаў Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. Выданне, падрыхтаванае адмыслова да юбілею Якуба Коласа, выйшла пад рэдакцыяй кандыдата філалагічных навук, дацэнта, загадчыка кафедры беларускай літаратуры, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Вольгі Русілкі.

— Прэзентацыя — адно з мерапрыемстваў, прымеркаваных да юбілею знаных песняроў. У нас сабрана шмат матэрыялаў пра жыццё і творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа, маюцца унікальныя выданні твораў класікаў, пачынаючы з 1942 года, кнігі, выдадзеныя ў Нью-Йорку, Мюнхене, шмат сучасных выданняў і літаратуразнаўчых прац, — падкрэслівае загадчыца аддзела беларускай літаратуры Ірына Фёдарава. — Каб бліжэй пазнаёміць карыстальнікаў бібліятэкі з гэтым матэрыялам, больш поўна раскрыць перад чытачамі асобы Купалы і Коласа, іх творчасць, супрацоўнікамі распрацаваны цыкл выстаў пад агульнай назвай "У вянок песнярам". Гэта найперш выстава, прысвечаная сяброўству Янкі Купалы і Якуба Коласа, даследаванням іх творчасці — "Свайму народу — песень дар". "Пісаць для шчаслівай дзетвары" — выстава, на якой прадстаўлены творы нашых класікаў, напісаныя для дзяцей, выданні, прысвечаныя педагагічнай дзейнасці геніяльных творцаў.

"Купалавы сцежкі" — выстава аб жыццёвым і творчым шляху Янкі Купалы. А ў экспазіцыі "Крыніцы натхнення: Купала, Колас, мастацтва..." расказваецца пра ўнёсак Янкі Купалы і Якуба Коласа ў беларускае мастацтва, а таксама пра вобразы вялікіх песняроў у самых розных галінах мастацтва — тэатры, кіно, музыцы, жывапісу. Спецыяльная выстава прысвечана жыццёваму і творчаму шляху Якуба Коласа, прапануем таксама шэраг матэрыялаў пра ўшанаванне памяці класікаў беларускай літаратуры.

У межах святкавання 125-гадовага юбілею паэтаў у лістападзе яшчэ мяркуецца правядзенне мерапрыемства, у якім возьмуць удзел пісьменнікі, навукоўцы, студэнты універсітэтаў і каледжаў, навучэнцы гімназій, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі горада над Дзвіной.

Ул. інф.

Па мясцінах пані Манькоўскай

Зоф'я Манькоўская (літаратурны псеўданім Адам М-скі) — адна са знакавых постацей у польскамоўнай літаратуры Беларусі. Сёлета святкуецца 160-годдзе з дня нараджэння гэтай загадкавай і вытанчанай паэтэсы, якая ў сваіх псіхалагічных, поўных драматызму, любові і свабодалюбства вершах апявала былую веліч і аплаквала цяжкі лёс роднага краю.

Нарадзілася Зоф'я Манькоўская ў беларускім шляхецкім фальварку на Случчыне — сучаснай Капыльшчыне. Менавіта там, у яе родных мясцінах, 16 лістапада адбудуцца святкаванні, прысвечаныя юбілею паэткі. У праграме, прапанаванай арганізатарамі (сярод якіх Мінскі аблвыканкам, упраўленне культуры і адукацыі Капыльскага райвыканкама, БДУ), — наведванне месца пахавання Зоф'і Манькоўскай у вёсцы Бабоўня, а таксама сядзібы славутага вучонага Якуба Наркевіча-Ёдкі ў вёсцы Наднёман Уздзенскага раёна, экскурсія па родных мясцінах паэткі (вёска Дарагавіца, урочышча Стары двор), дэманстрацыя відэафільма, прысвечанага яе жыццю, дыскусіі ды паэтычныя чытанні.

Больш падрабязна пра рамантычную і патрыятычную асобу Зоф'і Манькоўскай, а таксама пра святкаванне яе юбілею можна будзе прачытаць у бліжэйшых нумарах "ЛіМа" і ў дзесятым нумары часопіса "Маладосць", які прысвечаны 160-годдзю з дня нараджэння паэткі.

Саша ДОРСКАЯ

У адзінай прасторы

На днях да студэнтаў і выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў завіталі літаратары: намеснік галоўнага рэдактара "Краязнаўчай газеты" Генрых Далідовіч, галоўныя рэдактары часопіса "Всемирная литература" і штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва", адпаведна, Алесь Наварыч і Анатоль Казлоў.

Ініцыятарам сустрэчы выступіла вядучы спецыяліст універсітэцкай бібліятэкі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Таіса Гурко-Супрановіч. У часе мерапрыемства Таіса Іосіфаўна прадстаўляла гасцей, расказвала пра асабістыя стасункі з творцамі і творчыя набыткі кожнага з выступоўцаў. Да слова, увагу прысутных прыцягваў гожы стэнд з выданнямі, у якіх працуюць вышэйназваныя літаратары.

Галоўны рэдактар "ЛіМа" Анатоль Казлоў павёў гаворку пра юбілейны, 75-ы год газеты, пра сустрэчы з творцамі, бібліятэкарамі, навучэнцамі і выкладчыкамі, якія адбыліся ва ўсіх абласных цэнтрах краіны. Ён зазначыў, што на старонках тыднёвіка "Літаратура і мастацтва" друкаваліся ўсе беларускія пісьменнікі, пачынаючы ад Янкі Купалы і Якуба Коласа, юбілеі якіх шырока адзначаюцца па ўсёй Беларусі. У сваю чаргу рэдакцыяй штотыднёвіка падрыхтаваны тэматычныя нумары да дня народзін песняроў. Галоўны рэдактар расказаў прысутным пра асобныя публікацыі, рубрыкі, аддзелы выдання і акцэнтаваў іх увагу на тым, што пачалася падпіска на тыднёвік "ЛіМ" на першае паўгоддзе наступнага года. Бо студэнтам такой спецыялізаванай вышэйшай навучальнай установы, як універсітэт культуры і мастацтваў, ды і педагогам, гэтае выданне будзе вельмі карысным. Таксама А. Казлоў запрасіў да супрацоўніцтва ўсіх, хто любіць роднае слова, піша прозу або складае вершы.

З матэрыяламі ды артыкуламі "Краязнаўчай газеты" студэнтаў азнаёміў намеснік галоўнага рэдактара выдання Генрых Далідовіч. Ён расказаў пра нялёгкі жыццёвы і творчы шлях, а таксама пра малавядомыя, часам загадкавыя і спрэчныя факты з біяграфій Купалы і Коласа, пра новае прачытанне іх літаратурнай спадчыны. Генрых Вацлававіч падкрэсліў, што і літаратары, і студэнты ВНУ працуюць у адным рэчышчы — на карысць нацыянальнай культуры.

У сваім выступленні галоўны рэдактар часопіса "Всемирная литература" Алесь Наварыч закрануў пытанні супрацоўніцтва з замежнымі аўтарамі і адзначыў, што творы, якія змяшчаюцца ў выданні, — арыгінальныя: яны ніколі яшчэ не перакладаліся і не друкаваліся на рускай мове... А. Наварыч зрабіў акцэнт на тым, што калі не будзе роднай мовы — не будзе народа і краіны. Бо нашу рэспубліку як краіну стварылі пісьменнікі, а не палітыкі.

Напрыканцы сустрэчы госці навучальнай установы адказвалі на шматлікія пытанні, якія, як і само мерапрыемства, датычыліся розных бакоў рэдакцыйных спраў.

Віктар КАВАЛЁЎ
Фота аўтара

Віталі армянскую культуру

З 22 па 28 кастрычніка Беларусь упершыню на сваёй зямлі вітала Дні культуры Рэспублікі Арменія.

Адкрыліся Дні культуры ў кінатэатры "Ракета" паказам дакументальнага фільма "Я памёр у дзяцінстве", які прысвечаны знакамітаму армянскаму кінарэжысёру Сяргею Параджанаву. Аўтар фільма — пляменнік кіназнакамітасці Георгія Параджанава. З імем творцы звязана і фотавыстава "Мастацтва без межаў. Свет Сяргея Параджанава", якая прайшла ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі. Акрамя гэтага праграма ўключала спектаклі Ерэванскага камернага тэатра, выступленне Маладзёжнага сімфанічнага аркестра Арменіі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, гала-канцэрт у Белдзяржфілармоніі, наведванне Бабруйска, Маладзечна і Брэстчыны, сустрэчы з прадстаўнікамі армянскай дыяспары, якая сёння складае больш як 10 тыс. чалавек.

Сумеснае культурнае супрацоўніцтва толькі набірае моц. За апошнія гады прадстаўнікі Арменіі ўдзельнічалі ў фестывалях "Славянскі базар у Віцебску", "Белая вежа" і "Лістапад"; у Мінску экспанаваліся буйныя выставы мастакоў Акопа Акапяна і Марціроса Сар'яна. У 2005 годзе ў Арменіі прайшлі Дні культуры Беларусі. А ў гэтым годзе ў Нацыянальнай дзіцячай бібліятэцы Арменіі была адкрыта выстава беларускай дзіцячай літаратуры. Зараз армяне прывезлі ў адказ падарункі для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Ёсць ва ўзаемаадносінах беларускага і армянскага народаў і гістарычныя карані. Як зазначыў дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі Сяргей Вечар, армяне ў розныя эпохі пражывалі і на тэрыторыі, якую цяпер займае наша рэспубліка. Ён прыгадаў цікавы факт з вытокаў заснавання знакамітай Слуцкай мануфактуры, якая выпускала залататканыя паясы. У свой час князь Радзівіл запрасіў для яе заснавання Яна Маджарскага, чалавека з армянскімі каранямі.

Такім чынам, падмурак для трывалых сяброўскіх сувязяў у нашых краін ужо ёсць. Міністр культуры Рэспублікі Арменія Асмік Пагасян лічыць, што падставай для новых сумесных праектаў можа стаць юбілей кампазітара Арама Хачатурана, 105-годдзе якога будзе адзначацца ў 2008 годзе.

У планах — падпісанне праграмы супрацоўніцтва Арменіі і Беларусі ў сферы культуры на 2008—2010 гг, якая, на думку Асмік Пагасян, павінна замацаваць сістэмнасць міжкультурных кантактаў, стаць больш змястоўнай, канкрэтнай і маштабнай.

Уладзімір ШУГАВЕЕЎ

Нобель — каралеўскі вянец

Брытанка Дорыс Лесінг стала адзінаццатай жанчынай, якая атрымала Нобелеўскую прэмію ў галіне літаратуры. 10 снежня ў Стакгольме кароль Карл Густаў XVI уручыць 87-гадовай пісьменніцы ўзнагароду Шведскай акадэміі (1,54 млн долараў). "Я атрымала ўсе ўзнагароды ў Еўропе да адной — усе гэтыя чортавы ўзнагароды. Я вельмі рада. Нобель — як каралеўскі вянец, як джокер у картах", — сказала Лесінг журналістам.

Нарадзілася яна ў Персіі (цяперашнім Іране). Бацька яе працаваў у аддзяленні Imperial Bank горада Керманшах, маці была медсястрой. У 1925 годзе сям'я пераехала ў Паўднёвую Радэзію, дзе прайшлі дзяцінства і маладосць пісьменніцы.

З 13-ці гадоў яна займалася самаадукацыяй, шмат чытала. У 15 гадоў пакінула сям'ю, пайшла працаваць пакаёўкай. Тады яна пачала пісаць, публікавацца ў газетах. У 1937 г. Дорыс пераехала ў Солсберы, сталіцу Паўднёвай Радэзіі, уладкавалася тэлефаністкай. У 19 гадоў яна выйшла замуж за Фрэнка Віздама, нарадзіла дваіх дзяцей. Праз некалькі гадоў у пракамуністычным Left Book Club-е яна пазнаёмілася з Готфрыдам Лесінгам (у будучыні — паслом Нямеччыны ва Угандзе), які стаў яе другім мужам, у іх нарадзіўся сын. Дорыс Лесінг расчаравалася ў камунізме толькі ў 1956 годзе, калі была задушана рэвалюцыя ў Венгрыі.

Хоць сёння яе ведаюць найперш як пісьменніцу-феміністку, творчасць Лесінг не абмяжоўваецца псіхалагічнымі творамі на "жаночую" тэматыку. Яна шмат напісала пра жыццё Паўднёвай Афрыкі, дзе прайшло яе маленства, уздымала тэмы расізму, сацыяльнай няроўнасці.

Дорыс Лесінг захапляла суфізмам (містычна-аскетычная плынь ісламскага вучэння), што стала падставай для стварэння цыкла з пяці навукова-фантастычных раманаў «Canopus in Argus. Archives».

Самыя вядомыя кнігі пісьменніцы — «Лета перад змярканнем» (1973), «Успамін выжывання» (1975), «Пятае дзіця» (1988) і «Падарожжа Бэна» (2000).

За сваю літаратурную дзейнасць яна атрымала мноства прэмій. Вакол яе імя неаднойчы разгараліся скандалы.

Цяпер Дорыс Лесінг жыве ў прадмесці Лондана Гемпстэд. Яе апошні раман «The Cleft» («Вілка») (2007) распавядае пра старога рымскага сенатара, які апісвае пачаткі чалавецтва — старадаўнюю супольнасць жанчын, што абыходзяцца без мужчын. Яны нараджаюць толькі дзяўчынак, але раптам на свет з'яўляецца хлопчык...

Саша ДОРСКАЯ

Свята мовы

У Доме дружбы прайшла вечарына, прысвечаная Дню нацыянальнага пісьменства Карэі. Мерапрыемства наведала надзвычай вялікая колькасць карэйскай і беларускай моладзі і стала адной з самых яркіх падзей апошняга часу. Падчас святкавання вялікая зала Дома дружбы ператварылася ў фотавыставу, дзе дэманстраваліся маляўнічыя пейзажы і побыт "краіны ранішняй свежасці."

Распачаў вечарыну намеснік старшыні таварыства "Беларусь—Карэя", вядучы вечара Зіновій Прыгодзіч, які асабіста пабываў не толькі ў Паўночнай, але і ў Паўднёвай Карэі. Свае ўспаміны ён занатаваў у кнізе "Доўга будзе Карэя мне сніцца", якая ў дэталях апісвае самыя разнастайныя аспекты карэйскага жыцця вачыма нашага суайчынніка, пачынаючы ад нацыянальнай кухні і заканчваючы навуковым экскурсам у гісторыю карэйскага пісьменства.

Старшыня грамадскай арганізацыі "Асацыяцыя беларускіх карэйцаў", Ры Кімі Дзінуеўна распавяла аб трансфармацыі карэйскай мовы па-за межамі краіны, а таксама запрасіла ўсіх жадаючых на моўныя заняткі ў нядзельную школу.

Ацаніць харство паэтычнага карэйскага слова дапамаглі Таццяна Амосава і Вольга Дзеравянка. Усходняя паэзія зачаравала прысутных сваім меладычным спакоем і адначасова ўразіла тонкімі вобразамі ў перакладзе вершаў "Вяртанне на неба" і "Кветкі азаліі." Таксама Таццяна Амосава расказала прысутным аб асаблівасцях карэйскага алфавіта, што бярэ свой пачатак ад XV стагоддзя, і выканала на скрыпцы чуллівую мелодыю — музычны сімвал Карэі.

Сапраўдным жа падарункам для ўсіх прысутных сталася выступленне студэнтак харэаграфічнага факультэта Сеульскага жаночага універсітэта мастацтваў. Дзяўчаты спецыяльна прыехалі з Карэі, каб выступіць перад суайчыннікамі. Танцы з барабанамі і веерамі выклікалі сапраўдны фурор — жывое, грацыёзнае, па-сапраўднаму ўсходняе мастацтва прымусіла ў імгненне закахацца ў далёкую краіну.

Ян Акулін
Фота аўтара

Вечарына "Пекін — паўночная жамчужына Паднябеснай", прысвечаная 58-й гадавіне ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі, адбылася ў Доме дружбы.

Жамчужыны Паднябеснай

Падчас мерапрыемства госці вечарыны (а гэта выхаванцы Мінскага суворaўскага вучылішча, школьнікі і студэнты, якія вывучаюць кітайскую мову ды інш.) азнаёміліся з дакументальным фільмам пра жыццё Пекіна, паслухалі аповеды журналісткі, члена праўлення таварыства "Беларусь—Кітай" Аліны Грышкевіч. Думаю, усе прысутныя яшчэ раз упэўніліся ў глыбокіх каранях традыцый жыхароў Паднябеснай. Дарэчы, цудоўныя традыцыі ёсць і ў кітайскай літаратуры...

Так ужо ў V ст. да н. э. у Кітаі нарадзілася першая анталогія старажытнай паэзіі "Шыцзін", адзін з самых ранніх паэтычных зборнікаў у свеце. У Танскую эпоху (VII—IX стст. н. э.) з'явіліся паэт-рамантык Лі Бо (якога потым нашчадкі назвалі "богам паэзіі") ды "паэт-мудрэц" Ду Фу. Ён уславіў сябе рэалістычнымі радкамі эпічнага размаху...

Глыбокія літаратурныя традыцыі жывуць у Кітаі і ў наш час. А сумесныя беларуска-кітайскія літаратурныя праекты рэалізуюцца яшчэ з савецкіх часоў. У складзе розных дэлегацый у 50—60-я гады мінулага стагоддзя Кітай наведвалі нашы вядомыя пісьменнікі: Алесь Адамовіч, Максім Танк, Лідзія Арабей. У 1954-м у Шанхаі выйшаў зборнік твораў Івана Шамякіна, п'есы Кандрата Крапівы. Кітайскія чытачы мелі магчымасць азнаёміцца з найлепшымі вершамі Янкі Купалы.

У той жа час у перакладзе на беларускую мову было выдадзена 13 кніг кітайскіх аўтараў, сярод якіх творы Лу Сіня, Ло Даня, Чжоу Лібо...

Анатоль ВАСІЛЬЧАНКА

Карэліцкая сустрэча

Напрыканцы кастрычніка ў г.п. Карэлічы адбыліся VII Карэліцкія краязнаўчыя чытанні "Славутыя імёны Бацькаўшчыны".

Чытанні былі прысвечаныя такім слынным сынам гэтай зямлі, як навукоўца Ігнат Дамейка, этнограф, фалькларыст, майстра краязнаўчай фатаграфіі Ян Булгак, народны пісьменнік Янка Брыль, літаратуразнаўца Уладзімір Калеснік і інш. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Карэліцкі райвыканкам і Інстытут літаратуры ім. Янкі Купалы НАН Беларусі. Удзельнікаў чытанняў, сярод якіх былі У. Гніламёдаў, У. Мархель, У. Навумовіч, віталі адказны за ідэалагічную працу райвыканкама В. Куляка і в.а. дырэктара Інстытута літаратуры. В. Максімовіч. Акрамя згаданых з дакладамі выступілі супрацоўнікі Інстытута літаратуры, мясцовыя краязнаўцы, гісторыкі і этнографы. Пры закрыцці мерапрыемства арганізатары выказалі спадзяванне, што такія сустрэчы ў Карэлічах будуць адбывацца яшчэ неаднойчы.

У. І.

Дарагія ўспаміны

На працягу гэтага года Беларусь адзначае 125-гадовы юбілей адной з найвялікшых постацяў айчыннай літаратуры — Якуба Коласа (Канстанціна Міцкевіча). Акцыі, фестывалі, канцэрты з прысвячэннямі... Але, на мой погляд, самым каштоўным напамінам пра класіка сталіся аповеды яго малодшага сына. Якім быў Колас-паэт і Колас-бацька? З кім сябраваў і дзе чэрпаў натхненне? Аб гэтым ды многім іншым гутарым з Міхасём Міцкевічам.

Свята ўражаннем багата

— Міхась Канстанцінавіч, чым адметныя сёлетнія юбілейныя ўрачыстасці? Ці адрозніваецца 125-годдзе Якуба Коласа ад мінулых юбілеяў?

— Я не аналізаваў. Магу толькі сказаць, што да любых святаў стаўлюся дастаткова спакойна — гады бяруць сваё... Бяда ў тым, што, на мой погляд, увага да такіх знакамітых людзей, як Колас, адчувальна толькі падчас гучных дат, а потым неяк усё сціхае.

Было шмат запрашэнняў напярэдадні юбілею, але я за ўсім не паспяваю ды і цяжкавата. Мінск, Стоўбцы, Магілёў, Смалявічы — геаграфія вялікая...

—Якое ўражанне пакінулі сустрэчы? Наколькі ведаю, большасць аўдыторыі складала моладзь...

— Мне было прыемна адзначыць для самога сябе, што ёсць яшчэ людзі, якія ўсур'ёз цікавяцца постаццю Коласа і яго творчасцю.

Што датычыцца моладзі, то калі б не прыйшоў у навучальную ўстанову, напэўна, больш за факты з падручніка юнакі і дзяўчаты не пацікавіліся б. Выязджаеш на раён — там інтарэсу болей: часта пытаюцца пра творчасць, сямейны ўклад. У горадзе ўсё інакш — аўдыторыя літаральна безгалосая. Аднойчы нават запрасілі на сустрэчу з настаўнікамі, слухачамі перападрыхтоўчых курсаў, дык і там не адчуў цікавасці. Апантаных Коласавай творчасцю сустракаю ўсё менш і менш. Але прыемна часам бачыць цікаўныя вочы дзяцей, якія спрабуюць знайсці сябе ў малюнках ці першых вершаваных радках.

Помню, як раней хадзіў на сустрэчы з Янкам Брылём. Для нас, маладых, на той час гэта былі залатыя словы Майстра... А цяпер не ўсе яшчэ і па-беларуску зразумеюць! На мой погляд, моладзь зараз цікавіць адно — ТБ і безгалосая папса.

Гучала слова беларускае

— Вы слушна заўважылі пра засілле папсы, і ў сувязі з гэтым спытаю — а што слухалі ў сям'і Коласа?

— Калі я быў зусім малы, мы набылі радыёпрыёмнік Каланэль (па-нашаму — палкоўнік) і вечарамі слухалі музыку паўднёвых славян, а таксама класіку ў выкананні Казлоўскага, Няжданавай, рускія рамансы.

Падчас застолля звычайна спявалі народныя песні — беларускія, рускія, украінскія. Як з'явіўся раяль, сталі пакрысе граць на ім. Але больш спеўна гучала паэтычнае слова...

— У чыім выкананні?

— Чытаў і бацька, і госці. А прыходзіла да нас шмат вядомых асоб, усіх доўга пералічваць. У бацькі хапала сяброў, першыя сярод якіх былі Янка Купала і Пятрусь Броўка. Бацька вельмі цаніў творчасць Максіма Танка, але ён бываў у нас зрэдку, як і Аркадзь Куляшоў.

— Вядома ж, вершы гучалі пабеларуску! Але і Колас з Купалам не адразу прыйшлі ў творчасці да беларускай мовы!

— Калі Янка Купала пачынаў пісаць па-польску, то Колас — паруску. Але ж абодва яны праз які час перайшлі на родную, беларускую мову. Бо толькі на мове таго асяроддзя, у якім жывеш, можна стварыць сапраўды выдатныя творы. Дарэчы, Коласу ў нечым прыйшлося пачынаць амаль з нуля, на пачатку яго творчага шляху беларуская мова толькі-толькі выйшла з-пад забароны. Як пісаў вядомы рускі філосаф Ільін "Калі народ страчвае сваю мову, ён ператвараецца ў пясок!"

...А Колас мову ведаў! Звычайна наш слоўнікавы запас — каля 5 000 слоў, а ў яго творах налічваецца ажно каля 34 000! Да таго ж ён выпрацоўваў і граматычныя нормы, увогуле быў Настаўнікам з вялікай літары!

— Дык ці ёсць, на ваш погляд, вырашэнне моўнай праблемы?

— Калі мы жывём з двухмоўем, то трэба і ведаць іх абедзве! На мой погляд, яркі прыклад вяртання да моўных каранёў — украінскі. Увогуле, любая праблема павінна вырашацца ў выніку канструктыўнага публічнага дыялога...

І невядомае ў вядомым

— Раскажыце, як Колас стаў пісьменнікам і як працаваў над творамі?

— Колас стаў пісьменнікам з некалькіх прычын. На той час не было ні ТБ, ні радыё — наўкола глуш. Дзядзька Антось падараваў яму "Байкі" Крылова, якія ён вывучыў на памяць. Ужо потым Колас вучыў вершы Пушкіна, пра якога часта ўзгадваў добрым словам. Першы верш напісаў у 12 гадоў, за што бацька падараваў малому срэбраны рубель. Вядома ж, гэта быў стымул...

Работа творчага чалавека — каторжная, але яна прыносіць такое задавальненне, што цяжка перадаць словамі! Ужо ў сталым узросце Коласава раніца пачыналася звычайна з нейкіх хатніх работ. Потым дзесьці ў гадзін 9 садзіўся і пісаў да абеду, пасля 2 гадзіны адпачываў і зноў за работу. Дома ў той час была цішыня — ані дай Бог патурбаваць бацьку! Маці сачыла за тым, каб ён мог і папрацаваць, і адпачыць, таму дзецьмі займалася ў асноўным яна.

Між іншым, на маёй памяці бацька не лаяўся, не павышаў голас, быў чалавекам шчырым і прастадушным, дапамагаў людзям! Падмануць яго было лёгка, але калі высвятлялася гэта — не дараваў! Збольшага быў маўклівы...

—Можа, у Коласа былі "хуліганскія" вершы, як, напрыклад, у таго ж Пушкіна?

— Не, не было! Хіба што прыкладна такія гумарэскі, але я не лічу іх за хуліганскія:

О, дактары! Замахі вашы мелкі!
Да гэтага, відаць,
прывучаны вы змалку...
Чаму, чаму ж замест сядзелкі
Мне не прызначылі ляжалку?

— Але ж, пагадзіцеся, сапраўдныя вершы ідуць ад душы?

— Так. Калі ў паэта радкі ідуць ад душы, то ў творчасці бачны ўвесь ён. Таму і я параіў бы проста як мага болей чытаць вершаў Коласа, знаёміцца з крытычнымі матэрыяламі пра яго. У прыватнасці хацеў бы адзначыць кнігу Максіма Лужаніна "Колас расказвае пра сябе".

Дарэчы, калі Коласу было цяжка з-за дрэннага стану здароўя весці свае справы, Лужанін дапамагаў яму як сакратар, а паралельна вёў дзённік, хапаў літаральна кожнае яго слова, кожны аповед з жыцця ці параду з Коласавай паэтычнай лабараторыі. Тым больш, што шмат ішло лістоў з усіх куткоў СССР. Многія прасілі дапамагчы, і калі сапраўды патрабавалася, Колас дапамагаў, бо ведаў — народ, асабліва пасля вайны, бедаваў.

— Як лічыце, у творах вашага бацькі больш сумных нотак, ці болей аптымізму і веры ў светлую будучыню?

— Вядома ж, драматызму хапала. Колас шмат перажываў, многае з гэтага адклалася ў паэме "Сымон-музыка". Дарэчы, гэта мой любімы бацькаў твор. Паэма ўтрымлівае ў сабе каласальны зарад духоўнасці. А ўступ да 3-й часткі — сапраўдны гімн Беларусі, яе народу, гісторыі, прыродзе.

Ды ўсё ж творчасць Коласа прасякнута мяккім беларускім гумарам — гэта казкі, эпіграмы. Заўважу, што падчас налёту немцаў на Мінск згарэлі сшыткі з гумарыстычнымі творамі, якія яшчэ былі ненадрукаваныя.

— Колас не хацеў іх друкаваць?

— Не хацеў. Некаторыя вершы праляжалі ў стале больш як паўстагоддзя ў сямейным архіве брата.

— Самай недаследаванай творчай спадчынай Коласа з'яўляюцца...

— Лісты. Напэўна, ні ў якіх творах так не праяўляецца характар і пачуцці літаратара, як у эпісталярнай спадчыне.

— Ці толькі паэма "Сымон-музыка" блізкая вам?

— Не толькі, яшчэ і аповесць "У глыбі Палесся". Асабліва ў юнацтве захапляўся вобразам Ядвісі. Дарэчы, пра гэта я зараз пішу ва ўспамінах. Ды не толькі я — Уладзімір Карызна таксама прысвяціў ёй верш.

— Ці будуць выдадзены асобнай кнігай вашы ўспаміны?

— Напэўна пакуль не, яны яшчэ не скончаны. Можа, аддам у які часопіс...

— Зараз рыхтуецца 20-томны поўны збор твораў Коласа...

— Але я сумняваюся, што ён выйдзе ў поўным аб'ёме, як было задумана...

Пра Купалу

— Вы ведалі Купалу як ніхто. У чым тайна загадкавай смерці паэта? Няўжо забойства здзейснілі супрацоўнікі НКУС?

— Версію забойства я не падтрымліваю. Дзейнасць спецслужбаў заўжды асуджалася, таму не выключаю, што падобная версія ўзнікла з палітычных матываў. Увогуле на час смерці Купалы тыя, хто быў варожа настроены да яго былі альбо знішчаны ў "чыстках", альбо не мелі сувязі з вышэйшым апаратам НКУС. Тым больш хапала людзей, якія адрознівалі допісы на сапраўдных ворагаў ад кляуз. Дарэчы, на пачатку вайны Купала пісаў палымяныя вершы антыгітлераўскай скіраванасці. Матывацыі на знішчэнне не было — ён быў патрэбны савецкай уладзе!

Між тым Купала піў і наліўку, і каньяк. Што спажываў Купала ў дзень смерці — невядома. Хутчэй за ўсё ён проста аступіўся ...

Нашчадка Коласа шляхі

— Сёння мы з вамі гутарым у вашым колішнім доме, які стаў музеем. Ці не шкада было пакідаць абжытыя мясціны?

— Мы самі вырашылі без ваганняў, што будаваць вялікі музей — выдаткова. Каштоўнасць гэтага будынка ў мемарыяльнасці. Мы хацелі, каб людзі адчулі атмасферу, у якой жыў і працаваў Колас. Вядома ж, тут рабілі рэканструкцыю... Бацька не надта хацеў бы вычурнасці — такіх дываноў, мэблі. Быў дастаткова непатрабавальным да раскошы. Уклад сялянскага чалавека ішоў поруч з ім да канца жыцця.

— На адной з сустрэч вы распавядалі, што як малодшаму сыну вам дасталося больш увагі і бацькоўскай цеплыні. Якія рысы вы ўзялі ад бацькі?

— Кожнае дзіця бярэ за прыклад паводзіны сваіх бацькоў. Колас быў больш мяккі, асноўныя выхаваўчыя функцыі брала на сябе маці. Але на бацькавым прыкладзе вучыўся стрымліваць сябе нават у самых цяжкіх сітуацыях, не хлусіць. Памятаю, як бацька хадзіў у паходы, разам з ім дзівіліся прыгажосцю роднай прыроды.

— Ці не спрабаваў ён прывіць вам ці вашым братам нейкія літаратурныя навыкі?

— Не! Казаў "займайцеся чым хочаце"!

— Вы — доктар тэхнічных навук. Раскажыце, ці не шкадуеце аб тым, чаму прысвяцілі жыццё?

— Я прафіліраваўся ў галіне станкабудавання, апрацоўцы металаў з дапамогай іскры. На той час усё пачыналася літаральна з нуля, многае залежала не толькі ад канструктараў, але і ад фізікаў. Гадоў 8 быў у экспертным савеце ВАКа, і цяпер яшчэ крыху працую на грамадскіх пачатках.

У вольны час любіў займацца спартыўнай стральбой...

— І апошняе пытанне. Ці чытаў Колас "ЛіМ"?

— Канечне! І не толькі "ЛіМ"! Сам дасылаў творы ў "Полымя", сачыў за творчасцю маладых. Ён выпісваў шмат газет, часопісаў. Дзесьці ў маім архіве ёсць нумар "Звязды", дзе бацька алоўкам падкрэсліваў розныя моўныя хібы.

Гутарыў Сяргей ДУБОВІК

На здымках: Міхась Міцкевіч; сустрэча на бацькоўскай зямлі.

Фота аўтара і Віктара Кавалёва

Мікола СІСКЕВІЧ-НАРАЧАНСКІ

ЖАРТЫ І ПАРАДЫ ПЕСНЯРА

Ён павітаўся з намі за руку
І пальцамі крануў маю шчаку:
— Хадзіць вось гэткім у твае гады,
З такой бліскучай голай галавой,
Скажы, куды сабраўся, малады? —
Пацешна Колас жартаваў са мной.

— Вайскоўцам хутка стану і таму
Прыгожы гэткі, — адказаў яму. —
Я вершык пра Купалу напісаў,
Але нідзе нікому не чытаў...
— Як здымуць нас, пагутарым затым, —
Яго ты зможаш пачытаць усім.
І занясі ў газету вершык свой,
Скажы, з парады аддаеш маёй.
Паэму пра вайскоўцаў напішы,
Адслужыш і яе мне пакажы.
Глядзі, маю дамову не паруш,
Тады аддам табе свой капялюш!

Я адказаў, няўрымслівы дзівак,
Што ўсё зраблю абавязкова так.
І больш нічога не паспеў сказаць,
Бо хвалявання не сумеў стрымаць.
Пясняр народны хітра жартаваў,
Ад гэтых слоў я быццам падрастаў.
Прыемны гумар Колас сыпаў нам
І разам весела смяяўся сам.

...На варце родных беларускіх меж
Чуў побач голас: "Як, салдат, жывеш?"
Мне песняра маленькі самы верш
Паэмаю вялікай быў найперш,
У грукатні, у сумятні дарог
Ішоў вайсковы дзень з ёй пачынаць...
Жыцця не хопіць, каб яе хто змог
Да кожнага радка ўсю прачытаць.

Дом у садзе

Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа ужо нямала часу з'яўляецца нацыянальным культурным цэнтрам. Тут беражліва захоўваецца гісторыя — Чалавека, Творцы, Паэта, паказваецца эпоха, у якую ён жыў і ствараў свой паэтычны свет. Экспазіцыя, якая зараз у музеі прадстаўлена, рабілася да 120-годдзя песняра. Тады апрацавалі ўсе фондавыя матэрыялы камп'ютэрам, арыгіналы фотаздымкаў ды газетныя старонкі памянялі на копіі. Мяняць было цяжкавата: іншыя мастакі, нечаканыя задумы.

— А спатрэбілася тое таму, што галоўныя нашы наведвальнікі — гэта вучні. І мы для іх рыхтавалі нечаканае, — зазначае **Марыя Далідовіч**, загадчык навукова-асветнага аддзела музея. — Некалькі разоў абмяркоўвалі, што трэба зрабіць, каб і Коласа паказаць, і не занізіць значнасць такога чалавека, яго творчасці. Нараджалася задума вельмі і вельмі складана. Але ўсе, хто прыходзіць да нас цяпер, сцвярджаюць, што нам многае ўдалося: усё выглядае вельмі лёгка, дзякуючы шклу, а "нанізванне", як мы называем — календароў, досыць слушнае.

Гэтыя "календары" прадстаўлены ў літаратурнай частцы музея. Трапляючы ў яго, адразу накіроўваешся ў залу "Новай зямлі", затым — у залу "Сымона-музыкі". Дзве залы, як два крылы — падкрэсліваюць супрацоўнікі. Гэта былыя жылыя пакоі — колішнія "апартаменты" Коласавых сыноў і іх сем'яў. А таму невялікая экспазіцыйная плошча. І мастакі прыдумалі ход — зрабілі лёгкія вітрыны, быццам прытуленыя да сцен. Нахіленыя пад вуглом 30 градусаў, гэткія "лісты-палотны" можна гартаць як кнігу. Дзякуючы вынаходніцтву павялічылася колькасць экспанатаў амаль у 6 разоў. Усе залы аформлены па адной схеме: гісторыя напісання твора, гісторыя яго публікацыі і гісторыя выдання. У кожнай — адмысловыя кніжныя шафы, дзе знаходзяцца рарытэты. Да прыкладу, з тэматычным зборам пра адзін твор: ад першага выдання "Новай зямлі" да апошняга.

У першай зале размяшчаецца фотаздымак Коласа — 1901 года. У М. Лужаніна згадваецца, што Кастусь, калі паступіў на вучобу і быў на дзяржаўным забеспячэнні, нейкія грошы змог выдаткаваць на фотаздымачак. А пры ўваходзе ў музей наведнікаў сустракае здымак апошні, лынькоўскі. Унікальныя фота з сямейнага архіва, ліст галоўнаму рэдактару "Нашай Нівы", у якім ён просіць, каб пісалі яго пад прозай псеўданімам Тарас Гушча, а пад паэзіяй — Якуб Колас. Прынамсі, калі гаварыць пра псеўданімы, то іх налічваецца звыш 30-ці. Толькі ў нашаніўскі перыяд пісьменнік карыстаўся 20-цю імёнамі.

— Пра другую частку жыцця больш дакументаў, — распавядае Марыя Нічыпараўна. — Амаль заўсёды расказваем пра кватэру, пра хаты Коласа. У 1927 годзе пісьменнік пабудаваў хату па Вайковым завулку, 3 — гэта парк імя Горкага. Многа сямейных лістоў Коласа. Часта расказваем пра гэта дзецям.

— Вы ўжо другі раз згадваеце пра дзяцей, як вашую асноўную аўдыторыю...

— Так. Кожная зала — гэта тэматычныя экскурсіі. Тое, што вывучаецца ў школах. Матэрыялы зрабілі выключна выразнымі.

— Адчуваецца, верасень у вас самы спрыяльны месяц: пачатак новага навучальнага года...

— А ў час вакацый мы ездзім па лагерах з выставамі.

— І што паказваеце?

— Для самых маленькіх у нас падрыхтаваны некаторыя экспазіцыйныя рэчы. Колас апрацоўваў рускія і беларускія народныя казкі, шмат напісаў для дзяцей кніжак. Тыя ж "Савось-распуснік", "Міхасёвы прыгоды". Мы гэта апрацавалі самі, дзяўчаты з Інстытута літаратуры зрабілі лялькі і паставілі дзіцячыя спектаклі. Супрацоўнічаем з Цэнтрам дзіцячай творчасці. Яны нам шыюць лялькі. Дзеці знаёмяцца з творчасцю Коласа праз гэтыя казкі. Дарэчы, з нашага дома, Коласавай гасцёўні запісалі "Калыханку" да 120-гадовага юбілею. Яе нам перапісалі і на нашым, будзем гаварыць мемарыяльным тэлевізары (мы яго крышку мадэрнізавалі), паставілі новае начынне — паказваем гэты запіс. Ёсць яшчэ дакументальны фільм "Такім мы помнім Коласа" і для тэматычных падборак у вітальні на 2-м паверсе паставілі камп'ютэр, куды заклалі больш як 150 матэрыялаў.

Наш музей наведваюць, безумоўна, і людзі сталага ўзросту, дасведчаныя. І яны часта пытаюцца пра іншае. Анатоль Бутэвіч нам перадаў апошні ліст Коласа, з якім класік хадзіў у ЦК у дзень смерці. Ёсць "пакаянныя лісты" Коласа. Канечне, жахліва іх чытаць. Але каб паказаць тую атмасферу, мы прыдумалі візуальны эфект: фота майстра слова 1937 года пад Новы год — у тумане, быццам нешта незразумелае...

Літаратурная экспазіцыя разлічана на прагляд за 45 хвілін. Узняўшыся на другі паверх, да экспазіцыі мемарыяльнай, можна заўважыць бібліятэку Коласа — яна і цяпер належыць сям'і. У многім папоўнілі экспазіцыю людзі, якія часта бывалі ў доме паэта: перакладчыкі, рускія і беларускія пісьменнікі. Паблізу рабочы кабінет сына Данілы, дзе месціцца мэбля, якая першапачаткова стаяла ў кабінеце Коласа.

Быў і кабінет Міхася, сталоўка, зала, дзе Колас прымаў гасцей. У ёй — антыкварная мэбля XIX стагоддзя, якую купілі нявесткі Коласа спецыяльна для гэтага пакоя. Разам з мэбляй у камплекце была люстра — 1882 года. Раяль, які Колас купіў для сваіх унукаў. Сам граць не умеў, але выкарыстоўваў таксама для правядзення літаратурна-музычных вечароў: Дома літаратара тады не было, усе значныя літаратурныя вечарыны праходзілі ў Коласа. Між іншым, пры жыцці самы апошні прыём у гэтым будынку адбыўся 26 мая 1956 года: для журналістаў з 14 замежных краін. А зараз у гэтай зале праводзяцца літаратурныя чацвяргі. У год "ладзіцца" да 30 такіх вечарын.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ
Фота Кастуся Дробава

Пясняр і яго кнігі

Фонды архіва Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі найбольш поўныя — у іх назапашваецца ўсё, што выдаецца ў краіне. Цяпер там каля 4 мільёнаў асобнікаў. Але з чытачамі архівісты не працуюць. Прызначэнне абавязковага экземпляра ў кніжнай палаце — гэта паступленне яго на вечнае захоўванне. Прычым, асобнічак павінен захоўвацца ў максімальна нязменным выглядзе. Тут, так бы мовіць, рэзервовыя копіі. Але можна рабіць досыць рознапланавыя выбаркі. Як да лістападаўскага 125-гадовага юбілею народнага песняра. Усяго ў кніжнай палаце зарэгістравана 201 выданне Якуба Коласа. Гэта большая частка з таго, што выдадзена на тэрыторыі Беларусі.

Укладанне збору цесна звязана з гісторыяй самой установы — пакольку кніжная палата ўтворана ў 1924 годзе, а функцыі захавання друкаваных выданняў у тыя часы вяла дзяржаўная бібліятэка краіны, і пачало гэта выконвацца ў 1922 годзе. Натуральна, першыя дарэвалюцыйныя выданні класіка беларускай літаратуры ў гэтым архіве адсутнічаюць. Да таго ж у часы вайны фонды амаль на 100 працэнтаў былі знішчаныя. Адпаведна з усімі іншымі страціліся і друкаваныя творы Якуба Коласа. У пасляваенныя гады яны аднаўляліся па другіх экземплярах, якія здабывалі ў іншых бібліятэках суседніх рэспублік. Нягледзячы на тое, што рарытэтныя асобнічкі паступалі з самых розных крыніц, з даваенных выданняў дагэтуль адноўленыя не ўсе. Але і тыя кнігі, што захаваліся, адлюстравалі цэлую эпоху: жыцця паэта і жыцця яго кніг.

З намеснікам дырэктара Нацыянальнай кніжнай палаты **Аленай ЯРМОЛІЧ** мы "вандруем па дзесяцігоддзях". Так раскладзены кнігі Коласа: на кожнае дзесяцігоддзе асобны стос выдадзенага. Дваццатыя гады някідкія. Хаця менавіта ў гэтай падборцы сапраўдныя рарытэты. Вось, да прыкладу, кніга вершаў Якуба Коласа — "Водгульле". На жаль, яна захавалася не ў паліграфічным выкананні, пакольку паступіла з бібліятэкі адной з навучальных устаноў. Кніга калісьці выдавалася на рукі для чытання, і давялося аднаўляць яе пераплёт. Натуральна: большасць тых, што пасля аднаўляліся, былі чытаныя неаднаразова, таму на кнігах Коласа можна ўбачыць нават тыповыя пераплёты. Вось, "Першыя крокі" — выданне 1925 года — утрымлівалася на рабочым факультэце беларускага дзяржаўнага універсітэта. На многіх кнігах напісаныя і закрэсленыя па некалькі інвентарных нумароў і пячатак — з кожнай установы, дзе яны раней захоўваліся. Выданні 20-х гадоў пісаліся на мове таго часу — мове дарэформенай. Натуральна, з захаваннем тагачаснага правапісу. Многія выданні 20-х, 30-х гадоў Якуб Колас выдаваў пад псеўданімам Тарас Гушча. Ілюстрацыі да кніг з'яўляюцца значна пазней. Хаця і з даваенных выданняў і пасляваенных вялікая колькасць іх разлічаная менавіта на дзіцячую аўдыторыю.

Чытаем на наступнай кнізе: Менск, 1928 год. Аповесць "У Палескай глушы". Заўважаем: практычна ўсе даваенныя кнігі рыхтаваліся Дзяржвыдам. І знакамітая "Новая зямля" 1927 г. — таксама. На жаль, у кніжнай палаце ёсць толькі другое выданне, "На прасторах жыцця". Прыемна: многія кнігі выходзілі амаль што паралельна ў адзін год, але ў розным паліграфічным выкананні, з рознымі вокладкамі. А вось наклады тыповыя — 3 000 экз. І напрыканцы 20-х гадоў выйшаў першы збор твораў у двух тамах. Прадмова ў першым томе — крытычна-біяграфічны нарыс на 80 старонках — У. Дзяржынскага. Тут жа знаходзім неадпаведнасць: на другім томе напісана: партрэт аўтара і прадмова І. Чарджынскага. Партрэт не захаваўся.

30-я гады. Больш выданняў, адрасаваных дзецям. Яны з малюнкамі. Хаця імёнаў мастакоў пакуль што ў выходных дадзеных няма. Амаль усе ў цвёрдай вокладцы — адчуваецца новы подых паліграфічнай прамысловасці. Трымаем у руках кнігу "Выбраныя творы" Менск. Дзяржвыд. "**ЛіМ**" (падкрэслена аўтарам. — **І. Т.**), 1935 г.

Па ходзе знаёмства з экспазіцыяй Алена Іванаўна распавядае: працы па дакамплектаванні архіва вядуцца і па гэты час. Перыядычна праглядаюцца абменныя фонды бібліятэк. Бывае, нейкія выданні спісваюцца...

Удакладняю: пэўна, выданні класікаў не спісваюць, яны ж маюць культурную каштоўнасць? — "Бывае, і зараз яшчэ знаходзяцца выданні 30-х гадоў, — тлумачыць мая суразмоўца. — Часта ўстановы закуплялі не адзін, а два, тры, дзесяць экземпляраў. Тым часам для бібліятэкі ненавуковай не мае асаблівага значэння навізна альбо гісторыя выдання. Перавыданняў, зазвычай па школьнай праграме, было шмат".

Вельмі вялікая праца вядзецца з Расійскай кніжнай палатай, куды да пачатку 90-х гадоў акрамя камплектавання беларускіх бібліятэк, накіроўвалася па 9 экземпляраў беларускіх выданняў. За іх кошт камплектаваліся буйныя бібліятэкі Масквы і саюзных рэспублік.

40-я гады — вядомы перапынак у выданні кніг Коласа. А пасля вайны ён друкаваўся вельмі інтэнсіўна. Усе пасляваенныя выданні ў архіве кніжнай палаты ўжо ёсць. Адкрываючы чарговую кнігу, заўважаем цікавы, не партрэтны здымак: Колас з цыгарэтай на лаўцы паміж дрэў.

Вялікі стос кніг аўтара — у 50-я гады. Тут і "Выбраныя творы" ў сіняй вокладцы. Некалькі выданняў "Міхасёвых прыгод", выданне "Новай зямлі" ў супервокладцы (1958 год). Яна мае падарункавы фармат: ілюстрацыі Волкава, вокладка Сапеткі. Наклад — 8.000 экз. У гэты ж час выходзіць збор твораў у сямі тамах. Разглядаем шматтомнікі. Побач стаіць прыбор па вымярэнні вільготнасці і тэмпературы. Архіў — гаспадарка клопатная. Неабходна захоўваць адмысловае ды стабільнае кліматычнае асяроддзе. У самой установе штат невялікі: працуюць усяго толькі сем чалавек. Асобнікі, падрыхтаваныя для "вечнага захоўвання", складваюцца ў спецыяльныя скрыні — сонечнае святло не павінна на іх трапляць.

60-я, 70-я гады — зноў друкуецца шмат дзіцячай літаратуры. Надзіва маленькі стос выданняў 80-х гадоў. Але тут адчуваецца іншы падыход да афармлення і асэнсавання мастацтва кнігі. Шмат з іх падарункавых, сувенірных, ёсць кнігі-малюткі. У 1989-м годзе выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпусціла факсімільнае выданне Якуба Коласа "Песні жальбы" — кнігі з Вільні 1910 года, якая ў Беларусі больш не перавыдавалася ў такім выглядзе — гэта бібліяграфічная рэдкасць. І яшчэ адно факсіміле: "Другое чытанне для дзяцей беларусаў".

Яшчэ асаблівасць — у 80—90 гады дзіцячыя выданні сталі больш якасныя, каляровыя, яркія. Адначасова складваюцца традыцыі выданняў да юбілеяў. Сустракаюцца пераклады Коласа на замежныя мовы. Ёсць англійскі асобнічак — "Голас зямлі" накладам 5000 экземпляраў. Тут жа цікавая кніга "Асадзі назад!" — з бібліятэкі часопіса "Вожык".

Многія выданні Коласа друкаваліся ў серыях: "Школьная бібліятэка", "Беларуская паэзія", "Проза XX стагоддзя". І цікавейшая серыя, якую варта згадаць як выдавецкую знаходку — "З сабою ў дарогу", якая існавала ў 1994 годзе.

Нарэшце, пераходзім да выданняў апошніх гадоў — XXI стагоддзе. Кнігі багата афармленыя. Ды прыкладу, "Новая зямля", выдадзеная Беларускім фондам культуры — на трох мовах. Альбо "Вянок з аблокаў", які выйшаў у свет у 2002 годзе. Заснавальнікам серыі "Мне сонцам свеціць Наднямонне", у якой выдадзена кніга, стаўся Стаўбцоўскі райвыканкам, кіраўнік праекта — Анатоль Грэкаў. Інстытут праблем культуры выдаў "Выбраныя выслоўі славутага песняра. Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца". Пэўна, самы важкі набытак і навінка 2007 года — першы том 20-томнага збору твораў Коласа. Ці выдадуць яго цалкам да наступнага юбілею? Але ж працяг будзе...

Ірына ТУЛУПАВА
Фота аўтара

Сустрэча з «Землякамі»

Прыемна, калі на нашым абшырным і густа засеяным рускамоўнай літаратурай палетку з'яўляецца не проста новае цікавае выданне, а адразу цэлая кніжная серыя на беларускай мове. І да таго ж, не ў сталіцы, а ў Стаўбцоўскім раёне.

Такі падарунак усім аматарам прыгожага пісьменства і краязнаўства ў чарговы раз зрабіў аддзел культуры Стаўбцоўскага райвыканкама. Кажу "ў чарговы раз", бо пяць гадоў таму да 120-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа дзякуючы намаганням гэтага аддзела культуры і ягонага кіраўніка А. Грэкава была заснавана паэтычная серыя "Мне сонцам свеціць Наднямонне". У ёй ужо выйшла каля дзесятка добра аформленых кніжак аўтараў, якія сваёй творчасцю і жыццём былі звязаны з гэтай зямлёй.

І вось новы праект —серыя "Землякі". Адкрыў яе Мікола Маляўка сваёй дакументальнай аповесцю "Ой, бярозы ды сосны..." Кніжка гожа аздоблена, у цвёрдай вокладцы, у ёй шмат фотаздымкаў. І тыраж неблагі — 500 асобнікаў. Спадзяюся, хоціць не толькі землякам, а і тым, хто шчыра хоча далучыцца да гісторыі гэтай Богам бласлаўлёнай зямлі. Бо як можна найлепей спазнаць сваю зямлю, яе гісторыю, калі не праз лёсы людзей, якія гэтую самую гісторыю і ствараліі.

Кніга Міколы Маляўкі расказвае, як зазначае ў прадмове Анатоль Грэкаў, "пра чалавека, які пакінуў у тваёй душы след, быў для цябе старэйшым таварышам, эталонам мудрасці і чалавечнасці" — пра заслужанага настаўніка Беларусі, выкладчыка фізічнага выхавання Мікалаеўшчынскай школы Мікалая Антонавіча Семяняку. Вось колькі Мікалаяў набралася: вёска Мікалаеўшчына, настаўнік Мікалай Антонавіч, аўтар кнігі Мікалай Аляксандравіч Маляўка, які вучыўся ў таго настаўніка. Таму мо і аповед атрымаўся шчырым і даверлівым, бо нічога тут не прыдумана. Многае ўбачана на ўласныя вочы, прапушчана праз сэрца, а шмат што расказаў сваім вучням і паэту М.Маляўку сам настаўнік.

Мікола ўдала ўплятае ў свой аповед успаміны Мікалая Антонавіча, ягоныя згадкі пра Вялікую Айчынную вайну, што надае аповесці гістарычную дакладнасць, ажыўляе мастацкую плынь асабістай афарбоўкай. Аповесць таксама насычана пейзажнымі замалёўкамі. Хіба ж магчыма пісаць пра Наднямонне без апісання прыроды? Нездарма тканіна аповесці знітавана шматлікімі паэтычнымі радкамі. Дарэчы, у той, ранейшай серыі "Мне сонцам свеціць Наднямонне" таксама выходзіла паэтычная кніжка Міколы "Божы засценак".

Цікавы чалавек быў той мікалаеўшчынскі настаўнік, які не толькі вёў урокі фізкультуры, а і культуры наогул. Бо сам быў не пазбаўлены жадання і магчымасці бачыць і разумець прыгожае, ствараць свой мастацкі свет. Ну хіба звычайнаму ці абыякаваму чалавеку было б пад сілу на ровары выправіцца са Стоўбцаў за блізкі свет — ажно ў Маскву. Ды не абы-куды, а ў Траццякоўскую галерэю. Тры дні туды, як піша М. Маляўка, і тры — назад. ехалі Мікалай Семяняка і двое самадзейных мастакоў. Дзіва дзіўнае, дый годзе!

Хай сабе не Ламаносаў, не па навуку выправіўся, але не менш уражвае... Паехалі, каб на свае вочы ўбачыць сапраўднае мастацтва. Між іншым, свайму захапленню Мікалай Антонавіч не здрадзіў, усё жыццё ён пісаў карціны, "добра граў на гітары і балалайцы". Ну, а той адчайны і смелы паход у Маскву, відаць, маглі здзейсніць толькі стаўбчане, якіх натхняў і натхняе сам бацька Нёман. Нездарма з ім звязана практычна ўсё жыццё Мікалая Антонавіча. Як пазначана падзагалоўкамі ў кнізе: "Школа. Турбаза. Пансіянат. Музей" — гэта месцы працы Мікалая Антонавіча. Дзяцінства яго прайшло на Віцебшчыне, а да Нёмана прывялі настаўніцкія дарогі, у Мікалаеўшчынскую адбудаваную пасля вайны школу. Будаваць дапамагаў сам Якуб Колас, імя якога пазней ёй было прысвоена. Менавіта тут Мікалай Антонавіч Семяняка першым у Беларусі сярод настаўнікаў фізкультуры атрымаў у 1966 годзе ганаровае званне заслужанага настаўніка. На Стаўбцоўшчыне ўжо больш як 20 гадоў ладзяцца лыжныя гонкі на прызы заслужанага настаўніка Беларусі Мікалая Антонавіча Семянякі.

Пасля школьнай працы ў ягонай біяграфіі была пасада дырэктара турбазы "Высокі Бераг". Тут таксама, як і ў школе, Мікалай Антонавіч арганізоўваў турыстычныя паходы па родным краі, каб не выветрылася ў землякоў любоў і павага да свайго, роднага. Бо тады і іншым, прыезджым, лягчэй будзе далучацца да гэтага краю, пераймаць любоў да беларускай зямлі. А паказваць, вядома ж, было што. Стоўбцы і Нясвіж, Налібоцкая пушча... Ну, і канечне ж, коласаўскія мясціны: Смольня, Акінчыцы, Альбуць...

Затым было будаўніцтва і праца ў пансіянаце для ветэранаў вайны. Таксама над Нёманам. І нарэшце Мікалай Семяняка стаў загадчыкам філіяла музея Якуба Коласа на Стаўбцоўшчыне. Шмат карыснага і арыгінальнага дзеля захавання і ўшанавання памяці славутага земляка, народнага паэта Беларусі зрабіў Мікалай Антонавіч у добрым хаўрусе і з мясцовымі гаспадарамі, і з мінскімі рупліўцамі. А побач з галоўнай музейнай сядзібай на радзіме Якуба Коласа, што ў Смольні, Мікалай Антонавіч жыў разам са сваёй жонкай Соф'яй Іосіфаўнай — дачкой знакамітага дзядзькі Юзіка, пра якога, бясспрэчна, ведае кожны чытач "Новай зямлі", дзякуючы дасціпным словам самога паэта пра Юзіка-шаляніцу.

Вядома ж, шмат старонак кнігі прысвечана вайне, удзельнікам якой быў Мікалай Антонавіч. Згадваюцца ў аповесці і больш далёкія эпізоды гісторыі — яшчэ з часоў Радзівілаў. Гэта робіць аповед яшчэ больш каштоўным для аматараў гісторыі роднага краю.

Вось пра такога простага беларускага настаўніка займальна і шчыра напісаў Мікола Маляўка. Мікалай Антонавіч Семяняка ішоў па жыцці са словамі маці: "Сынок, заўсёды дзякуй людзям за дабро. Ды старайся так жыць, каб часцей дзякавалі табе. На дабрыні свет стаіць, і людзі, якія робяць дабро, — шчаслівыя людзі".

Аповесць пісалася ў 2003 — 2005 гг. А пакуль кніжка друкавалася, Мікалая Антонавіча не стала. Ягоны воблік застаецца ў ёмкай дакументальнай аповесці Міколы Маляўкі "Ой, бярозы ды сосны...", якая стала першай кнігай з серыі "Землякі", што выдала мінскае выдавецтва "Кнігазбор" у 2006 годзе.

Хай доўжыцца новая серыя пра добрых людзей Стаўбцоўшчыны, хай нязводна будзе ў яе зацікаўлены чытач.

Анатоль БУТЭВІЧ

Вяртанне вандроўніка

Паэт можа праяўляцца ў чалавеку па-рознаму. У паэтавай душы, як і ўва ўсім нашым шматаблічным і неспасцігальным свеце, можа месціцца і велічны спакой антарктычных ільдоў, і неўтаймоўная жарсць ды высокатэмпературны накал вулканічных глыбінь. А яшчэ ў кожным паэце жыве дзіця. І толькі ў душах выбраных гэтае дзіця працягвае жыць да скону.

Вядомы польскі журналіст, пісьменнік Рышард Капусцінскі вяртаецца на сваю радзіму — у Беларусь. Вяртаецца чалавекам і творцам, які здолеў паказаць усяму свету: слова — гэта магутная зброя ў руках таго, хто ўмее ім валодаць. Для такога чалавека яно з'яўляецца таксама сродкам барацьбы за сцвярджэнне высокай чалавечай годнасці, а найперш — за Праўду, як бы банальна і пафасна не гучала гэта ў наш час.

І менавіта таму, што Рышард Капусцінскі верыў у здзяйсненне высокіх мар, пранесеных праз усё жыццё, ён вяртаецца ў краіну свайго дзяцінства яшчэ ў адной іпастасі — як паэт. Паэт, які ніколі не выпінаўся наперад са сваім несумненным талентам, не лез на трыбуну. З вершаў ён і пачынаў, пісаў іх і надалей, займаючыся сваёй асноўнай — журналісцкай — працай. І імі ж, вершамі, падсумаваў уласны духоўны набытак, выдаўшы напрыканцы свайго зямнога бытавання два паэтычныя зборнікі — "Notes" ("Запісная кніжка", 2005) і "Prawa natury"("Закон прыроды", 2006).

"Вяртанне" — так і называецца кніжка, што зусім нядаўна пабачыла свет у рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". У яе ўвайшлі пераклады выбраных вершаў з двух вышэйназваных зборнікаў. Выданне адметнае, бо дазваляе зірнуць на паэтычную спадчыну Рышарда Капусцінскага як бы з "падвоенага" боку, успрыняць яго вершы па-беларуску і па-руску. Па сутнасці, параўнанне дзвюх моў, дзвюх стыхій і з'яўляецца асноўнай задачай усіх бі- і полілінгвістычных кніг. Перастварэнне здзейснілі землякі паэта па геаграфіі і браты — па паэзіі — творцы з Пінска Анатоль Шушко і Валерый Грышкавец.

"Рышард Капусцінскі нарадзіўся ў адным з прыгажэйшых гарадоў беларускага Палесся — Пінску (...) Палеская рака Піна, якую палюбіў маленькі Рысек, вынесла яго ў вялікі свет: Варшаўскі універсітэт, Польскае інфармацыйнае агенцтва, афрыканскую Сахару, балівійскія горы..." Так піша ў сваёй натхнёнай прадмове да зборніка супрацоўніца аддзела культуры Пінскага райвыканкама Іна Дзямід. Але паэтычная геаграфія Капусцінскага не менш шырокая. Калі браць за крытэрый ацэнкі паэтычнага бачання творцы здольнасць спасцігаць гэтыя самыя "мастацкія абсягі" сэрцам і пачуццямі, то Рышарду Капусцінскаму ёсць што сказаць:

Калі тваё сэрца боль раздзірае
пачынаеш адчуваць сэрца

калі твае вочы слепнуць
пачынаеш адчуваць вочы

калі твая памяць тоне ў цемры
пачынаеш адчуваць памяць

Як сапраўдны паэт, які ў стане вельмі дакладна вызначыць тонкую мяжу паміж пустаслоўем і тым адзіным спалучэннем некалькіх слоў ці сказаў, якія і ёсць паэзіяй, Рышард Капусцінскі задумваецца:

Магчыма
самае мудрае выказванне
— маўчанне?

І тым не менш ён прамаўляе — ціха, са спадзяваннем, што ягоны голас будзе пачуты, а сэнс, які ён укладае ў радкі — спасцігнуты:

Паэзія — святыня
у яе прахалодзе
разгараецца розум

вершы —
астылае полымя

Паэзія была для творцы толькі адной са шматлікіх граняў —складнікаў велічнай Загадкі Свету, якую пісьменнік адчуваў нястомную патрэбу разгадваць усё жыццё.

Пераклады, змешчаныя ў выданні, таксама заслугоўваюць асобнай гаворкі. Арыгіналы вершаў маюць значны інтэлектуальны змест, утрымліваюць у сабе шматлікія алюзіі і рэмінісцэнцыі. У спалучэнні з пашыранай у сучаснай польскай паэзіі формай — вольным вершам без выкарыстання кропак і косак, тэксты Капусцінскага вымагаюць калі не літаральнага, то прынамсі як мага больш блізкага да арыгінала перакладу. Роднаснасць трох моў у нечым аблегчыла задачу перакладчыкаў. Ды і як інакш, калі польскую літаратурную мову фарміравалі некалі і нашы суайчыннікі? Таму незразумела, чаму, напрыклад, абодва паэты пераклалі радок Капусцінскага «znikający punkt» (верш «Dlaczego...») як «знікаючы шар» і адпаведна па-руску — як «исчезающий шар», бо слова «punkt» так і перакладаецца з польскай мовы — як пункт, кропка. Разумеючы, што ўсё-ткі пераклад, і тым больш паэтычны — гэта не наўпроставае капіраванне сэнсу, выкажу здагадку, што ў дадзеным выпадку асновай для перастварэння паслужыў нейкі падрадкоўнік, аўтар якога быў залішне самаўпэўнены ў сваім разуменні арыгінала. Таму заўсёды выклікае неразуменне, калі ў выніку перакладчыцкай працы губляецца, або іначыцца сэнс першакрыніцы, няхай сабе нават гэтыя змены не носяць істотнага характару.

Адзначу, што пераклады А.Шушко падаюцца ў кнізе больш эмацыйнымі, што спрыяе ўспрыманню тэкстаў Капусцінскага ў рэчышчы сапраўды беларускага гучання. А ўвогуле, абодва перакладчыкі здолелі захаваць філасофска-заглыбленую, інтэлектуальна-роздумную стыхію паэтыкі Капусцінскага, асэнсаваўшы яе і прапусціўшы праз сваё ўласнае успрыманне. І ў выніку атрымалася арыгінальная кніга, якая будзе цікавая самаму рознаму чытачу.

Станоўчае ўражанне пакідае таксама і мастацкае афармленне кнігі. На вокладцы — сам аўтар, які глядзіць з акна цягніка на дрэвы і будынкі, што мільгаюць перад вачыма. Сімвал вяртання ў дзяцінства, вяртання да паэзіі, вяртання да вытокаў жыцця.

Напрыканцы дазволю сабе працытаваць выказванне лаўрэата Нобелеўскай прэміі, выдатнай польскай паэткі Віславы Шымборскай, з паэзіяй якой, дарэчы, у Капусцінскага шмат агульнага: *«Вялікі пісьменнік, высакародны даследчык нашага чароўнага, вечна трывожнага свету (...) асоба, для якой усе гарызонты былі цеснымі і існавалі толькі для таго, каб іх пераадольваць душою, сэрцам, творчасцю»*. На мой погляд, вельмі ёмістае і трапнае выказванне, датычнае не толькі нашага знакамітага земляка, бо менавіта гэткім павінен быць кожны чалавек, які абраў для сябе пачэсны і адказны занятак — быць пісьменнікам.

Янка ЛАЙКОЎ

Пытанне аб неабходнасці ўпарадкавання правапісных нормаў беларускай мовы абмяркоўваецца не адзін год. Нарэшце, намаганні моваведаў набываюць рэальнае ўвасабленне — з'явіўся новы звод правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, з якім кожны можа азнаёміцца на сайце Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, www.mineduunibel.by. Нядаўна быў прыняты праект закона "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі". Сам закон уступіць у сілу з 1 верасня 2010 г. Якімі шляхамі пойдзе развіццё беларускай арфаграфіі і беларускай мовы далей? Пра гэта мы гутарым з дырэктарам Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі Аляксандрам ЛУКАШАНЦАМ.

Шляхамі моўных удасканаленняў

Пра гісторыю беларускага правапісу

— Аляксандр Аляксандравіч, давайце паглядзім на гістарычны шлях фарміравання і ўпарадкавання моўных правілаў...

— Правапісныя нормы новай беларускай літаратурна-пісьмовай мовы на пачатковым этапе фарміраваліся стыхійна, праз практыку беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Асабліва інтэнсіўна гэты працэс ішоў у пачатку XX ст., калі беларуская пісьмовая мова актыўна ўваходзіць у культурнае жыццё грамадства. Выключна важную ролю ў станаўленні адзіных правапісных нормаў адыграла тагачасная беларуская перыёдыка, асабліва газета "Наша Ніва", якая была разлічана на масавага беларускамоўнага чытача, і вакол якой згуртаваліся лепшыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі.

— Якую ролю ў станаўленні правапісных нормаў адыграла "Беларуская граматыка для школ" Браніслава Тарашкевіча?

— Выключна важную! Фактычна гэта была першая ўдалая спроба арфаграфічнага ўнармавання беларускай пісьмовай мовы. Браніславу Тарашкевічу ўдалося арганічна спалучыць у сваёй "Граматыцы" два асноўныя прынцыпы правапісу: фанетычны і марфалагічны, што і сёння складае спецыфіку і адметнасць беларускай пісьмовай мовы ў параўнанні, напрыклад, з рускай мовай. Увогуле "Граматыка" Б.Тарашкевіча забяспечыла ў 20-я гады пашырэнне беларускай пісьмовай мовы ва ўсе сферы жыцця тагачаснага грамадства, у першую чаргу ў сферу школьнага навучання.

— Але, напэўна, і правапісныя нормы, замацаваныя гэтай "Граматыкай", таксама былі далёкімі ад дасканаласці...

— Зразумела! Шырокае выкарыстанне беларускай мовы ў розных сферах выявілі многія супярэчлівыя і нявырашаныя праблемы правапісу Б. Тарашкевіча. Менавіта настаўнікі-практыкі ў сярэдзіне 20-х гадоў узнялі пытанне аб рэфармаванні дзеючага тады беларускага правапісу.

У лістападзе 1926 года была праведзена акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускай графікі і правапісу, у якой прынялі ўдзел найбольш вядомыя беларускія лінгвісты, замежныя спецыялісты, настаўнікі-практыкі. Падчас канферэнцыі былі шырока абмеркаваны найбольш спрэчныя пытанні беларускай арфаграфіі, у першую чаргу адлюстраванне акання/якання ў словах іншамоўнага паходжання, перадача на пісьме асіміляцыйнага памякчэння зычных і іншыя.

У выніку пры Інбелкульце ў 1927 годзе была створана спецыяльная правапісная камісія, якая на аснове рэкамендацый акадэмічнай канферэнцыі павінна была падрыхтаваць новы звод правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Першы варыянт новага беларускага правапісу быў гатовы ў 1930 годзе. Трэба адзначыць, што многія рашэнні прымаліся камісіяй у выніку працяглых дыскусій і спрэчак. Па некаторых пытаннях члены правапіснай камісіі так і не змаглі прыйсці да згоды. У прыватнасці, праблема абазначэння на пісьме асіміляцыйнага памякчэння зычных фактычна была вырашана ў выніку «банальнага галасавання» не на карысць мяккага знака.

Трэба адзначыць, што далейшая работа ўскладнілася яшчэ і тым, што ў хуткім часе ў выніку першай хвалі палітычных рэпрэсій многія члены правапіснай камісіі аказаліся таксама рэпрэсіраванымі. Аднак патрэбы моўнай практыкі дыктавалі неабходнасць упарадкавання правапісу. Была створана новая камісія. У выніку ў 1933 годзе з'явілася пастанова СНК БССР "Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу", а ў 1934 годзе быў выдадзены звод арфаграфічных правілаў "Правапіс беларускай мовы". Гэта была першая (і, заўважу, ***апошняя***) рэформа беларускага правапісу. Уся далейшая праца фактычна зводзілася да ўдакладнення і карэкціроўкі правілаў 1934 года.

Трэба адзначыць, што правапіс 1934 года, нягледзячы на ўсе акалічнасці і складанасці працы над ім, быў значна больш дасканалым і паслядоўным, больш адпавядаў фанетычнаму ладу беларускай мовы і маўлення ў параўнанні з правапісам Б. Тарашкевіча. Дарэчы і сам Тарашкевіч добра разумеў неабходнасць удасканалення правапісу, хаця і лічыў, што праца над ім павінна праводзіцца ўзважана і грунтоўна.

Заўважу, што згаданую рэформу не прыняло беларускае замежжа, якое працягвала прытрымлівацца ў сваёй пісьмовай практыцы "Граматыкі" Б. Тарашкевіча. Не атрымаў распаўсюджвання новы правапіс і на тэрыторыі тагачаснай Заходняй Беларусі.

— А як вырашылі пытанне з лацінкай?

— У XIX — пачатку XX стст. у беларускамоўнай пісьмовай практыцы паралельна функцыянавалі дзве графічныя сістэмы: так званая "беларуская лацінка" і кірылічны алфавіт. Яшчэ ў 1912-м годзе на старонках "Нашай Нівы" адбылася актыўная дыскусія адносна графічнай сістэмы беларускай мовы. Адназначнага рашэння знойдзена не было, але сама газета перайшла на кірылічны алфавіт. Пытанне аб беларускай графіцы шырока абмяркоўвалася і на акадэмічнай канферэнцыі 1926 года. У выніку беларуская мова цалкам перайшла на кірылічны алфавіт, які выкарыстоўваецца і зараз.

— Чаму ж спатрэбілася ў 1957-м "перарабляць" арфаграфічныя нормы?

— Справа ў тым, што рэформа 1934 года таксама не вырашыла ўсе спрэчныя праблемы беларускага правапісу. Таму і праца над яго ўдасканаленнем працягвалася. Вядома, што ў 1940 годзе быў падрыхтаваны і абмяркоўваўся новы праект правілаў беларускай арфаграфіі. Па некаторых звестках ён быў у значнай ступені набліжаны да арфаграфічнай сістэмы рускай мовы. Аднак далей абмеркавання справа не пайшла, і гэты праект не меў ніякага ўплыву на пісьмовую практыку.

Зразумела, што праца над правапісам працягвалася і ў пасляваенны час. Вынікам яе і стала пастанова 1957 года "Аб удакладненні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу", а ў 1959 годзе былі выдадзены "Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", якія на цэлае паўстагоддзе забяспечылі функцыянаванне пісьмовай беларускай мовы ва ўсіх сферах ужытку.

Рэформы не будзе!

— Як выспела патрэба ў сённяшніх дапрацоўках?

— Паколькі існуючы беларускі правапіс у значнай ступені грунтуецца на фанетычным прынцыпе, ён вельмі адчувальны да любых змен у моўнай практыцы. Дарэчы, у прадмове да выдання 1959 года адзначана, што "беларускі правапіс, пабудаваны ў значнай меры на фанетычным прынцыпе, асабліва чуллівы да змен у мове, і таму ён павінен перыядычна ўдасканальваць свае правілы". Праблемы беларускага правапісу заўсёды знаходзіліся ў полі зроку і лінгвістаў, і настаўнікаў беларускай мовы, і работнікаў выдавецтваў.

З асаблівай вастрынёй пытанне аб унясенні змен у існуючы беларускі правапіс зноў было ўзнята ў канцы 80-х — пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Больш таго, яно было фактычна пераведзена ў плоскасць вяртання да дарэформенага беларускага правапісу, г. зн. да правапісу паводле "Граматыкі" Б. Тарашкевіча.

Зноў была праведзена навуковая канферэнцыя ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі, працавала Дзяржаўная камісія, у склад якой увайшлі вядомыя беларускія пісьменнікі і вучоныя-лінгвісты. Вынікам працы гэтай камісіі сталі "Высновы", апублікаваныя ў газеце "Звязда" ў 1994 годзе. Камісія пацвердзіла, што існуючы беларускі правапіс у асноўным задавальняе патрэбы сучаснай пісьмовай практыкі і рэкамендавала падрыхтаваць новую рэдакцыю "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" з улікам тых змен, што адбыліся ў беларускай мове на працягу другой паловы XX ст. Рабочая група ў складзе акадэміка А.І. Падлужнага, прафесараў П.П. Шубы, М.С. Яўневіча, А.Я. Міхневіча і кандыдата філалагічных навук А.А. Крывіцкага падрыхтавала такі праект. Ён неаднаразова абмяркоўваўся і дапрацоўваўся, і зараз вядзецца работа па ўвядзенні яго ў дзеянне.

— Дык усё ж такі, што цяпер чакае беларусаў?

— Адразу падкрэслю, ніякіх моўных рэформаў не будзе і не можа быць! Трэба дакладна размяжоўваць мову і правапіс. Мова развіваецца па ўласных законах, і ў іх умешвацца нельга. Правапіс жа — гэта вынік грамадскай дамоўленасці аб аднастайнасці перадачы на пісьме вуснага маўлення. Асабліва ў наш час ён патрабуе рэгламентацыі, адзінства правілаў і нормаў, бо роля пісьмовай беларускай мовы ў грамадстве значна пашыраецца. Сёння ідзе размова толькі аб удакладненні існуючага правапісу і прыняцці на заканадаўчым узроўні новай рэдакцыі "Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі"! Галоўнае ў гэтай справе — не парушыць традыцыі пераемнасці, каб у выніку мы не аказаліся адсечанымі ад вялікага культурнага пласта, што мае беларускамоўнае ўвасабленне!

Поруч з новаўвядзеннямі

— Чуў, што да прынятця Закона рыхтуюцца новыя арфаграфічныя слоўнікі...

— Так. У першую чаргу гэта датычыцца нарматыўнага "Слоўніка беларускай мовы" (Мн., 1987), які на сённяшні дзень з'яўляецца самым аўтарытэтным арфаграфічным даведнікам беларускай мовы. У Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі фактычна падрыхтавана ўжо яго новае выданне, у якім будуць адлюстраваны і прапанаваныя змены ў правапісе асобных слоў.

— Наколькі выдатковым будзе ўвядзенне новых правілаў?

— Новая рэдакцыя "Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі", як я ўжо адзначаў, не закранае асноўных прынцыпаў і палажэнняў існуючага правапісу. Змены датычацца толькі асобных слоў, і яны не будуць вельмі істотнымі. Таму няма неабходнасці ў тэрміновым перавыданні ўсёй беларускамоўнай вучэбнай літаратуры. Яна будзе заменена шляхам яе натуральнага абнаўлення. Тое ж самае можна сказаць і пра слоўнікі беларускай мовы. Многія з іх выдаваліся шмат гадоў таму і актуальным з'яўляецца іх перавыданне. Зразумела, што пры падрыхтоўцы новых выданняў у іх будуць унесены адпаведныя карэктывы. Не спатрэбіцца і замена шыльдаў з назвамі арганізацый, вуліц і інш.

— Як часта праходзяць моўныя рэформы ці ўдасканаленні на заканадаўчым узроўні ў іншых краінах?

— Вельмі рэдка! Да змен у правапісе, асабліва ў наш час, калі пісьмовая мова адыгрывае выключна важную ролю ў жыцці сучаснага грамадства, трэба адносіцца вельмі асцярожна. Важна, каб не былі перарваны пісьмовыя традыцыі, — каб новыя пакаленні носьбітаў той ці іншай мовы не аказаліся адарванымі ад усёй папярэдняй пісьмовай спадчыны. Таму грамадства вельмі насцярожана адносіцца да любых змен у пісьмовай традыцыі. Прыкладам можа служыць Польшча, дзе ў пачатку 60-х гадоў XX ст. былі спробы уніфікаваць напісанне асобных слоў, аднак пасля шырокага абмеркавання гэта было прызнана немэтазгодным. Я паўтару яшчэ раз, і праект новай рэдакцыі "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" не закранае асноўных прынцыпаў і палажэнняў дзеючага правапісу і накіраваны на захаванне традыцый пераемнасці ў пісьмовай практыцы.

— У адным з інтэрв'ю вы сказалі, што не ўспрымаеце назваў "наркамаўка" і "тарашкевіца"...

— Я не вельмі люблю такія назвы за тое, што яны не зусім дакладна адлюстроўваюць сутнасць з'яў, якія зараз укладваюцца ў вышэйназваныя паняцці. Напрыклад, тэрмін "наркамаўка" з'явіўся ў 90-я гады мінулага стагоддзя і мае выразнае палітычнае адценне, што, я лічу, немэтазгодна пры ацэнцы моўных з'яў. "Тарашкевіца" — гэта правапісныя правілы, замацаваныя "Граматыкай" Б. Тарашкевіча, ці, шырэй, беларуская мова 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Цяпер жа пад "тарашкевіцай" часта разумеюць самыя розныя правапісныя сістэмы, у той ці іншай ступені арыентаваныя на "Граматыку" Б. Тарашкевіча.

— Некаторыя кажуць, што менавіта беларуская мова ўвабрала ў сябе лепшыя традыцыі той самай адзінай, старажытнаславянскай мовы, ад якой пайшла наша родная мова, сучасныя руская, украінская і іншыя славянскія мовы...

— Такое пытанне можа ставіцца не ў дачыненні да сучаснай беларускай літаратурнай мовы, а да беларускай нацыянальнай мовы наогул. Так, некаторыя лінгвісты лічаць, што, напрыклад, палескія народныя гаворкі захавалі некаторыя архаічныя славянскія рысы, якія адсутнічаюць у іншых сучасных славянскіх мовах.

— Не сакрэт, што сёння большасць жыхароў Беларусі гавораць па-руску. Як лічыце, ці зменіцца ў бліжэйшым будучым сітуацыя на карысць мовы беларускай?

— Калі б я быў Настрадамусам, то абавязкова дакладна назваў бы той час, калі ўсе ў нашай краіне пачнуць гаварыць па-беларуску (усміхаецца). Але мы павінны быць рэалістамі і разумець, што сёння найбольш поўна рэалізаваць свае магчымасці, у тым ліку і творчыя, можа рэальна двухмоўная і шматмоўная асоба. Таму лічу, што сучасны грамадзянін Беларусі павінен валодаць абедзвюма дзяржаўнымі мовамі, быць рэальна двухмоўнай і шматмоўнай асобай. Але пры гэтым вельмі неабходна больш шырока выкарыстоўваць менавіта беларускую мову ў найбольш важных сферах ужытку. Каб дасягнуць гэтага, патрэбна не толькі вывучаць беларускую мову незалежна ад узросту чалавека, яго сацыяльнага статуса, але і фарміраваць у грамадстве ўсведамленне прэстыжнасці беларускай мовы, яе ведання і захавання як важнейшага сродку нацыянальнай адметнасці. Усё гэта павінна рабіцца не гвалтам, а шляхам паўсядзённай карпатлівай растлумачальнай работы і ўласным маўленчым вопытам, таму што моўнае пытанне — гэта вельмі спецыфічная і далікатная сфера грамадскіх адносін, якая непасрэдна закранае моўныя інтарэсы і моўныя амбіцыі кожнага жыхара нашай краіны. Упэўнены, што вялікую ролю ў пашырэнні беларускай мовы ў розных сферах ужытку, павышэнні яе прэстыжу і камунікатыўнай запатрабаванасці сваім уласным прыкладам могуць адыграць найбольш аўтарытэтныя прадстаўнікі культурнай, навуковай і палітычнай эліты нашага грамадства.

Гутарыў Сяргей ДУБОВІК

Фота аўтара

Васіль МАКАРЭВІЧ

АД ГОМАНУ БАРОЎ, АД ПЕСЕНЬ ДУДАРОЎ

Трыпціх

I. РАЗМОВА З ЯКУБАМ КОЛАСАМ

1
Ах, дзядзька Якуб,
Вы на камень прыселі.
А дзе ён, са знойдзеным нерушам, кош?
Вось так Вы сядзелі калісьці ў прыселлі,
На смольным ускрайку ляска
І пакош!

Хіба тут мадзець
З дня у дзень не абрыдла,
Ды слухаць, як стогнуць і трубы і медзь?!
З каменнага айсберга, быццам з абрыва,
Ну колькі ўжо можна ў бяздонне
Глядзець!

Як грукат і віск
Не даваліся ў знакі,
Як дол крот жалезны, бульдозер, не рыў, —
У тлуме сядзець — не ў Пішчалінскім замку,
Дзе чахлі калісь Вы ў астрожнай
Нары.

Хоць Вы адбылі
Там злавесную рату,
Ды недзе ў трыццатых, гарачых, як вар,
Вас ледзьве ізноў не ўшчамілі за краты
Адведаць паўторна і здзекаў
І нар.

Ад рання ўвесь дзень
Цягне прэллю ды вікай
Адтуль, дзе цвіце з лапухоўем быльнёг.
Вам ноччу б чугунныя зняць чаравікі, —
Яны, як жыўцом, прыкіпелі
Да ног!

Гармідар-гандляр
З Камароўкай улетку
Ды грукат трамваяў дыхнуць не даюць.
Паплакаць падзённічыкі йдуць у жылетку, —
Лаўровых вянкоў ім даўно
Не даюць?!

Даўмецца дасюль
Вы не можаце толкам, —
Чаму гэта скульптар, што ўмеў і кульнуць,
Узяў Талашу ды адшчодрыў вінтоўку, —
А што як захоча ў нябёсы
Пальнуць?!

Прыўстаў і глядзіць
У стагоддзі ён строга, —
Баіцца нападу ці здрады? Наўрад!
Вінтоўку, хаця і не выйшла са строю,
Не думае браць міліцэйскі
Нарад.

А сэрца знячэўку
Падскочыць ды ёкне,
І ледзь Вы не ўскрыкнеце хвіляю той,
Як толькі расток недзе ў часе маёўкі
Прарэжацца ў Вас пад чугуннай
Пятой.

2
Ах, дзядзька Якуб,
Вам з плячэй бы атрэсці
Турботы гадоў, метэоравы пыл
Відно, і ў міжзор'і, як недзе і ў трэсце,
Змантачаны час на адзіны
Капыл?

Вы чуеце скрып
Ды густое шасценне
І ў жнівень спякотны і снежнай зімой.
То кружаць галактык далёкіх шасцерні
Штодзень у надзейным счапленні
З зямлёй.

Таму ў нас святла,
Хоць вазьмі ды заліся,
І зорнай пытлёўкі, — бы чорт намалоў!
Ці чулі, што ў Арктыцы лёд разваліўся
З-за нейкай міжзорнай пахібкі
Малой?

Ды што тыя льды!
Вершы ў нас абвуглелі, —
Дзе срэбра зіхцела, — чарнее там шлак, —
Наўскос дзесьці блізка камета Галея
Рванула ды вогненным смерчам
Прайшла.

Ідзе цеплыня.
Зоры сочаць нядрэмна, —
Мо Арктыкі лёс д'ябал ставіць на кон?
Ах, дзядзька Якуб, гэта болей, чым дрэнна,
Калі сярод творцаў
Таксама раскол?!

Гугнявіць трукач,
Стогне цяжка наватар,
Шпурляе партач камні ў мой агарод.
Як быццам я больш ад усіх вінаваты,
Што ў строфах на ямбы ізноў
Недарод.

Не трэба мне дрын,
Ні чачоткавы колік,
Плячом варухну і — падман з капылоў!
Ах, дзядзька Якуб, ну які я раскольнік,
Хоць, можа, з паўсотні карчоў
Раскалоў.

Не быў нават блізка
Ля д'яблаў замежных,
Іх скрутных сакрэтаў не ўзяў бы й дарма!
Я ўласныя фарбы так густа замешваў,
Што, знаю — цаны ім сягоння
Няма!

Хоць кожны амаль
Пад выццё фарысеяў
На прыску ўласнай душы, як нямы,
Падзей столькі ўпарта праз сіта прасеяў, —
А золата унцыю хто з нас
Намыў?!

Каму па душы
Спеў дамбры і камуза.
А мне не пражыць без жалейкі і дня!
Ах, дзядзька Якуб! Толькі ценькая муза
Для ўсіх нас навекі сястра
І радня!

У творцаў няма
Ні магнатаў, ні босаў,
Што золата з срэбрам хаваюць у спрат.
Таму і ўзіраемся ў вільчык нябёсаў,
Каб высеч алмазы на сотню
Карат.

2007 г.

II. АБАЯНЬ

1
Імперыяй каціўся шторм-буян,
Кідаў да зор валы дзевяцібальныя.
Хіба не ён з паўстанкам Абаянь
Яго і звёў з усмешкай абаяльнаю.

За ганкам — вёрсты дзённай светлаты,
Ды Курская града з рудой магічнаю.
А за спіной — гарластыя франты
І гневам і бунтарствам намагнічаны.

З акопаў выйшаў ён, як хісткі цень.
І падхапілі ўміг шляхі з заломамі,
Па ўхабах і калдоб'і кожны дзень
Кідаючы, як трэску ці саломіну.

Ну а пад Курскам, дзе знайшоў сям'ю,
Што бежанства і голад зненавідзела,
Гай не заснуў, пакуль па салаўю
Для кожнага сямейніка не выдзеліў.

Дол глохнуў каля сцежак селавых,
Калі, як на радзіме дзесь за лядамі,
У сто кален удараць салаўі,
Выводзячы рулады за руладамі.

Пасля патопу ліўня ці дажджу,
Што спёка ў неба каняю вымальвала,
Спрэс гарката уваходзіла ў душу
З жалезнаю магнітнай анамаліяй.

Ён ведаў, — анамалія — бяда!
Паддасца неба ёй, і — будзе хворае.
Збівала з тропу Курская града
Не толькі чуйных птахаў, і — гісторыю!

2
Наўрад ці ўратавала б там куцця.
Душа марнела без канца і чаўрала,
Калі б радок не ўскрыкнуў, бы дзіця,
Як па-над родным Нёманам ці Шчараю.

І вастрыё дыхтоўнага пяра,
Якое праўду ўсёй зямлі даводзіла,
З-пад Курска і да спеўнага Дняпра
Радок вяло, да Свіслачы даводзіла.

Ну а града з жалезнаю рудой,
Што ў дол пайшла і глыбака зашылася,
Пад быльнягом і шэрхлай лебядой,
Здаецца, ажыла, заварушылася.

Ды як яго там у катле вякоў
І ў кіпені жалезным ні выварвалі,
Тэрору не прымаў бальшавікоў,
Асцерагаўся іх не менш, чым варвараў.

Хоць вілы і гранёныя штыкі
Па ўсіх закутках лазілі і нікалі,
Не зачапілі ўсё ж бальшавікі,
Не закранулі белякі Дзянікіна.

Глядзеў штодня не за руды паркан, —
За небасхіл, дзе пахла рутай-мятаю.
Спаўзаў з бяроз паношаны паркаль,
Дубы з плячэй скідалі долу мантыі.

У час расстання дзьмуў падвей-буян.
Галлё з лісцём хадзіла ды буяніла...
І ўслед махала доўга Абаянь
З слязінаю і ўсмешкай абаяльнаю.

2002 г.

III. У СМОЛЬНІ

1
Бакі ў аўтобусе адбіў,
Што быў нібы прашчою пушчаны,
Каб рату ў Смольні я адбыў,
І парадніўся з думнай пушчаю.

На голлі віслі лахманы
Аблокаў з цішаю вагомаю.
Ішлі з лагчыны туманы
Нячутна шэрымі вагонамі.

У двор машынны, бы ў дэпо,
Іх адвячорак вёў калейкамі.
Палонкай зеўрала дупло
Ў сасны, са збітымі каленкамі.

Дарма, што я не следапыт,
Ды трэба мне было з адданасцю
Пералапаціць час і быт
Не менш, чым стогадовай даўнасці.

Галёкаў лес, ірваў гартань.
У неба лезлі сосны стромкія.
А я зямлі пласты гартаў,
Нібы старонку за старонкаю.

Ускрай закінутых адрын,
Дзе лапухоўнік ладзіў форумы,
Сахару прыску я адрыў,
А не бясцэнны скарб фарфоравы.

Хапала ў снежня парыкоў
Для елак-дам, з красой салоннаю,
Калі смаліў тут япрукоў
Да жаўцізны амаль саломеннай.

Мароз распісваў шкло нябёс
Дзе тонкім пэндзалем, дзе віламі,
Пакуль з карчамі туш абоз
Поўз да харомаў Радзівілавых.

З тых год, абвітыя лазой,
Тут борам смольным, там аселіцай
Сляды ад мёрзлых палазоў
У нашы дні бягуць і сцелюцца.

Ля іх, пад покрывам гадоў,
Крывымі гнутымі лякаламі
Ляжыць уроскід цуг слядоў
Ад маладой хады Купалавай.

2
Паэта ўзяўшы за руку,
Дарога тонкай ніткай вошчанай
Наўпрост, праз цемрадзь сасняку,
Вяла да Коласавай вотчыны.

Ён чуў, як Нёман, нібы ў сне,
Непадалёк ад грушын з бэрамі
Са стогнам пашчай пазяхне
Ды пракаўтне акраец берага.

І недзе ў небе славіў дух
Зямнога Бога і падводнага,
Што тут звялі паэтаў двух
Як чарадзеяў слова роднага.

З падмосця бутля першаку,
Нібыта свацця-грахаводніца,
Ў наклейцы — белым фартушку —
Сярод стала стаяла модніцай.

На ножцы шкалікаў крышталь
Свяціўся, хоць крыху і выліняў, —
Бы выбраўся "Зялёны Штраль"
Сюды з усёй багемнай Вільняю.

Стол уздыхаў, крактаў услон,
І з цемры ноч віла вяроўчыну.
А два асілкі глыбы слоў,
Нібы жарнавікі, варочалі.

І з печы звесіўшыся, кот
Па-над лапцямі і над чунямі
Падкручваў ціха ў лямпе кнот,
Ды варушыў вусамі чуйнымі.

Вядро, дзяжа, два капылы,
Жаронцы, сенечкі з начоўкамі
Гамонкі сведкамі былі
Са сціплай цеснай леснічоўкаю.

Клён у расе стаяў ды мок
Пад Шляху Млечнага разораю.
А ён блішчэў і зяяў, дамок,
Увесь абкладзены сузор'ямі.

Паблізу гракаў летні гром,
І над пушчанскай акваторыяй
Маланкі вогненным пяром
Заносіў Смольню у гісторыю.

2007 г.

Бясконцым здаваўся дзень...

Старонкі з аповесці

Вадзім КОРАНЬ

Цяжка апісваць падзеі, у якіх не прымаў удзелу. Зразумела, што апісанае ніжэй — мастацкі вымысел, але ён усё-ткі мае пад сабою дакументальны грунт: у 1930-я гады сапраўды дзейліся рэпрэсіі супраць беларускай інтэлігенцыі і ўвогуле беларускага народа. Падзеі адбываюцца ў лістападзе 1930 года. Хацелася паказаць Коласа напярэдадні напісання так званых "пакаяльных лістоў", першы з якіх быў напісаны 16 лістапада 1930 года, паказаць, як ДПУНКУС мог абыходзіцца з людзьмі, нават такімі, як Колас. Ніжэй прыведзены тэкст — гэта ўрывак з аповесці, у якой побач з прыдуманымі дзейнічаюць і сапраўдныя гістарычныя асобы. Адносіны аўтара да гэтых асобаў даволі суб'ектыўныя.

Аўтар

Дзень выдаўся халаднаваты, але пад абед усё ж выглянула сонца. Калі Колас выйшаў на вуліцу, то яно асляпіла яго сваімі халоднымі промнямі. Ён надзеў на галаву капялюш і пайшоў уздоўж будынка Акадэміі навук. Пасля размовы з Бэндэ ў душу Коласа пакрысе закрадаўся страх. Страх не за сябе, а за сваю сям'ю. Паэт ведаў шмат рэпрэсіраваных "ворагаў народа" і ведаў, што потым робіцца з іхнімі сем'ямі. Калі яго вышлюць на дваццаць гадоў у Сібір, то сям'я паедзе разам з ім, а калі, не дай Бог, расстраляюць, то сям'і трэба будзе адмовіцца ад сваяцтва з ім, бо так будзе жыць значна лягчэй — не быць сям'ёю "ворага народа". Галоўнае — вытрымаць выпрабаванні, застацца чалавекам.

Колас ведаў, як гвалтоўна праводзілася калектывізацыя, якую так ухваляў у размове з ім Бэндэ. Выгадаваны ў сялянскай сям'і, ён бачыў розных людзей у вёсках: і гаспадароў, і бэйбусаў. Пасля рэвалюцыі, калі пачалі даваць зямлю ў карыстанне, многія людзі, адчуўшы пад нагамі грунт, адразу ж узяліся за працу. Яны працавалі ад узыходу сонца і да ночы, ведаючы, што працуюць не на пана, а на сябе. Праз колькі гадоў яны пачалі адчуваць сябе сапраўднымі гаспадарамі на сваёй зямлі. Калі ж савецкая ўлада пачала арганізоўваць калгасы, то сутыкнулася з адмоўным стаўленнем да іх менавіта з боку гаспадароў, бо, вядома, былі і такія людзі, якія нараджалі па дзесяць-дванаццаць дзяцей, а па гаспадарцы нічога рабіць не хацелі або ленаваліся. Іх вабіў іншы занятак — напівацца ў карчме. І тыя, у каго ўсе куты ў хаце апляло павуцінне, з радасцю ішлі ў калгасы. А сапраўдных гаспадароў запісалі ў кулакі і раскулачвалі. Бо хто ж захоча аддаць дабро, нажытае ўласным мазалём?..

З такімі думкамі Колас ішоў па вуліцы. Ішоў няспешна, унурыўшыся ў свае думкі і не заўважаючы нікога і нічога навокал. Раптам ён пачуў, нібыта праз сон, дзіцячыя галасы, і, узняўшы вочы, пабачыў наперадзе гурт дзетак, якія ішлі яму насустрач і аб нечым спрачаліся. Калі яны параўняліся, то бялявая дзяўчынка, апранутая ў простае шэрае паліто, убачыўшы і, пэўна, пазнаўшы Коласа, усклікнула:

— Ой, гэта ж Якуб Колас! Я вас пазнала. Я вашую кніжку чытала, "Новая зямля" называецца. Ой, цікавая...

Дзеці абступілі Коласа, а дзяўчынка, працягваючы, пачала дэкламаваць на памяць:

— Мой родны кут,
як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю...

Тут дзяўчынка крыху збянтэжылася, але Колас, прыйшоў ёй на дапамогу:

— О, як хацеў бы я
спачатку
Дарогу жыцця па парадку
Прайсці яшчэ раз,
азірнуцца,
Сабраць з дарог
каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя, —
К вясне б маёй
хацеў вярнуцца.

Коласа расчуліла дзіцячая непасрэднасць. Гледзячы на старанне дзяўчынкі і на зацікаўленыя погляды яе сяброў, ён прамовіў:

— Ну, добра, хопіць. А як жа тваё імя, дзяўчынка?

— Кацярынкаю клічуць, — адказала яна, сарамліва гледзячы сабе пад ногі.

— Малайчына, Кацярынка! — Колас уважліва паглядзеў на дзяўчынку. — Вы, мусіць, дзеткі, усе добра вучыцеся? — запытаўся ён.

— Вядома, што добра, — разам адказалі дзеці.

— І чыталі маю паэму?

— Я чытала, — толькі адна Кацярынка адказала на гэтае пытанне, — бацька мой казаў, што вельмі харошая кніга, ну, я і ўзяла ў бібліятэцы пачытаць. І праўда цікава. Вельмі-вельмі... Праўда, я не ўсё яшчэ прачытала, але хутка дачытаю, бо трэба ж несці здаваць у бібліятэку.

— Дык у цябе гэтай кнігі няма? То прыйдзі заўтра да Акадэміі навук, тут недалёка. Ведаеш, дзе гэта?

— Ведаю, — адказала Кацярынка.

— Калі ведаеш, то добра. Заўтра прыходзь а дванаццатай гадзіне дня да галоўнага ўваходу — я прынясу табе кнігу.

— Праўда? — у вачах Кацярынкі загарэўся радасны агеньчык. — Я прыйду. Праўда прыйду.

Колас дастаў з кішэні гадзіннік і, зірнуўшы на яго, убачыў, што перапынак скончыўся і пара вяртацца на працу.

— Ну, добра. Заўтра буду цябе чакаць, а цяпер трэба ісці на працу. Да сустрэчы.

— Да пабачэння, — зашчабяталі дзеці, і Колас скіраваў да Акадэміі навук.

А па дарозе ён думаў пра сваю сустрэчу з дзецьмі: "Калі дзеткі, пачытаўшы паэму, гавораць, што яна цікавая, то пляваў я на меркаванні і выказванні так званых крытыкаў. Дзеці — вось хто самыя лепшыя крытыкі. Яны не крытыкуюць, а гавораць тое, што думаюць. Я даўно гэта ведаў, яшчэ з Люсіна і Пінкавіч. Дарослыя праўду не скажуць, а дзеці — калі ласка. ...Але цяпер у нас ёсць толькі адзінае правільнае меркаванне — бэндаўскае."

З такімі думкамі Колас вярнуўся на працу.

Адчыніўшы дзверы і зайшоўшы ў свой кабінет, ён распрануўся, падышоў да кніжнай шафы і дастаў "Новую зямлю" ў асобным выданні. Потым сеў за стол, узяў у рукі пяро, макнуў у чарніліцу і зрабіў надпіс на тытульным лісце: "Мілай дзяўчынцы Кацярынцы. Спадзяюся, што праз некалькі дзесяткаў гадоў ты разгорнеш гэтую кнігу, успомніш дзядзьку Якуба, а заадно і некалькі радкоў з ягонае паэмы". Потым паставіў дату і распісаўся "Якуб Колас".

Зрабіўшы такі надпіс, Колас загарнуў кнігу і паклаў на край стала. Пасля ён зірнуў на партрэт Сталіна, які, на жаль, не знік за час яго адсутнасці, і пачаў займацца сваёй звычайнай працай. Да канца дня, за выключэннем некалькіх візітаў, якія тычыліся бытавых пытанняў, ніхто Коласа не турбаваў.

Так прамінуў яшчэ адзін дзень, які быў вельмі напружаны, цяжкі. А колькі такіх дзён чакала яго наперадзе...

Прыйшоўшы дадому і адрэдагаваўшы некалькі старонак рукапісу чарговага раздзела паэмы "На шляхах волі", Колас адклаў пяро ўбок, склаў чарнавікі ў асобную папку і пачаў рыхтавацца да сну. Лёг у ложак, але заснуць доўгі час не мог — зноўку і зноўку пракручваў у галаве размову з Бэндэ. Але сон усё ж змарыў Коласа. І прыснілася яму нешта дзіўна-фантастычнае і адначасова небяспечна жахлівае. Коласу снілася дзяцінства — самая лепшая пара жыцця.

...Маленькі Кастусь разам з дзядзькам Антосем з самай раніцы выбраліся вудзіць рыбу. Яны ішлі да Нёмана праз ранішні лес, чароўны і загадкавы. Ішлі доўга. Кастусь увесь час аглядаўся па баках, па-дзіцячы баючыся кожнага шолаху. Дзядзька Антось толькі пасміхаўся з гэтага дзіцячага страху, дакладна ведаючы, што з імі нічога здарыцца не можа. А лес і сапраўды быў загадкавы: дубы нагадвалі волатаў, зачараваных нейкай злой сілаю, бярозкі — дзяўчатак, якія чакалі неймавернага цуда, елкі — вялікія зялёныя палацы, у якіх схаваны прыгожыя паненкі, што чакаюць, калі хто-небудзь вызваліць іх з палону... Дзядзька Антось на хвіліну спыніўся, набіў тытунём люльку, запаліў, павярнуўся да пляменніка і спытаў:

— Баішся?

Потым усміхнуўся ў вусы, выпусціў шызы дым і дадаў:

— Не бойся, усё, што ты бачыш навокал — відзяжы. Гэтага няма. Потым сам зразумееш, як назад будзем вяртацца. А цяпер хадзем.

І, павярнуўшыся спінаю, ён пашыбаваў далей па сцежцы. Кастусь стараўся не адставаць, але раптам спыніўся, быццам успомніў нешта важнае, і закрычаў:

— Дзядзька! Дзядзька! А вуды ж мы забылі! Чым жа рыбу лавіць будзем?! Вуды ж мы забылі, дзядзька Антось!!!

Дзядзька Антось павярнуўся і спакойна прамовіў:

— Я іх на беразе прыхаваў — ніхто не знойдзе. Хадзем хутчэй, бо зараз рыба брацца пачне — прапусцім пару. І што ж тады нам твае бацькі скажуць: "От, рыбакі! Лавілі рыбу, а злавілі грыба?"

І, усміхнуўшыся сваёю, антосеўскай усмешкай, дадаў:

— Але, як назад будзем ісці, то скіруем напрасткі праз лес — грыбоў пашукаем.

Кастусь падбег да дзядзькі Антося, узяў яго за руку і пайшоў побач. Яму вельмі захацелася ў грыбы, бо збіраць грыбы Кастусь любіў больш, чым лавіць рыбу. Але нічога, грыбоў назбіраюць і пасля.

Вось яны і каля ракі. Нёман у тым месцы, дзе яны выйшлі, не надта шырокі, але прыгожы. Сонца было яшчэ далёка — на ўсходзе ледзь-ледзь пачала прабівацца ружовая палоска. З берага на ваду схіліліся дрэвы, якія глядзелі на свае адбіткі ў рацэ, нібы ў люстэрка. Над ракою плыў туман, ды такі, што не відаць другога берага. Дзе-нідзе ўжо "гуляла" рыба. Дзядзька Антось прыслухаўся. Навокал цішыня.

— От, глядзі, — сказаў ён Кастусю, — гэта шчупак пагнаў плотку. Бачыш, які след на вадзе. Кожны хоча жыць. А каб жыць, трэба есці. Гэта такі закон, і яго ўжэ ніяк не зменіш, але можна яму не падпарадкоўвацца. А там лешч гуляе...

Дзядзька Антось даў Кастусю вуду і павучальна зазначыў:

— Ты лаві тутака, а я пайду трохі далей па цячэнні, мо што большае ўлаўлю. Закідай пад зелле, але глядзі не зачапі кручка, бо палезеш даставаць. Можа, якую плотку і ўловіш.

Сказаўшы гэта, ён павярнуўся і пайшоў. Кастусь паглядзеў услед дзядзьку, начапіў прынаду на кручок і закінуў вуду. Чакаў нядоўга. Рыба за ноч выгаладала і адразу ж заглытнула прынаду. Паплавок, зроблены з гусінага пяра, тузануўся раз, другі, і лёг на ваду. Кастусь пачаў цягнуць — і праз імгненне плотачка ўжо ляжала ля ягоных ног. Так хлопчык злавіў пяць плотак і трох невялічкіх акунькоў. Кастусь пачаў закідаць вуду бліжэй пад водарасці і нечакана для сябе зачапіў за іх кручок. Клікаць дзядзьку не адважыўся, вырашыў, што сам здолее дастаць. Да кручка трэба было плыць праз даволі глыбокае, зарослае водарасцямі, месца. Кастусь паклаў вуду з арэшыны на бераг і пачаў распранацца, каб лезці ў ваду. Паспытаўшы яе нагою, адчуў холад. Зрабіў два крокі і нібы праваліўся ў бездань. Ён паплыў. Даплыўшы да зачэпа, пачаў навобмацак шукаць кручок. Знайшоўшы, нырнуў, адчапіў яго, паплыў назад і раптам адчуў, што ягоныя ногі пачалі аблытваць водарасці, мяккія, як жывыя. Нібыта гнуткія змеі. Кастусь пачаў варушыць у вадзе нагамі, але яшчэ больш заблытваўся. Падводныя змеі цягнулі яго на дно. Кастусю падалося, што нехта жывы сядзеў пад вадою і цягнуў яго да сябе. Хлопец паспрабаваў вызваліцца з палону, але ўсё, што ён змог — разарваць рукамі некалькі падводных раслінаў.

Ён пачаў тануць.

Зрабілася страшна...

Вада трапляла ў рот, у нос, залівала вочы. Стала цяжка дыхаць. Кастусь пачаў біць рукамі па вадзе, але крыкнуць не мог — перашкаджалі водарасці, якія абляпілі твар. Ён зразумеў, што трапіў у пастку, з якой самастойна выбрацца не зможа. Сабраўшы апошнія сілы, Кастусь вынырнуў на імгненне з вады — і над Нёманам пранёсся ягоны поўны жудасці крык:

— А-а-а-а-а-а-а-а-а-а!!!

Кастусь бачыў, як да яго на чоўне плыве дзядзька Антось, усім целам налягаючы на адзінае вясло. Але сілы пакінулі хлопца, і ён пачаў павольна апускацца ўніз. Вада забірала яго сабе. Навокал запанавалі цёмна-зялёныя фарбы, якія пераходзілі ў чорныя...

...І тут Колас прахапіўся. З ілба на падушку скацілася кропелька поту. Толькі цяпер ён з палёгкаю ўздыхнуў, зразумеўшы, што ўсё, што бачыў — проста сон. Але гэты сон не адпускаў яго: Колас помніў усё да драбніц, зноў і зноў перажываючы жахлівы момант.

Раптам пачуўся грукат у дзверы. Не стук, а менавіта грукат. Грукалі нечым цяжкім. Толькі потым Колас зразумеў, што гэта быў прыклад вінтоўкі. Колас падхапіўся з ложка і пайшоў да дзвярэй, папярэдне накінуўшы на плечы кашулю. Ішоў няспешна, хоць і здагадваўся, хто гэта грукае — стараўся даць магчымасць жонцы апрануцца. Вельмі не хацелася, каб гэты грукат пабудзіў Міхася. Добра, што Даніка і Юркі няма дома. Падышоўшы да ўваходных дзвярэй, Колас ціха запытаў:

— Хто там?

У адказ ён пачуў мацюканне, якое перакрыў зычны моцны голас:

— Открывайте! Государственное политическое управление.

Колас чакаў гэтага, таму, азірнуўшыся і ўбачыўшы, што Марыя Дзмітрыеўна апранулася і выйшла са спальні, адамкнуў і адчыніў дзверы. У хату ўвайшлі пяцёра. Двое ў вайсковай форме і з вінтоўкамі ў руках — пэўна, гэта яны грукалі ў дзверы, — а трое былі ў цывільным. У аднаго з іх у руках меўся шэры партфель.

— Мицкевич Константин Михайлович, как я полагаю? Он же Якуб Колас? — спытаў адзін з начных наведвальнікаў.

— Так, — адказаў Колас, — і хацеў бы даведацца, што прывяло вас у маю хату?

— Капитан Панов, особый отдел, — адказаў, пэўна, галоўны з усіх і паказаў Коласу пасведчанне супрацоўніка ДПУ. — Сейчас у вас в доме будет проводиться обыск.

Паноў павярнуўся да сваіх супрацоўнікаў і аддаў распараджэнні:

— Один около дверей, вы трое, — паказаў ён рукою, — тщательно обыскать дом. Что ищем, знаете. Ну, а я возьму на себя рабочий кабинет.

Тут ён павярнуўся да Коласа і дадаў:

— Пройдёмте... Жена ваша останется здесь под присмотром товарища Голубева.

І Колас паглядзеў на жонку, уздыхнуў і пасунуўся ў свой кабінет, адчуваючы патыліцаю пагляд капітана Панова, які ішоў за ім і які цяпер вырашае ягоны лёс і лёс ягонай сям'і.

Арт-пацеркі

Трыццаць гадоў таму, летам 1977-га, выдавецтва "Беларусь" выпусціла ў свет кнігу народнага мастака СССР, вядомага беларускага скульптара Заіра Азгура "То, что помнится...". З цягам часу ўспаміны і назіранні гэтага чалавека, якому давялося прайсці вялікі жыццёвы шлях, сустракацца ці супрацоўнічаць з многімі цікавымі асобамі, набываюць асаблівую каштоўнасць. У год, калі адзначаецца юбілей карыфеяў беларускай літаратуры, а да таго ж — 95-годдзе з часу іх першай сустрэчы ў Смольні, цікава перачытаць у раздзеле "Пра людзей, якім я ўдзячны", згадкі пра Янку Купалу і Якуба Коласа (з імі З. Азгура звязвала доўгае сяброўства). Уражвае ўсё: і аповед пра жыццё ў гасцінным доме на Правіянцкай вуліцы з хлебасольнымі гаспадынямі —Купалавай маці ды яго жонкай Уладзяй, з вечарынамі маладнякоўцаў, і першы сеанс працы над партрэтам Якуба Коласа, і размовы з Янкам Купалам, і эпізод шахматнага двубою паэтаў-сяброў... Прывабліве ўвагу і аўтарскае апісанне задумы помніка на плошчы Якуба Коласа. Дарэчы, фрагменты менавіта гэтай вядомай скульптурнай кампазіцыі З. Азгура змешчаныя на супервокладцы кнігі, якая была выдадзеная накладам 15 тысяч асобнікаў і, напэўна, даўно ўжо зрабілася рарытэтам.

Вобразы і сюжэты вялікіх класікаў айчыннай літаратуры — адвечная і невычэрпная крыніца творчага натхнення для нашых кампазітараў. Ці не ў кожнага з іх ёсць старонкі, натхнёныя радкамі Купалы і Коласа. Спроба сёння, з нагоды юбілею песняроў, пералічыць такія творы — марная: атрымаецца неабдымны спіс.

Вакальныя творы на вершы народных паэтаў пісалі К. Галкоўскі, Л. Рагоўскі, А. Туранкоў, І. Любан, М. Равенскі,С. Аксакаў, А. Клумаў, М. Аладаў, І. Чуркін, А. Багатыроў, Я. Цікоцкі, М. Шчаглоў, Р. Пукст, Д. Лукас, Д. Камінскі ды многія кампазітары наступных пакаленняў, у тым ліку нашы сучаснікі. Што да іншых жанраў... Напрыклад, 55 гадоў таму М. Чуркін напісаў увертюру для аркестра беларускіх народных інструментаў "Памяці Янкі Купалы". У 1972-м араторыю для чытальніка, двух салістаў, двух хароў і сімфанічнага аркестра "Памяці паэта" на Купалавы вершы стварыў С. Картэс. Праз дзесятак гадоў пасля таго з'явілася кантата У. Дамарацкага "Мая Беларусь" (вершы Якуба Коласа), адбылася і прэм'ера вакальна-сімфанічнай паэмы В. Помазава "Янка Купала". Арыгінальныя творы прысвяцілі яму Г. Гарэлава — сімфанічная паэма "Бандароўна", І. Лучанок — кантата "Курган", паэма-легенда "Гусляр" для вакальна-інструментальнага ансамбля, А. Мдзівані — харавы вакаліз "Янка Купала", У. Кандрусевіч — араторыя "Паданне"...

Можна прыгадаць нямала харавых цыклаў, рамансаў, песень, аркестравых партытур, інструментальных п'ес, сюіт з музыкі да тэатральных і радыёпастановак, мастацкіх і дакументальных фільмаў, дзе творчасць народных паэтаў станавілася крыніцай натхнення для кампазітараў І. Паліводы, У. Мулявіна, І. Лучанка, Э. Зарыцкага, Л. Захлеўнага, К. Цесакова, А. Залётнева, У. Кур'яна, Л. Сімаковіч, М. Літвіна, А. Літвіноўскага, Л. Мурашкі, В. Сярых, Д. Яўтуховіча, Я. Паплаўскага, А. Чыркуна... Але галоўнай крыніцай натхнення была яна ўсё ж для класікаў айчыннай музыкі: успомнім легендарную оперу А. Багатырова "У пушчах Палесся" (паводле Коласавай "Дрыгвы"), яго ж кантату "Беларускім партызанам" на Купалаў верш; увасабленне вобразаў купалаўскіх паэм у балетах Я. Глебава "Выбранніца", "Курган" і яго паэме-легендзе "Машэка" ("Магіла льва"); оперу Ю. Семянякі "Новая зямля", яго ж музычную камедыю "Паўлінка"...

Нядаўна ў сталічнай філармоніі, у праграме аўтарскага канцэрта майстра сучаснай беларускай кампазітарскай школы Д. Смольскага прагучала яго араторыя "Паэт" на вершы Янкі Купалы, створаная ў 1979 годзе. Яна не страціла сваёй актуальнасці.

С. ВЕТКА

Кажуць, усе дзеці таленавітыя. Адкуль жа тады нахабныя "сераднячкі" ды прабіўныя няздары?.. Мабыць, з тых, каму ў дзяцінстве не пашанцавала на таленавітага настаўніка — такога, як Святлана Купрыянава. Яна кіруе дзіцячай выяўленчай студыяй пры Палацы культуры Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода і ўжо некалькі гадоў запар прадстаўляе творчасць сваіх выхаванцаў на мастацкіх выстаўках, што ладзяцца падчас традыцыйнага майскага фестывалю "Музы Нясвіжа". Кожны раз работы юных мазыран уражваюць адухоўленай вобразнасцю, глыбінёй і самастойнасцю задумы, арыгінальнасцю кампазіцыі. Менавіта гэтымі вартасцямі запомніліся мне малюнкі мастака-пачаткоўца Мішы Кухарэнкі, заўважаныя на першых нясвіжскіх вернісажах студыі Святланы Купрыянавай.

Згадка з працягам

У адной з работ М. Кухарэнкі, на той час 15-гадовага падлетка, незвычайна і ўражліва прагучаў матыў сяброўства маладых паэтаў. Які палёт фантазіі, якая простая і мудрая метафарычнасць выявы, якая шчырасць пачуцця, незалежнасць ад стэрэатыпаў! Янка Купала і Якуб Колас у стыхіі паэтычнага братэрства, у кругабегу жыцця на роднай зямлі — натхнёныя, рамантычныя, дасціпныя і дзёрзкія. Такім успрыняла і запомніла я гэты, па сутнасці, дзіцячы малюнак... І вось, прыгадаўшы тое сваё даўняе ўражанне, напісала Святлане Купрыянавай. Неўзабаве прыйшоў ад яе ліст з Мазыра:

*"Работа (малюнак гуашшу), пра якую ты згадваеш, называецца **"Бяседа"**, напісаная Мішам Кухарэнкам у 15 гадоў. Увасабляе яна размову двух сяброў — Янкі Купалы і Якуба Коласа. Сімвалічны саламяны капялюш закружыў сяброўскі так, што яны апынуліся па-за часам, па-за прасторай. Мішу ўдалося перадаць гэты **рух**, што бывае цяжэй за ўсё. Ведаючы пра бескарыслівую кранальную, сапраўдную дружбу двух вядомых людзей, Міша вырашыў, што перадусім яны проста вясёлыя гумарыстыя **беларусы**. Ён убачыў у іх народную мудрасць, імпэт і аптымізм, таксама ж блізкасць да народа — адсюль жа і брыль! Міша ведаў ужо тады, працуючы над кампазіцыяй, што варта было гэтым дружбакам сустрэцца, гутаркі працягваліся да самага ранку. Пра што гаварылі гэтыя двое, у якіх душа пакутавала за лёс народа?.. Напэўна ж, размовы былі перасыпаныя і гумарам?*

*Міша імкнуўся з ранніх гадоў як мага больш ведаць. Ва ўсялякіх ведах шукаў глыбіню. Скончыў школу з медалём, але гэта не галоўнае. Важна тое, што веды і цікавасць да гісторыі Беларусі прывялі яго ў каманду эрудытаў г. Мазыра, а затым хлопца ўзялі і ў зборную вобласці. Дзякуючы шматлікім перамогам у турнірах, Міша быў узнагароджаны паездкай у летнік эрудытаў Беларусі, размешчаны ў Залессі, дзе захавалася сядзіба Агінскага. Там моладзь бавіла ўвесь свой час. Ладзіліся і тэатральныя, і музычныя вечарыны... Вось, мабыць, таму яго работа "Раяль на снезе" (таксама экспанавалася ў Нясвіжы і "ЛіМ" пра яе пісаў. — **С. Б.**) гэтак пранізліва кранае душу. Міша ўсё перажыў сам, імкнучыся пераўвасобіцца ў сучасніка Агінскага. Ён сам музыкант, валодае клавішным інструментам і гітарай. А пра Агінскага я вельмі шмат чытала і распавядала дзецям у студыі. Міша быў шчаслівы пабываць на роднай зямлі шаноўнага і дарагога для яго чалавека... Ён умее адчуваць, умее пачуцці па-мастацку сканцэнтраваць у пэндзлі.*

Цяпер ён студэнт 4 курса БНТУ, будучая прафесія мастак-паліграфіст. Студыю не забывае, і тэлефануе, і заходзіць, калі прыязджае да матулі, таты, у родныя мясціны! Падчас вакацый па старой звычцы сядае за мальберт. Займаўся тут 7 гадоў (прыйшоў 10-гадовым). Яго месца ў студыі ніколі не занятае, а ў яго біяграфіі студыя прапісалася светлым лапікам назаўжды, як і ён — у нашай. Міша — вучань, якім ганаруся".

Вось такая згадка. Дзе ж яе працяг? У кніжках, якія, пэўна, з часам будзе афармляць Міхаіл Кухарэнка. А, мабыць, і ў яго персанальных выстаўках...

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

На здымках: С. Купрыянава і М. Кухарэнка, ужо студэнт, які наведаў родную студыю; "Бяседа".

Паслухаць — і перачытаць

Да нас яны нярэдка прыходзяць разам з музыкай, праз музыку. А там, дзе музыка, — і эмоцыі шчырэй, і ўражанні ярчэйшыя. Нездарма ж мелодыю называюць мовай душы і кажуць: дзе канчаюцца словы, там пачынаецца музыка. Ды ўсё ж у той вечар яны — мілагучныя, паэтычныя, напеўныя родныя беларускія словы — гучалі з музыкай на роўных, сілкуючы адно аднае.

За нейтральным словам "канцэрт" хавалася нешараговая імпрэза, якая ўлучыла ў сябе народны акапэльны спеў, паэтычнае слова, інструментальную акадэмічную музыку, мастацкую прозу, меладэкламацыю, канферанс. Ідэя належыць майстру мастацкага слова, артыстцы Беларускай дзяржаўнай філармоніі Зінаідзе Феакціставай. Пад назвай "Песняры роднага краю" яна аб'яднала дзве свае музычна-паэтычныя кампазіцыі: ужо вядомую публіцы, лірыка-драматычную "Памяці Максіма Багдановіча" і прэм'еру "Песня пра долю" (паводле твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа), у поліфаніі якой удала спалучыліся і яркая публіцыстычнасць, і гумар, і рамантызм. Натхнёнымі партнёрамі З. Феакціставай сталі салісты філармоніі, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Святлана Старадзетка (сапрана), Алена Лузан (фартэпіяна), Наталля Змітровіч (домра), Таццяна Шумакова (цымбалы), а таксама... публіка. Чуйная, удумлівая, патрыятычная.

Малая зала імя Р. Шырмы ў той золкі восеньскі вечар поўнілася рознымі людзьмі. Але вядомыя дзеячы айчыннай культуры, сталыя наведнікі філармоніі, моладзь з аднолькавай цікавасцю ўспрымалі праграму. Што стварала яе прыцягальнасць? Кранальны расповед пра Багдановічаву маці, Максімавы развагі пра музычнае мастацтва, яго хрэстаматыйныя вершы і паэтычныя прысвячэнні яму — творы У. Караткевіча, М. Танка, А. Лойкі, папулярная "Зялёная вішня" і вакальная класіка А. Туранкова, А. Багатырова, Л. Рагоўскага, Л. Абеліёвіча, І. Паліводы, Л. Захлеўнага; інструментальныя версіі вядомых песень І. Лучанка, У. Мулявіна, якія з першых нот абуджаюць у памяці радкі нашых паэтаў-класікаў; п'есы І. Жыновіча, М. Чуркіна, Я. Глебава, В. Іванова, П. Чайкоўскага. Пяшчотны дуэт домры і раяля; рэдкаснае, параўнанае з кантыленай, гучанне цымбалаў; багатая ігра тэмбраў у голасе спявачкі, артыстызм і самаадданасць чытальніцы, яе кранальнае акапэльнае выкананне народных песень... Найбольш уразілі ў інтэрпрэтацыі З. Феакціставай Коласава апавяданне "Ноч, калі зацвітае папараць", урыўкі з "Новай зямлі" — "Вялікдзень", "Падгляд пчол" (на фоне адмысловай музычнай кампазіцыі, створанай Л. Шурманам) ды "Па дарозе ў Вільню", Купалава "Бандароўна"...

Незаўважна прамінулі дзве з лішкам гадзіны, пакінуўшы ўспамін пра цеплыню і шчырасць Беларускага Дома і абудзіўшы памкненне перачытаць "свежым вокам" такія, аказваецца, незнаёмыя і такія надзённыя старонкі нашых класікаў.

Лана ІВАНОВА

На здымках: лаўрэат Нацыянальнага і Усесаюзнага конкурсаў артыстаў эстрады З. Феакцістава; лаўрэаты міжнародных конкурсаў С.Старадзетка ды А. Лузан.

Фота Кастуся Дробава

Вечнае адраджэнне

Народны артыст СССР і нашай краіны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Валянцін Елізар'еў прымае віншаванні з 60-годдзем. 30 кастрычніка, у дзень яго нараджэння, на сцэне Палаца Рэспублікі адбылася ўрачыстая, з мноствам шаноўных гасцей, юбілейная вечарына. Яна сталася апафеозам своеадметных творчых агледзін: перад гэтым на працягу месяца Нацыянальны акадэмічны тэатр балета Беларусі прадстаўляў спектаклі, пастаўленыя Майстрам, мастацкім кіраўніком нашага знакамітага харэаграфічнага калектыву. Вядома, творчасць Валянціна Елізар'ева, як і сама яго выдатная асоба, — заўсёды ў полі зроку "ЛіМа". Таму мы прапануем пагаварыць пра шаноўнага юбіляра, не засяроджваючы ўвагу на біяграфічных звестках і фактах з летапісу тэатра — створанага яго талентам і прафесійнай воляй. Тэатра, знанага ў сённяшнім свеце. Юбілею Валянціна Елізар'ева прысвячае свае наткі малады крытык.



Есць у гісторыі і мастацтве постаці-маналіты, знакавыя для сваёй эпохі і сферы дзейнасці. Такой постаццю для Беларускага балета з'яўляецца сёння яго мастацкі кіраўнік, лаўрэат прэміі "Бенуа дэ ля данс", прафесар і акадэмік Валянцін Елізар'еў. Творчасць гэтага чалавека вось ужо больш як трыццаць гадоў вызначае аблічча Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Беларусі, які ведаюць і далёка па-за межамі нашай краіны.

Валянцін Елізар'еў стварыў шэраг спектакляў, якія ў традыцыйным рэпертуары адрозніваліся пэўнай канцэптуальнай навізной, узнімаючы часам важныя філасофска-гістарычныя пытанні, сцвярджаючы такім чынам здатнасць балета, побач з іншымі відамі мастацтва, адпавядаць патрабаванням часу і даносіць да гледача высокія ідэі, абуджаць да разважання. "Стварэнне свету" (1976 г.), "Ціль Уленшпігель" (1978 г.), "Спартак" (1980 г.), "Балеро" (1984 г.), "Рамэо і Джульета" (1988 г.), "Страсці (Рагнеда)" (1995 г.) вызначаюцца манументальнасцю ідэйнага зместу, пастаноўкай праблем агульначалавечых і вечных: Дабра і Зла, міласэрнасці і прабачэння, свабоднай волі чалавека, гераічнай барацьбы за свабоду... Вельмі імпануе і тое, што пры высокай ступені канцэптуальнай абагульненасці вобразаў, такіх, як Спартак, Фрыгія, Крас, Ціль і Нэле, Адам і Ева ды іншых, існых нібы па-за межамі часу, яны творчай воляй балетмайстра захоўваюць і свае індывідуальныя характарыстыкі, не страчваючы "ўласны твар". Амаль ва ўсіх балетах Елізар'ева паўстае вобраз Змагара — чалавека неверагоднай духоўнай моцы, пераможцы па самой сваёй сутнасці. Нават трагічны лёс гэтага героя, яго пагібель (так, гіне Спартак, Ціль Уленшпігель, Адам) не абарочваецца паражэннем, фізічная смерць не ўспрымаецца безвыходнасцю, бо самі героі — носьбіты і ўвасабленне тых ідэй і ідэалаў, якія не гінуць. Яны бессмяротныя ў сваёй аснове, непазбежнае іх адраджэнне, бо вечнымі з'яўляюцца барацьба за свабоду, шчасце, каханне, высакароднасць духу — каштоўнасці, уласцівыя кожнай эпосе і нязменныя, не залежныя ад часу.

Прыгажосцю кранаюць сэрца дуэты ў балетах В. Елізар'ева. Жанчына і мужчына ў іх — дзве часткі Адзінага, праз іх пачуцці раскрываецца Сусвет, іх адносіны яшчэ паўней раскрываюць ідэйны змест спектакля; пяшчота і шчырасць, эмацыйнае адзінства герояў — праява дуалізму кожнай з'явы навакольля. Харэаграфія Елізар'ева заўсёды арыгінальная, адрозніваецца пластычнай прыгажосцю, дзівосным зліццём музыкі і танца, эмацыйнай напоўненасцю і адухоўленасцю...

Пагаварыць пра Валянціна Мікалаевіча мне пашчасціла з яшчэ адной знакавай для Беларускага балета асобай, яго сапраўднай зоркай, першай выканальніцай роляў Кармэн, Нэле, Фрыгіі, Евы ў елізар'еўскіх спектаклях, народнай артысткай Беларусі Людмілай БРЖАЗОЎСКАЙ. Вось што, у прыватнасці, расказала Людміла Генрыхаўна:

*— З прыходам у 1973 годзе ў наш тэатр на той час маладога ленінградскага балетмайстра Валянціна Елізар'ева ўжо можна было казаць пра адкрыццё новай эпохі ў беларускім балеце. Першая наша сустрэча з Валянцінам Мікалаевічам адбылася пры пастаноўцы "Кармэн-сюіты" Бізэ-Шчадрына.[Прэм'ера адбылася ў 1974 г.— **К. Я.**]. Ішоў пошук, смелы, вырашальны, дзёрзкі. Мы не адразу спасцігалі ўсё, што хацеў раскрыць і перадаць балетмайстар, не адразу нараджаўся вобраз, але праца захапіла ўсіх. Акцёрам даводзілася ствараць вельмі неадназначных і эмацыйных герояў, асвойваючы складаную тэхніку і пластыку, пераўвасабляцца. Аднак спектакль набіраў сваю моц і стаў захапляльным відовішчам, у якім не было абыякавых. "Кармэн-сюіта" перажыла ўжо свой нават 30-гадовы юбілей і працягвае жыць і дыхаць пачуццямі нашых дзён. Гэты спектакль — адкрыццё для кожнай танцоўшчыцы і танцоўшчыка.*

Свае першыя спектаклі, у тым ліку і "Кармэн", Валянцін Мікалаевіч рабіў у садружнасці з мастаком рэдкага таленту Яўгенам Лысікам. Іх сатворчасць — гэта бясконцы пошук, нечаканыя вырашэнні, новыя формы, новая пластыка, ні ў чым не падобная да нашых ранейшых спектакляў. Напрыклад, "Шчаўкунчык", пастаўлены ў 1982-м, на геніяльную музыку П. Чайкоўскага. Гэтая работа, як і кожны балет Елізар'ева, вымагала велізарнага натхнення, смелага вырашэння, высокай тэхнічнай падрыхтоўкі артыстаў. Бачыць вачамі дзіцяці свет казкі, дзе ўсё надзвычай трапяткое, шчырае і даткліваe, дзе нараджаецца каханне, дзе выяўляюцца дабрыня і пяшчота... У "Шчаўкунчыку" мы не толькі прайшлі праз вялікія тэхнічныя цяжкасці, але і нібыта напоўніліся той шчырасцю і цеплынёй, якая азорвае ўвесь спектакль. У ім трэба палюбіць усё, тады многае адкрыецца і для артыстаў, і для гледача, якога яны павінны правесці ў гэты фантастычны, прыгожы свет...

Елізар'еўскія балеты з'яўляюцца адкрыццямі не толькі для гледачоў: артысты з задавальненнем танцуюць у іх. У велічныя харэаграфічныя палотны ўкладзены ўвесь талент Валянціна Мікалаевіча, творчыя сілы, пачуцці, майстэрства— і яго, і аднадумцаў-артыстаў. У гэтых балетах, якія ўражваюць размахам, манументальнасцю, гучыць чалавечая драма сапраўды гістарычнага маштаба. А іх героі нясуць у сабе бязмежную любоў да свайго народа, сілу пачуццяў, сцвярджаюць веру ў прыгажосць, каханне і адданасць.

Сёння словы "Беларускі балет" і "Валянцін Елізар'еў", напэўна, успрымаюцца амаль як сінонімы. За плячыма юбіляра — столькі год працы ў мастацтве! Аднак, талент і памкненне Творцы не ведаюць часу і межаў. Праз год будзе адноўлена сцэна Вялікага тэатра оперы і балета. І шчырыя прыхільнікі творчасці В. Елізар'ева чакаюць увасаблення на ёй новых пастановак Майстра...

Кацярына ЯРОМІНА

«То—наймацнейшая аснова...»

Роздум напярэдадні прэм'еры

Нашы чытачы ўжо ведаюць, што ў Беларускім паэтычным тэатры аднаго акцёра "Зьніч" рыхтуецца прэм'ера спектакля паводле творчасці Якуба Коласа. Першы паказ новай работы адбудзецца 28 лістапада ў сталічнай філармоніі, у Малой зале імя Рыгора Шырмы. А сёння на старонках "ЛіМа" сваімі разважаннямі напярэдадні прэм'еры дзеліцца яе выканаўца, артыст тэатра Мікола Лявончык.

— Часта чую, што беларускую літаратуру называюць сялянскай. Гэта зразумела: галоўны герой — селянін. А для селяніна самае важнае — зямля. Зямля для яго не толькі месца, дзе расце хлеб, без якога немагчыма жыць. Зямля — гэта тая аснова, дзеля якой жыве чалавек. Зямля — галоўная тэма беларускіх апавяданняў, раманаў. І Коласава творчасць тут не выключэнне.

Углядаюся ў фотаздымкі. Асабліва люблю і памятаю адзін: Колас — з цэлым кошыкам баравікоў, які трымае ў руках. Тут— увесь дзядзька Якуб, уся яго сялянская натура. Што такое зямля для селяніна, ён добра разумеў:

...зямля, зямля...
Свой пэўны кут, свая ралля:
То — наймацнейшая аснова
І жыцця першая умова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля — аснова ўсёй айчыне.

Ісціна, якую я таксама адчуў гадамі, адчуў душой... І вельмі прыемна, што мастацкі кіраўнік тэатра "Зьніч" Галіна Дзягілева дала мне магчымасць распачаць рэпетыцыю коласаўскай "Новай зямлі". Абмяняўшыся ўласнымі думкамі, мы пачалі працаваць, і зараз на ўсю моц працуем над спектаклем "Іду на пляц да Якуба Коласа". Дык вось, на рэпетыцыю іду, як на свята. Я нават не здагадваўся, колькі ў хрэстаматыйна вядомай паэме найцікавейшых вобразаў, нюансаў. Працуецца лёгка і з асалодай. Як рэжысёр-пастаноўшчык, Галіна Аляксееўна тонка адчувае мой настрой, унутраны стан, і спрэчак і непаразуменняў амаль што не ўзнікае. Кожнага свайго героя я люблю, узбагачаюся духоўна, таму што кожны персанаж у Коласа — цэлы свет. Мяркуйце самі:

Затое ж дзядзька хват і дока,
Набіў на косах сваё вока,
І калі выбера ён коску —
Не пара іншаму падоску:
І ярка, лёгка, спрытна, гонка;
Другі лягчэй знаходзіць жонку—
Свой вечны лёс, сваю красу,
Чым дзядзька добрую касу.

Адчуваю прыемнае хваляванне і перад сустрэчай з гледачом. Прэм'ера ёсць прэм'ера. Хто прыйдзе: "правільны" глядач? Выпадковы? Які свядома прыйшоў на Коласаву паэзію? Поспех шмат у чым залежыць і ад гледача. А, урэшце, ад гледача залежыць і тое, якімі фарбамі будзе "абрастаць" спектакль.

Думаецца, што "Новая зямля" ёсць той матэрыял, які дае станоўчую энергетыку, неабходную і для акцёра, і для гледача.

Гутарыла і запісала
Рыта МАСЦІЦКАЯ

У Нацыянальным ставяць сваё

Мінулы тэатральны сезон для Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа стаў знакавым і запамінальным. Прыгожа і гучна адзін са старэйшых тэатральных калектываў краіны адзначыў сваё 80-годдзе. Адшумеў юбілей, але коласаўцы не збіраюцца збаўляць абароты, 82-гі тэатральны сезон таксама багаты на падзеі і юбілеі.

Пацвярджаючы званне тэатра Нацыянальнага, вялікую ўвагу калектыў надае беларускай літаратуры. Прычым дыяпазон творчых пошукаў вельмі шырокі і разнастайны. Тут мае месца і класічная, і сучасная драматургія.

Адразу пасля адкрыцця сезона візітоўкай тэатра — легендарным "Несцеркам" В.Вольскага гледачам прапанавалі "смяхотную штуку" — "Залёты" В. Дуніна-Марцінкевіча. У 1992 годзе адбылася гэтая пастаноўка на коласаўскай сцэне. І вось — узнаўленне праз 15 год.

"Галоўнай падставай для аднаўлення стаў вялікі юбілей класіка, аднаго з пачынальнікаў прафесійнага тэатра на Беларусі, — 200-годдзе з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча. У 1992 годзе, калі ставілі першы варыянт "Залётаў", ішла хваля адраджэння. Людзі прыходзілі ў тэатр, каб пачуць беларускае слова, пагаварыць па-беларуску. Мне вельмі гэта падабалася. (Я прыехаў у Віцебск з Ніжняга Ноўгарада, знаёміўся з горадам і гараджанамі, нашымі гледачамі). Спектакль глядач любіў, яго глядзелі па некалькі разоў, але ў нейкі момант ён перастаў быць запатрабаваным. Час сказаў: давайце адсунем ненадоўга. Да таго ж акцёры "павырасталі". Рыгор Шацько, які выконваў ролю дасціпнага маладога парабка Петрука, стаў дырэктарам тэатра, у Святланы Жукоўскай, якая выконвала ролю Адэлі, маладой дзяўчыны на выданні, сын ужо хутка жэніцца... А маладой змены ў тэатры тады не было. Прайшоў час, у тэатры з'явілася моладзь. І аказалася, што сёння тэма, якая гучыць у спектаклі, — надзвычай актуальная. Смяхотная штука — гэта не проста камедыя, тут ёсць крыху горычы. Бо грошы чамусьці адыгрываюць для чалавека вельмі важную ролю. Так было амаль 200 год таму, калі Дунін-Марцінкевіч пісаў сваю п'есу, на жаль, такое назіраецца і сёння. Спажывецтва для многіх — закон жыцця. Бо калі не наталяецца душа, на першы план выходзіць матэрыяльнае. Гэта вельмі небяспечна. Вось пра гэта наша "смяхотная штука", — такімі думкамі падзяліўся пра сваю пастаноўку рэжысёр Юрый Лізянгевіч.

Паралельна Юрый Ігаравіч працуе над пастаноўкай твора сучаснага беларускага аўтара — С. Кавалёва. П'еса "Дзверы" таксама закранае праблемы маральнасці чалавека, яго здольнасці своечасова адмовіцца ад лёгкай, але нярэдка згубнай спакусы.

"Мы хацелі даць спектаклю іншую назву: "Асцярожна, д'ябал!". Ён, нячысцік, можа гаварыць усё вельмі правільна, але нельга забывацца на тое, хто гэта гаворыць. Д'ябал — лоўчы чалавечых душ. Злавіць і пагубіць — вось яго мэта. Падпішыся пад яго пісьмом — і ты ў пастцы. І гэтыя дзверы, праз якія ты выходзіў да Бога, раптам зачыняцца, зачыняцца назаўсёды. Чалавек, які апынуўся ў пастцы безвыходнасці, не можа ўжо думаць, існаваць, жыць правільна, і ён пачынае задыхацца і гіне. Магчыма не фізічна, але духоўна — дакладна", — тлумачыць Ю. Лізянгевіч.

Да рэпетыцый на коласаўскай сцэне прыступае запрошаны рэжысёр — М.Лашыцкі. Малады рэжысёр — і класіка беларускай літаратуры. Беларуская версія Фаўста — "Загубленая душа" Я. Баршчэўскага.

"Твор уключаны ў школьную праграму, таму старшакласнікі — асноўная катэгорыя, на якую разлічана пастаноўка "Загубленай душы". Мы павінны ўлічваць патрэбы гледача, працаваць на розныя катэгорыі, але перш за ўсё на моладзь, бо гэта будучае пакаленне, якое трэба выхоўваць", — зазначае мастацкі кіраўнік тэатра Віталь Баркоўскі. Сам Віталь Міхайлавіч у новым сезоне плануе распачаць працу над пастаноўкай п'есы А. Паповай "Дадому".

На пачатку лістапада ў коласаўскім тэатры — урачысты сход, прымеркаваны да 125-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. Юбілею прысвечаны паказ спектакля "Зямля" паводле творчасці песняра. Пастаноўку ажыццявіў В. Баркоўскі. У галоўнай ролі — Рыгор Шацько.

Такі букет нацыянальных прэм'ер чакае прыхільнікаў коласаўскага тэатра ў новым сезоне. Акрамя таго, звяртаюцца коласаўцы і да сусветнай драматургіі. Адным словам, сезон абяцае быць багатым і насычаным.

Ганна ДАШКЕВІЧ

Ушанаванне народнасцю

У 1921 годзе бескватэрны Якуб Колас пераедзе ў Мінск, дзе нарэшце для яго будуць пастаянныя жыллё і праца. З 1918-га да лютага 1921-га, пасля вяртання з Румынскага фронту, шляхі-дарогі прывядуць яго ў Курскую губерню, дзе перад гэтым запынілася яго сям'я. Далекавата (11 вёрст) ад Абаяні яму знойдзецца месца ў школе: («Марыя Дзмітрыеўна хварэла. Я ўстаю раненька. Юрка і Даніла спяць. Іду ў школу, а ўвечары тупаю назад. І гэтак кожны дзень. А жылі мы на адной бульбе. На цэлы тыдзень мелі мы на чатыры душы 21 бульбіну. Я падаў ад знясілення...Падхапіў я «іспанку»... Памераў тэмпературу — больш за сорак... Ляснуў я градуснік аб стол і пайшоў...»). Тым не менш і пры такіх умовах працягвае працаваць над паэмай «Сымон-музыка» (да 4 жніўня 1918 года ўжо напісанае пабачыць свет у Мінску, у выданні «Вольнай Беларусі», а ў кастрычніку-лістападзе будзе закончаная першая агульная рэдакцыя гэтага твора. У снежні на валасным настаўніцкім сходзе яго абіраюць членам валаснога савета па народнай асвеце. І яшчэ, як на той час, так і на цяперашні, даволі нечаканае: «У Ліпаўцы мяне, беспартыйнага, але граматнага і «спачуваючага» — быў такі тэрмін! — выбралі сакратаром партыйнай ячэйкі».

На пачатку 1919 года Колас у Курску праходзіць медыцынскую камісію, дзе вызначаецца, наколькі ён падыходзіць да вайсковай службы. Служыць у войска не выклікаюць, але да 26 лістапада ён мусіць пакінуць новае месца працы ў сувязі з наступленнем дзянікінскіх войск. Пасля пераводзіцца ў іншую школу, дзе ізноў новыя клопаты («Трэба было пачынаць усё спачатку: школьная мэбля расцягнута ці спалена, не было кніг і вучэбных дапаможнікаў»).

У лютым 1920 года Колас атрымлівае павышэнне па службе: прызначаецца школьным інспектарам. Зразумела, аклад пабольшаў, але і працы не паменшала: трэба было кантраляваць раскіданыя ў розных мясцінах 25 школ. Ды і пры першым зручным выпадку выкройвае час і піша ўжо 19-ы раздзел паэмы «Новая зямля». У гэтым годзе ў Вільні пабачыла свет «Гісторыя беларускай літаратуры» М. Гарэцкага, дзе «ўпершыню ў гісторыі навукова-крытычнай думкі мастацкая дзейнасць Я. Коласа разглядалася ва ўзаемасувязі з агульна-літаратурным працэсам як з'ява гістарычнага развіцця грамадскай, нацыянальнай, эстэтычнай свядомасці народа» (М.Мушынскі), і пісьменнік быў названы класікам беларускай літаратуры.

З лютага 1921 года Наркамасветы БССР пачынае захады «ко всем советским учреждениям и должностным лицам» у Абаяні з просьбай паспрыяць Якубу Коласу і яго сям'і вярнуцца на радзіму. Паколькі тамтэйшыя ўлады мала ведалі пра Коласа як буйнога беларускага паэта, не жадалі адпускаць са сваіх мясцін выдатнага педагога, то беларускім уладам прыйшлося звяртацца і да народнага камісара асветы СССР А. Луначарскага. Толькі тады справа зрушылася, і Колас займеў магчымасць вярнуцца ў свой «родны кут».

«Помніцца і пераезд з Куршчыны ў Менск, — пісаў у кнізе «Любіць і помніць» старэйшы Коласаў сын Даніла Міцкевіч. — Нам далі невялікі двухвосевы таварны вагон, вельмі забруджаны. Дзядзька Саша, мама і бабка Марыя Цімафееўна два дні чысцілі яго, мылі, пасля чаго мы пагрузілі свой невялікі скарб, а таксама дзве казы... На Куршчыне жылося цяжка, мы часта галадалі. Таму козы ратавалі нас, асабліва дзяцей... Ехалі доўга і марудна...У Менск мы прыехалі 15 мая 1921 года. Чамусьці сам момант прыезду мне не запомніўся, хаця сучаснікі адзначалі вельмі цёплы і ўрачысты прыём Коласа сустракаўшымі... Спачатку мы жылі кватарантамі ў дварэ пана Русецкага... У 1926 годзе бацькі вырашылі будаваць сабе хату... Для пабудовы дома знайшлі ўчастак, які ўяўляў сабой сад, пасаджаны хутчэй за ўсё ў канцы мінулага стагоддзя. Участак знаходзіўся ў пачатку 2-га Шпітальнага завулка (пазней і цяпер — Вайсковы завулак) пры ўваходзе ў гарадскі парк, які тады насіў назву — імя Прафінтэрна. Пасля вайны месца сядзібы ўвайшло ў тэрыторыю парку імя Горкага».



Ужо на пачатку 1923 года паэма «Новая зямля» была фактычна закончаная (асобнае яе выданне пабачыць свет у чэрвені). Якуба Коласа чакаў і яшчэ адзін вялікі поспех — заканчэнне аповесці «У палескай глушы» (выйдзе ў Вільні ў маі). Таму, калі ў ліпені ён будзе чытаць лекцыі ў Слуцку на педагагічных курсах, настаўнікі будуць сустракаць яго, аўтара гэтых і іншых папулярных твораў, вельмі пашанотна.

Колас асвойваецца ў сталіцы новай рэспублікі-дзяржавы: сустракаецца са знаёмымі, выступае перад працоўнымі, пачынае працаваць у Акадэмічным цэнтры Наркамасветы БССР членам навукова-тэрміналагічнай камісіі, уступае ў члены прафсаюза работнікаў асветы БССР, наведвае Слуцк, дзе знаёміцца з настаўніцкімі курсамі; пазней яго запросяць туды і выкладаць. Піша новыя вершы і апавяданні, сем раздзелаў «Новай зямлі», аўтабіяграфію па просьбе Я. Карскага, працягвае працу над паэмай «Сымон-музыка».

Пачатак 1922 года азнаменаваўся значнай падзеяй не толькі ў Коласавым жыцці: 30 студзеня на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі быў заснаваны Інстытут беларускай культуры — першая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова БССР. Разам з Я. Карскім, Янкам Купалам і іншымі ў склад сапраўдных яго членаў увайшоў і Колас. Затым ён працуе ў літаратурна-даследчай камісіі і просіць Я. Карскага скласці для камісіі навуковыя рэкамендацыі па зборы вуснай народнай творчасці. Як успаміналі тагачасныя сведкі, Колас у камісіі працаваў шмат і, «здавалася, не стамляўся». У красавіку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце было праведзена ўрачыстае пасяджэнне, прымеркаванае абмеркаванню творчасці Якуба Коласа. Сярод дакладаў, якія прачыталі вядомыя літаратуразнаўцы і мовазнаўцы, тады яшчэ не асцерагаліся вылучаць такое: «Якуб Колас як нацыянальны беларускі паэт». У гэтым годзе ён выдаў зборнік вершаў «Водгулле», напісаў каля дзесятка новых раздзелаў «Новай зямлі».

Ужо на пачатку 1923 года паэма «Новая зямля» была фактычна закончаная (асобнае яе выданне пабачыць свет у чэрвені). Якуба Коласа чакаў і яшчэ адзін вялікі поспех — заканчэнне аповесці «У палескай глушы» (выйдзе ў Вільні ў маі). Таму, калі ў ліпені ён будзе чытаць лекцыі ў Слуцку на педагагічных курсах, настаўнікі будуць сустракаць яго, аўтара гэтых і іншых папулярных твораў, вельмі пашанотна. Пазней, у жніўні—кастрычніку, выйдзе ў «Полымі» артыкул М. Байкова «Паэма «Новая зямля» як манументальны твор беларускай паэзіі», што стаўся першым прафесійным аналізам Коласавага твора. Ужо тады было засведчана, што гэта «нацыянальная беларуская паэма», «класічны твор беларускага прыгожага пісьменства», «яна сведчыць аб поўным развіцці паэтычнага таленту аўтара, у каторым, як у фокусе, адбіваецца росквіт здольнасцей беларускай нацыі», «цяпер ад манументальнага эпічнага твора шлях развіцця беларускай паэзіі ідзе да закончанага беларускага рамана». На жаль, пры гэтым аўтар артыкула падаў і нагоду для іншага разгляду «Новай зямлі», агаварыўшыся, што твор не рэвалюцыйны, а дробнабуржуазны. У студзені наступнага года ў тым жа выданні І.Замоцін у артыкуле «Пуціны беларускай літаратуры» паспрабуе адхіліць ад паэмы закіды вульгарна-дагматычнай крытыкі, падкрэсліўшы, што мары герояў «аб шматку зямлі — не проста сялянская цяга да сваёй уласнасці: не, яна запала ў сэрца беларуса, «як промень волі і свабоды», бо з ёю звязан нястрымны парыў да творчае працы і наогул да новага быту».

Восенню Колас бярэцца пераасэнсоўваць, перарабляць паэму «Сымон-музыка», а са снежня пачынае працу выкладчыкам беларускай мовы ва універсітэце: у снежні загадам Наркамасветы БССР зацвярджаецца дацэнтам педфака БДУ, што падштурхнула яго да далейшай навуковай дзейнасці. На пачатку нова-га, 1924, года, апрача творча-навуковых, умацоўвае і свае грамадзянскія пазіцыі: прысутнічае на V Усебеларускім з'ездзе Саветаў з правам рашаючага голасу.

У 1920-я зусім не было выключэннем, калі даволі маладыя людзі займалі не толькі высокія дзяржаўныя, навуковыя ці іншыя пасады, але і мелі адразу іх некалькі. Вярнуўшыся ў Беларусь у 1921 годзе, Якуб Колас працаваў у самых розных установах — як тады казалі, на «культурна-асветным фронце». У 1924-м, засяродзіўшыся на працы выкладчыка беларускай мовы Белдзяржуніверсітэта, ён займеў выдатную магчымасць ажыццявіць запаветную мару — перапрацаваць напісаныя, стварыць новыя раздзелы паэмы «Сымон-музыка», якой надаваў зусім не меншае значэнне, чым «Новай зямлі». Тым больш, што выпала магчымасць: у чэрвені па рашэнні тагачаснай камісіі па паляпшэнні быту вучоных едзе на папраўку здароўя ў Кіславодск, дзе прабудзе з месяц.

Там, мабыць, у даволі спрыяльных умовах захоплена шчыруе над другой рэдакцыяй «Сымона-музыкі», а ў перапынках чытае творы сусветнай літаратуры. Вялікае ўражанне на яго робіць карэла-фінскі народны эпас «Калевала» — на першы погляд, твор зусім не славянскага характару, але тым не менш сваімі зместам, сімваламі блізкі да задумы ягонай паэмы. Асабліва ў чалавечым асэнсаванні і мастацкім вырашэнні ролі і лёсу творцы (пісьменніка, мастака, музыкі) у грамадстве.

«Калевала» дала мне добры штуршок для работы. Вейнямейнен, разважыў я, памірае ад старасці і тады пакідае свае гуслі народу. Чаму ж мой Сымон павінен канаць, толькі ступіўшы на дарогу? Хай прынясе людзям радасць і пасля гэтага перадасць у другія рукі скрыпку. Так пакрысе прыйшоў я да яснасці. Стала зразумела, што сіла музыкі стане куды большая, калі яна верне Ганю да жыцця, парушыць яе часовае здранцвенне. І няхай хлопец і дзяўчына ідуць далей разам, музыка і яго будучыня. На што канчаць нечым пэўным іх шляхі? Народ жа вечны, вечнае яго мастацтва, вечныя і творцы песні і казкі» — з запісаў М. Лужаніна "Колас...". Хто ўважліва чытаў «Калевалу» і «Сымона-музыку», той зразумее, што Колас меў на ўвазе і што паспрыяла яму маштабна выявіць сваю творчую задуму.

Пакуль Колас у Кіславодску працуе над «Сымонам-музыкам», на радзіме працягваецца дыскусія наконт яго ўжо закончанай паэмы «Новая зямля». Адзін з палемістаў (Л.Жыцень, ён жа былы нашанівец, драматург, новабальшавік Л. Родзевіч) вынес вердыкт: маўляў, гэты твор мае натуралістычны характар, немастацкі, ідэалізуе хутарскую гаспадарку, чалавечую адасобленасць. «Твор не нашых і не будучых часоў», — не проста палемічна, а звышідэалагічна заключаў ён.

8 ліпеня ў лісце да жонкі Марыі Дзмітрыеўны, як і кожны задаволены зробленай працай творца, Колас шчыра радуецца: («Учора я... закончыў «Сымона-музыку», і, здаецца, закончыў някепска»). Пасля гэтага ён страчвае інтарэс да курортных вабнотаў, імкнецца дадому, да любімай навуковай працы, да сям'і, але... Праз тыдзень, калі ўжо вяртаецца ў Беларусь, на станцыі Ціхарэцкая праз адчыненае акно вагона з перона крукам сцягваюць ягоную валізу, дзе знаходзіўся і рукапіс другой рэдакцыі паэмы «Сымон-музыка»!.. На ягоную скаргу з Растова-на-Доне яго суцешылі, што «частка рэчаў і ў тым ліку і рукапіс знойдзены» (факт, дакументальна засведчаны), ды... нічога яму не было вернута. Мала, што Колас засмуціўся. У лісце даўняму сябру, у якога ў Растове-на-Доне ён гасляваў перад гэтым, ён прасіў таксама памагчы ў пошуках згубленага твора: «Паэма перароблена, а ў мяне ніякіх слядоў ад яе не засталося... Рукапіс гэты выбіў мяне з сядла, дык парупся, браток».

Другі варыянт «Сымона-музыкі» не адшукаўся. І па сёння невядома: ён стаўся здабычай вакзальнага зладзюгана альбо прадумана быў выкрадзены і знішчаны? У жніўні Колас пераадольвае засмучэнні і гаркоту, пачынае трэці раз увасабляць задуму «Сымона-музыкі» — пераглядае, перапрацоўвае канцэпцыю першай рэдакцыі (1911—1918), дзве трэці тэксту піша наноў. Забягаючы наперад, варта зазначыць: гэты варыянт твора захаваўся, але з яго было шмат *скрадзена* з-за цэнзурных меркаванняў. І на сённяшні дзень у «Сымону-музыку», па сведчанні Коласава малодшага сына, які захоўвае арыгінал апошняй рэдакцыі, каля 1500(!!!) розных вынятка ў, антыаўтарскіх папраўак і змен! Так што і з трэцім варыянтам гэтага шматпакутнага, але і глыбіннага Коласавага твора сустрэча яшчэ наперадзе...

Сабраўшы душэўную моц, ён у канцы ліпеня 1924 года піша артыкул-успамін «Васемнаццатая гадавіна», прысвечаны нелегальнаму настаўніцкаму з'езду: 9 (22) ліпеня 1906 года свядомыя беларускія настаўнікі сабраліся на яго радзіме, каб паразважаць



Якуб Колас і Аляксандр Фадзееў

Жыццё і творчая дзейнасць вядомага рускага пісьменніка Аляксандра Фадзеева мелі непасрэдныя адносіны да Беларусі і яе народа. Яшчэ ў 1921 годзе ён, адзін з удзельнікаў партызанскай барацьбы на Далёкім Усходзе, вырашыў напісаць кнігу аб грамадзянскай вайне, у якой прымалі ўдзел і беларусы. Працуючы партызанскім камісарам, Аляксандр Аляксандравіч быў сведкам многіх падзей таго нялёгкага часу. Пісьменнік прыгадвае пра іх у сваім рамане "Разгром". Сярод герояў гэтага вядомага твора і наш беларус Аляксандр Антонавіч Сянкевіч, адзін з арганізатараў настаўніцкага з'езду на радзіме Якуба Коласа ў вёсцы Мікалаеўшчына.

пра лёс беларускай мовы і школы, нацыі, а іх вывіжавалі і зняволілі ахоўнікі тагачаснага рэжыму. Да канца кастрычніка Колас напіша п'есу «Забастоўшчыкі», дзе па-новаму асэнсуе адносіны перадавой інтэлігенцыі і таталітарнай улады. Адных, хто падзяляў Коласавы погляды, гэта радавала, настройвала на сумленную натхнёную працу на карысць беларускага народа, а іншых тое змушала насцярожвацца, назапашваць факты, каб пры першым жа зручным выпадку абрынуць іх на «залішне» самастойных і смелых, якія натхняюць на служэнне найперш роднаму люду, а то і на забастоўкі...

У гэтым жа, 1924 годзе Колас, пачаўшы ў жніўні працу над трэцяй рэдакцыяй «Сымона-музыкі», паралельна бярэцца пісаць першую частку трылогіі «На ростанях». На першы погляд, там няма «вялікай палітыкі», ёсць толькі вялікае грамадзянскае ўсведамленне і мастацкае выяўленне таго, як настаўнік «з народа», пакліканы на педагагічную службу ці сваім душэўным памкненнем, ці пэўным разлікам усё ж здолее ўзвысіцца да асветніка і грамадскага дзеяча.

Да канца 1924 года Якуб Колас створыць тры часткі «Сымона-музыкі», здасць у друк два зборнікі апавяданняў, падрыхтуе да друку перавыданне «Казак жыцця», напіша палову аповесці «У глыбі Палесся».

1925 год і пабольшыць ягоную чалавечую, творчую радасць, і адновіць былыя пачуцці трывогі, узрушэння, а то і страху. Па-першае, да чэрвеня ў напружаным рытме ён закончыць трэцюю рэдакцыю «Сымона-музыкі», а ў ліпені— жніўні паэма пабачыць свет у часопісе «Полымя рэвалюцыі»: таксама Колас надрукуе новыя апавяданні і артыкулы, засядзе за напісанне аповесці «На прасторах жыцця» (прысвеціць яе новай, савецкай моладзі і яе слаўным справам, каб не кідалі папрокі, што ён у творчасці не сучасны, завельмі «стары» са сваімі дарэвалюцыйнымі тэмамі). Па-другое, для пільных «мастацтвазнаўцаў» знойдзецца магчымасць завесці крымінальную справу і на Коласа за яго «антысаветызм».

Ураджэнец Случчыны, настаўнік па прафесіі Юры Лістапад (1897—1938) удзельнічаў у вядомым Слуцкім збройным чыне ў 1920-м. У 1925 годзе яму прыпісалі падрыхтоўку да новага антысавецкага мяцяжу, назваўшы кіраўніком арганізацыі, куды нібыта ўваходзілі выкладчыкі і навучэнцы нядаўніх Слуцкіх агульнаадукацыйных настаўніцкіх курсаў. У кастрычніку 1925-га Юрыя (Георгія) зняволілі. А паколькі на тых курсах не проста прысутнічаў, а меў вялікі поспех сваім беларускім духам, словам і Якуб Колас, можна было ягоную творчую і навуковую працу, набыты аўтарытэт пераніцаваць: нацыяналіст, антысаветчык, духоўны натхняльнік узброенай барацьбы супраць савецкай улады! Тым больш, што заступаецца за лістападаўцаў, прыкрывае іхнюю варожую дзейнасць паняццем любові да Радзімы, клопатам пра яе духоўнае развіццё!

Ёсць звесткі, што тады, у 1925-м, Колас зведаў, што такое савецкі вобыск. Ды крымінальную справу супраць Коласа спынілі. Лепш сказаць, адклалі на час (да 1930-га), хоць, канечне ж, працягвалі папаўняць яе чэрава новым «мастацтвазнаўчым харчам».

Тым не менш, факты пра абыходжанне з Коласам прасачыліся за межы БССР і СССР — найперш, на старонкі заходнебеларускага друку, дзе былі пададзеныя як захады ўладаў БССР па шальмаванні беларускай інтэлігенцыі. Сёння цяжка сказаць, ці Коласу паралі даць водпаведзь, ці, добра ведаючы, што такое зняволенне і турма, ён даў яе сам: адразу ў двух выданнях, у «Звяздзе» і «Савецкай Беларусі» быў змешчаны Коласаў «Ліст у рэдакцыю», дзе аўтар абураўся, што контррэвалюцыйныя элементы на Захадзе выкарыстоўваюць ягонае імя «дзеля сваіх злачынных антысавецкіх мэт». Яшчэ ён дадаваў: «З часу заснавання Савецкае ўлады я быў шчырым яе прыхільнікам, стараючыся па сіле магчымасці дапамагчы сваёю працаю яе замацаванню... Толькі Савецкая ўлада, як улада рабочых і сялян, ёсць адзіная ўлада, якая абараняе эканамічныя і палітычныя інтарэсы ўсіх працоўных. Таксама, па маёй думцы, палітыка Савецкае ўлады ў галіне нацыянальнай з'яўляецца адзінай, якая здолела за кароткі час прывесці народы ўсіх нацый да братняга сужыцця і якая ў далейшым, я веру, адродзіць эканамічна і культурна дагэтуль адсталыя краіны».

Можа, і гэтая публікацыя спрыяла таму, што многія беларускія дзеячы з Заходняй Беларусі, дзе ішла бязлітасная паланізацыя, пачалі пераязджаць у БССР. Тым больш, што ў 1926 годзе ў дваццатую гадавіну першай Коласавай творчай публікацыі, яму прысвояць званне народнага паэта.

Генрых ДАЛІДОВІЧ

Васемнаццацігадовы юнак разам са сваім сябрам і аднавяскоўцам Канстанцінам Міцкевічам пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі працуюць у сельскіх школах. Яны становяцца сведкамі цяжкага жабрачага становішча сялян. Гэтыя абставіны наводзілі на маладых настаўнікаў сум і расчараванне. І толькі ідэі першай рускай рэвалюцыі натхнялі, усялялі надзею на лепшае жыццё. Якуб Колас у трылогіі "На ростанях" так піша аб настроі свайго сябра Алеся Садовіча: "Відаць, ён паспеў парадкам расчаравацца і ў тых абставінах, якія яго акружалі... — Думаю перавдзіцца ў другое месца і там ужо ўзяць сябе ў рукі, — гаворыць ён, — а то гэтыя зборышчы, гарэлка, карты і ўся местачковая мярзотнасць зацягнуць зусім. І самае галоўнае — ніякай стравы для розуму".

Важнай падзеяй у жыцці юных энтузіястаў быў з'езд настаўнікаў Мінскай губерні, які праходзіў у 1906 годзе ў вёсцы Мікалаеўшчына "з мэтай арганізацыі рэвалюцыйнага арганізацыйнага руху ў барацьбе супраць праклятага царызму", — гаворыць Алесь Садовіч у рамане Якуба Коласа. Старшынёй з'езда прысутныя выбралі мясцовага настаўніка Аляксандра Сянкевіча, яго сакратаром — Якуба Коласа. З'езд раскрываецца мясцовай паліцыяй. Якуб Колас потым быў асуджаны на тры гады турэмнага зняволення, а Аляксандр Антонавіч пры дапамозе замежнага пашпарта эмігрыраваў у Злучаныя Штаты Амерыкі. Там ён становіцца членам амерыканскай сацыялістычнай партыі, працуе над артыкуламі, праводзіць палітычную работу ў калоніях эмігрантаў з Беларусі, Украіны, Польшчы. Адначасова вучыцца і заканчвае медыцынскі каледж універсітэта ў Балціморы, займаецца прыватнай медыцынскай практыкай і актыўна ўдзельнічае ў рабочым руху. У гэтым яму дапамагае жонка Ганна Трызна, таксама беларуская эмігрантка. Пра гэты перыяд жыцця ён піша ў сваёй аповесці "Вандраванне Васіля", якая выйшла з друку ў Мінску ў 1932 годзе.

Даведаўшыся пра перамогу ў Расіі сацыялістычнай рэвалюцыі, Аляксандр Сянкевіч вяртаецца на радзіму. На Далёкім Усходзе ён працаваў загадчыкам медучастка ва Усурыйскім павеце, потым — кіраўніком аховы здароўя вобласці. У лютым 1919 года падпольны абкам партыі на Далёкім Усходзе накіроўвае Сянкевіча ў штаб партызанскіх атрадаў для арганізацыі санітарнай службы і дапамогі параненым і хворым партызанам. Там ён і сустрэўся з Аляксандрам Фадзеевым. Спадабаўся яму наш сціплы і працалюбівы беларус, які, не шкадуючы сваіх сіл і энергіі, аказваў дапамогу параненым партызанам. Тады ж ён паставіў на ногі камандуючага партызанскімі атрадамі Прымор'я Сяргея Лазо, які хварэў вострым запаленнем нырак. Ён потым з вялікай павагай адносіўся да партызанскага доктара.

Сувязі двух пісьменнікаў працягваліся. Аляксандр Фадзееў запрашаў Якуба Коласа на юбілеі вядомых рускіх літаратараў, пасяджэнні Камітэта па Дзяржаўных прэміях. "Адкрываецца чарговая сесія Камітэта па прэміях, — паведамляў ён Канстанціну Міхайлавічу. — Ваша прысутнасць неабходна. Фадзееў".

І калі Аляксандр Фадзееў працаваў над раманам "Разгром", ён не абышоў бокам Аляксандра Сянкевіча, зрабіў яго прататыпам свайго твора — доктарам Сташынскім. "Варта прачытаць "Разгром" Сашы Фадзеева, — піша ва ўспамінах пра Аляксандра Сянкевіча камандзір 1-га Далёкаўсходняга савецкага партызанскага палка Мікалай Кірылавіч Ілюхоў, — менавіта тыя месцы яго кнігі, дзе ён піша аб партызанскім шпіталі і яго жыхарах, стане ясна, як любіў нашага цудоўнага лекара Аляксандр Фадзееў".

Вось некалькі слоў з рамана пра Сташынскага: "Высокі. Нягнуткі мужчына з доўгім і жоўтым тварам, з глыбока запалымі бліскучымі вачыма". Пісьменнік даў некалькі скупых, але важкіх біяграфічных звестак пра доктара, у двух-трох эпізодах здолеў раскрыць характар гэтага замкнёнага і самаахвярнага чалавека.

Такі цікавы факт знаёмства рускага пісьменніка з беларусамі і яго ўвасабленне ў сваёй творчасці. З таго часу Аляксандр Фадзееў яшчэ больш стаў цікавіцца беларусамі. Асабліва гэта праявілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 8 жніўня 1942 года, знаходзячыся ў Ташкенце, Якуб Колас атрымлівае ад Аляксандра Фадзеева ліст з просьбай напісаць і прыслаць артыкул для інтэрнацыянальнага антыфашысцкага часопіса пра ўклад беларускіх літаратараў у барацьбу супраць фашысцкіх захопнікаў. А праз год яны разам выступаюць на трэцім Усеславянскім мітынгу ў Маскве. А вось што Якуб Колас запісаў у 1943 годзе ў сваім дзённіку: "Атрымаў цэлы стос тэлеграм ад Фадзеева — дзякуе за кнігу "Памяці Янкі Купалы".

Цёплыя сяброўскія сувязі двух пісьменнікаў працягваліся і пасля вайны. У 1947 годзе Савет Міністраў Саюза ССР зацвердзіў Камітэт па дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры і мастацтва. Яго старшынёй быў абраны Аляксандр Фадзееў. У той час Аляксандр Аляксандравіч быў ужо генеральным сакратаром Саюза пісьменнікаў СССР. У пачатку 1948 года ў Маскве праходзіла чацвёртая сесія Вярхоўнага Савета. У яе рабоце прыняў удзел і народны паэт Беларусі Якуб Колас. Работа была напружанай і доўгай, яна змянілася потым прыемнай сустрэчай. Вось што пра гэта піша Якуб Колас рускаму паэту-перакладчыку Сяргею Гарадзецкаму: "Ехаў з Масквы з Фадзеевым у адным купэ. Ён цудоўны чалавек і выдатны субяседнік... Фадзееў спыніўся ў мяне. Дзве ночы начаваў і Пракоф'еў. У дзень прыезду ў мяне збіралася кампанія пісьменнікаў".

Старэйшы сын народнага паэта Данііла Міцкевіч расказвае:

— У той вечар у нашым доме было весела, пісьменнікаў было чалавек 12—15. Гаварылі пра жыццё, літаратуру і мастацтва. Аляксандр Фадзееў выдзяляўся з усіх сваім веданнем на памяць твораў многіх вядомых і малавядомых паэтаў. Чытаў па-майстэрску выразна і доўга. Гэта цікавая сустрэча назаўсёды засталася ў маёй памяці.

Аляксандр Фадзееў прыязджаў тады ў Мінск з Сакаловым-Мікітавым на рэспубліканскі сход пісьменнікаў, прысвечаны абмеркаванню твораў беларускай літаратуры за 1947 год. Пра тыя незабыўныя дні нагадвае і рэдкі фотаздымак, які захоўваецца ў музеі паэта; там засведчаны: Якуб Колас. Аляксандр Фадзееў, Пятрусь Броўка, Міхась Лынькоў, Аркадзь Куляшоў.

Сувязі двух пісьменнікаў працягваліся. Аляксандр Фадзееў запрашаў Якуба Коласа на юбілеі вядомых рускіх літаратараў, пасяджэнні Камітэта па Дзяржаўных прэміях. "Адкрываецца чарговая сесія Камітэта па прэміях, — паведамляў ён Канстанціну Міхайлавічу. — Ваша прысутнасць неабходна. Фадзееў".

Цёплай і радаснай была сустрэча ў 1949 годзе ў час дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве. Урачысты сход, за сталом у прэзідыуме, сярод шматлікіх пісьменнікаў, артыстаў, партыйных работнікаў — Якуб Колас і Аляксандр Фадзееў. Яны сустрэліся напярэдадні, абмяняліся думкамі, гаварылі пра надзённыя справы. На гэтым вечары народны паэт выступіў з чытаннем сваіх вершаў. Тады ж яны яшчэ раз сфатаграфаваліся.

І пасля гэтай сустрэчы Аляксандр Аляксандравіч не забываў свайго беларускага сябра, віншаваў яго з Новым годам, днём нараджэння, іншымі падзеямі ў жыцці паэта. Многія з тэлеграм захоўваюцца ў фондах Літаратурнага музея Коласа.

Мікола ЖЫГОЦКІ

Шмат дзе на Беларусі і за яе межамі давялося жыць Канстанціну Міхайлавічу Міцкевічу.

Але нідзе ён не жыў так доўга, як у беларускай сталіцы — Мінск быў яго домам амаль 36 гадоў.

Першае знаёмства паэта з горадам адбылося ў 1906 годзе. Тады ён наведаў сталіцу па службовых справах будучы настаўнікам Верхменскага народнага вучылішча. Бываючы ў горадзе, малады педагог абавязкова наведваў кнігарню, што месцілася на рагу былых Захар'еўскай і Серпухаўскай вуліц.



Вучнямі Коласа ў тэхнікуме былі вядомыя нашы літаратары Пятро Глебка, Паўлюк Трус, Максім Лужанін, Сяргей Дарожны, Станіслаў Шушкевіч, Зінаіда Бандарына, Алесь Якімовіч, Валерый Маракоў — цэлая кагорта маладых, таленавітых, апантаных беларускай культураю людзей, якім наканавана было стаць надзённаю яваю і творцамі новай беларускай літаратуры.

Мінск як сімвал духу творчага...

Пра ветлівасць, гасціннасць і спагаду Коласа і яго сямейнікаў не з чужых вуснаў ведала сям'я Купалы — некалькі тыдняў Іван Дамінікавіч з Уладзіславай Францаўнай жылі ў Коласавай хаце. Так "распарадзілася" наравістая Свіслач у 1930 годзе, калі падчас веснавой паводкі рака затапіла сядзібы мінчукоў, у тым ліку і Купалаў дом.

Неўзабаве пачаліся візіты ў губернскі Мінск і з нагоды спраў палітычных. Гэта былі выклікі на допыт Мінскага акружнога суда па справе ўдзелу ў прафесійна-палітычнай агульна-дэмакратычнай арганізацыі "Усерасійскі саюз настаўнікаў". На працягу 1906—1908 гадоў цягнулася следства. Педагога Міцкевіча абвінавачвалі ў падрыхтоўцы і правядзенні ўстаноўчага з'езду настаўнікаў Мінскай губерні, распаўсюджванні нелегальнай палітычнай літаратуры.

Выязная сесія вышэйшай судовай установы краю Віленскай судовай палаты ў будынку Мінскага акружнога суда (месціўся ў доме № 14 на пляцы Волі) 15 верасня 1908 года разглядала справу аб настаўніцкім з'ездзе. Менавіта ў гэтым будынку Якубу Коласу быў абвешчаны прысуд — тры гады пазбаўлення волі. Прама з залы суда цяпер ужо вязень Канстанцін Міцкевіч трапіў у Мінскі астрог. Будзем лічыць, што з верасня 1908 года і пачынаецца пачатак адліку Коласавага жыхарства ў сталіцы. Праўда, на пачатку было яно бязрадасным — першым гарадскім "жытлом "стаў сумна вядомы Пішчалаўскі замак, пабудаваны ў 1825 годзе на адным з узвышшаў Раманаўскага прадмесця (тагачасная Серпухаўская вуліца) дойлідам Пішчалам (сёння гэта следчы ізалятар для крымінальных зняволеных па вуліцы Валадарскага). За час адсідкі Коласу давялося змяніць некалькі камер — спачатку быў прыпісаны да кутняй, каля першай вежы, потым да 5-й, некалькі разоў начаваў у карцэры з-за таго, што не знаходзіў агульнай мовы з турэмным персаналам. Нягледзячы на ўзмоцнены нагляд турэмшчыкаў за палітычнымі вязнямі, Колас працягваў літаратурную працу — у няволі былі напісаны многія вершы, пачата паэма "Новая зямля", з'явілася задума паэмы "Сымон-музыка".

Пасля выхаду з турмы ў верасні 1911 года Колас пакідае Мінск і вяртаецца сюды толькі 15 мая 1921 года.

У першыя ж пасля яго прыезду дні газета "Савецкая Беларусь" адгукнулася лаканічным прывітаннем: "У нядзелю прыехаў у Менск пасля доўгай адсутнасці беларускі паэт Якуб Колас. Вымушаны пакінуць сваю радзіму пад уціскам цяжкіх умоў, звязаных з ваенным ліхалеццем, абрушаным на Беларусь, Якуб Колас вярнуўся ўжо ў вольную Айчыну, аб якой пяяў у сваіх вершах і змагаўся доўгія часы".

Працягваць настаўніцкую кар'еру Канстанціну Міхайлавічу давялося на пасадзе старшага выкладчыка методыкі выкладання роднай мовы ў Беларускім педагагічным тэхнікуме (1922—1930 гады). На жаль, Мінск з таго часу моцна змяніўся: ні будынка, ні такой установы цяпер у сталіцы няма. Знаходзіўся Белпедтэхнікум на былой Савецкай вуліцы ў доме № 107 (гэта месца паміж Палацам культуры прафсаюзаў і жылым домам на рагу праспекта Незалежнасці і вуліцы Купалы — недалёка ад цырка). З фотаздымкаў тае пары відаць, што гэта быў прыгожы двухпавярховы цагляны дом з драўляным флігелем.

Вучнямі Коласа ў тэхнікуме былі вядомыя нашы літаратары Пятро Глебка, Паўлюк Трус, Максім Лужанін, Сяргей Дарожны, Станіслаў Шушкевіч, Зінаіда Бандарына, Алесь Якімовіч, Валерый Маракоў — цэлая кагорта маладых, таленавітых, апантаных беларускай культураю людзей, якім наканавана было стаць надзённаю яваю і творцамі новай беларускай літаратуры.

Тагачасны Саюз пісьменнікаў месціўся таксама на Савецкай і Канстанцін Міхайлавіч ледзь не штодня бываў там, кіруючыся ўласнымі клопатамі і справамі сваіх калег-пачаткоўцаў.

Многія мінчане помняць прысутнасць паэта і ў сценах Беларускага дзяржаўнага універсітэта — з лістапада 1923 па студзень 1926 года Колас быў дацэнтам кафедры беларускай мовы на педагагічным факультэце.

Не хутка збылася мара Канстанціна Міхайлавіча займець сваё жыллё — шэсць гадоў (1921—1927) давялося жыць на прыватнай кватэры ў заможнага мінскага гаспадара Вільгельма Русецкага. Побыт і жыхары гэтай сядзібы апісаны кватарантам у апавяданні "У двары пана Русецкага". Побыт, як вядома, быў сціплым — тры невялікія пакойчыкі і кухня. Сям'я, тым часам, папоўнілася — у 1926 годзе ў Канстанціна Міхайлавіча і Марыі Дзмітрыеўны нарадзіўся трэці сын Міхась (другі сын паэта нарадзіўся ў 1917 годзе ў Расіі). Аднак менавіта тут, на Старажоўцы, Колас скончыў свае найлепшыя паэмы "Новая зямля" і "Сымон-музыка", напісаў аповесці "У Палескай глушы","У глыбі Палесся", "На прасторах жыцця", п'есы, вершы, казкі для дзяцей, шматлікія публіцыстычныя артыкулы.

Поруч з выкладчыцкай і творчай працай паэт паралельна займаецца і навуковай дзейнасцю. У 20-я гады ў Мінску адчыніў дзверы Інстытут беларускай культуры на базе свайго папярэдніка — Навукова-тэрміналагічнай камісіі, якая працавала пры Наркамаце асветы БССР. Колас, як і яго паплечнікі (адраджэнцы 20—30-х гг.), быў дзейсным супрацоўнікам гэтых устаноў — ён працаваў у літаратурна-даследчай камісіі.

У канцы 1928 года Урад рэспублікі прыняў пастанову аб рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры ў Беларускую акадэмію навук. Якуб Колас быў зацверджаны правадзейным членам акадэміі ў снежні 1928 года, а 26 кастрычніка 1929 года абраны віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук. (У сувязі з гэтым ён пакінуў працу ў Белпедтэхнікуме). На гэтай пасадзе паэт працаваў да апошніх дзён жыцця.

Да сённяшняга дня намаганнямі Інстытута літаратуры НАН Беларусі зберагаецца прыжыццёвы інтэр'ер рабочага кабінета Коласа ў галоўным корпусе акадэміі, а 3 лістапада 1969 года на яго сцяне была адкрыта мемарыяльная дошка. Побач, у двары з 1925 года працуе Навуковая фундаментальная бібліятэка Акадэміі навук, пастановаю ЦК партыі 16 жніўня 1956 года гэтай установе было прысвоена імя народнага паэта.

Амаль чатырнаццаць гадоў (з лістапада 1927 па чэрвень 1941) пражыла сям'я Якуба Коласа ва ўласным доме ў ціхім Вайсковым завулку побач са Шпітальнай вуліцай (сёння вуліца Фрунзе). Сёння гэта месца ўваходзіць у тэрыторыю Цэнтральнага дзіцячага парку імя Горкага — у бытнасць паэта там побач, за агароджай, быў шумны сталічны парк імя Прафінтэрна. Месца гэта ўганаравана памятнай шыльдай на будынку адміністрацыі парку.

Па сведчаннях відавочцаў, дом акаляў малады раскошны сад, расло шмат кветак — паэт заставаўся верным яе Вялікасці Прыгажосці ва ўсім, хаця і не быў выкшталцоным эстэтам.

На працягу 1928—1929 гадоў дом актыўна дабудоўваўся.

У гэтым доме паэт напісаў шэраг апавяданняў, легендарную "Дрыгву", прысвяціў малодшаму сыну Міхасю паэму "Міхасёвы прыгоды", займаўся перакладамі, нягледзячы на нэпэўнасць часу адважваўся на новыя маштабныя паэтычныя рэчы — былі пачаты паэмы "На шляхах волі" і "Рыбакова хата".

Пра ветлівасць, гасціннасць і спагаду Коласа і яго сямейнікаў не з чужых вуснаў ведала сям'я Купалы — некалькі тыдняў Іван Дамінікавіч з Уладзіславай Францаўнай жылі ў Коласавай хаце. Так "распарадзілася" наравістая Свіслач у 1930 годзе, калі падчас веснавой паводкі рака затапіла сядзібы мінчукоў, у тым ліку і Купалаў дом. У 1936 годзе на сядзібе Коласа з'явілася новая пабудова — гараж. Да 30-годдзя літаратурнай дзейнасці паэту была выдзелена легкавая машына, сам ён тэхніку ваджэння так і не засвоіў, жыхары сталіцы маглі бачыць паэта толькі на заднім сядзенні аўтамабіля — як адказны савецкі работнік ён меў шафёра.

Але спакойнае і ўтульнае жыццё было перарвана пачаткам Вялікай Айчыннай вайны. Днём 24 чэрвеня 1941 года дом Якуба Коласа быў зруйнаваны нямецкай бамбёжкай.

Вось як прыгадваў Канстанцін Міхайлавіч сваю даваенную сялібу пры першым наведванні вызваленага Мінска: "Я змог прыехаць у Мінск пасля яго вызвалення ад нямецкай навалы толькі ў канцы 1944 года. Я быў на папялішчы свайго дома. Разбурэнне і пажар так змянілі маю сядзібу, што я страціў арыентацыю ў сваім былым двары. Стаяў я на магіле свайго дома, у якім жыў з 1927 па 1941 г. У гэтай магіле шмат пахавана дабра і самае дарагое, што ў ёй пахавана, — мае кнігі, мая бібліятэка і рукапісы, яшчэ нідзе не абнародаваныя. Яны загінулі беззваротна. Я пайшоў на пажарышча Купалавага дома. Тыя ж руіны".

Пасля эвакуацыі Колас пераехаў з Масквы ў Мінск у маі 1945 года. Давялося пасяліцца ў невялікім драўляным доме каля галоўнага корпуса Акадэміі навук, поруч з будынкам Фундаментальнай бібліятэкі. Праз некаторы час да дома зрабілі двухпавярховую прыбудову, і ў такіх умовах Колас з сям'ёю пражыў амаль пяць гадоў. Менавіта тут ішла праца над паэмай "Рыбакова хата", "Казкамі жыцця", вершамі.

У 1952 годзе паэту быў пабудаваны двухпавярховы цагляны дом, па праекце архітэктара Георгія Заборскага (сённяшні адрас Акадэмічная, 5). У ім паэту давялося пражыць усяго некалькі гадоў.

Яшчэ адзін сумны Мінскі адрас Коласа — стацыянар Лечкамісіі, дзе паэт па некалькі разоў на год папраўляў сваё здароўе.

Насупраць Коласавай сядзібы, праз праспект, знаходзіўся Дом друку, дзе месціліся рэдакцыі рэспубліканскіх газет. Тут часта можна было сустрэць Канстанціна Міхайлавіча, які заходзіў сюды па справах публікацыі сваіх артыкулаў.

У маі 1945 года ў Маскве памерла Марыя Дзмітрыеўна. Труну з целам нябожчыцы на самалёце перавезлі ў Мінск, пахавалі на Вайсковых могілках. Над магілай жонкі Колас паставіў помнік з белага мармуру. Праз 11 год пасля смерці жонкі 15 жніўня 1956 года на гэтых жа могілках быў пахаваны і сам Колас. Праз некаторы час на магіле была ўстаноўлена мармуровая пліта, надпіс на якой сведчыў аб тым, што на гэтым месцы будзе збудаваны помнік. Ён быў устаноўлены толькі 3 лістапада 1970 года. У 1996 годзе побач з магілай свайго бацькі быў пахаваны заслужаны дзеяч культуры Беларусі Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч.

З лета 1956 года Камароўская плошча была перайменаваная ў плошчу імя Якуба Коласа, а вуліца Лагойскі тракт у вуліцу імя Якуба Коласа. У 1972 годзе да 90-годзя з дня нараджэння паэта ў яе цэнтры быў устаноўлены адліты ў Ленінградзе помнік работы скульптара Заіра Азгура, архітэктурнае рашэнне вядучых спецыялістаў Юрыя Градава, Леаніда Левіна і Георгія Заборскага. 9-метровы бронзавы дзядзька Якуб воляю аўтара застыў у глыбокай задуме, гледзячы на яго кожны з нас у глыбіні душы адчувае, што пясняр наш думае аб мінулым і будучым Беларусі. У той час, калі Колас пазіраваў Азгуру для гэтага скульптурнага партрэта, па сведчаннях апошняга, паэт задуменна глядзеў удалеч і цытаваў самыя праніклівыя філасофскай тугою радкі з "Новай зямлі":

Прайсці яшчэ раз, азірнуцца,
Убраць з дарог каменні тыя,
Што губяць сілы маладыя...

Поруч з паэтам героі яго твораў — Сымон і Ганна (паэма "Сымон-музыка") і дзед Талаш з сынам Панасам, іх выявы сімвалізуюць лірычную і гераічную плыні ў творчасці Коласа. У 2001 годзе плошча была абноўлена і стала любімым месцам адпачынку мінскай моладзі.

Не памылюся, калі скажу, што самай прыгожай і стылістычна вытрыманай станцыяй Мінскага метрапалітэна стала станцыя "Плошча Якуба Коласа".

Мінскія адрасы Коласа... Іх так шмат, яны знаёмыя кожнаму з нас, нягледзячы на тое, што большасць будынкаў не захавалася да гэтай пары, аднак, іх творчая аўра працягвае абуджаць нашы сэрцы, помніць мінулае дзеля будучыні.

Ганна ЗАЙЦАВА

Пра вялікіх ведаць хочацца як мага болей. Словы гэтыя ўзрушаюць:

"Аднойчы Канстанцін Міхайлавіч пайшоў на рынак, каб купіць воз дроў. Абходзячы рады вазоў з дрывамі, ён пачуў жаночы плач. Там ужо збегліся людзі і стаяў цэлы натоўп. У дзяўчыны нейкі злыдзень украў грошы, і ў яе слязах і прычытаннях было гэтулькі праўдзівага і глыбокага гора, што Колас аддаў ёй усе грошы, якія былі ў яго кішэні..."

«Аддасце, калі буду бедны я»

Блізка знаўся народны паэт з прафесарам Іванам Замоціным. З ім працаваў у БДУ, Акадэміі навук, бывалі адзін у аднаго дома. Не стала вучонага — Якуб Колас не пакінуў яго сям'ю.

Звычайны, здаецца, жэст — памагчы ў бядзе чалавеку. Але ж як часта мы ў падобных выпадках становімся "глухімі" і "сляпымі". І не толькі беззваротна баімося раскашэліцца, а нават часова разлучыцца з пэўнай сумай не жадаем.

Я знарок пачаў з такога эпізода, бо, што таіць, калінікалі даводзіцца чуць, нібыта Якуб Колас вылучаўся празмернай ашчаднасцю. Так, ён быў эканомны. Разам з тым пясняр вызначаўся шчодрасцю і чуласцю. Пра гэта гаворыць не адна Ванда Лявіцкая (дачка Ядвігіна Ш.), словы якой прыведзены ў пачатку, але ж і іншыя аўтары ўспамінаў, што змешчаны ў зборніку матэрыялаў аб жыцці і творчасці Якуба Коласа "У сэрцы народным" (выдавецтва "Навука і тэхніка", 1967).

Калега народнага паэта па выкладчыцкай дзейнасці ў Белпедтэхнікуме і БДУ Язэп Сушынскі прыгадвае:

"Ён (Я. Колас. — **І. К.**) лічыў, што студэнты павінны абавязкова бываць у кіно і тэатрах і выяўляў, па якой прычыне хто не бывае. Калі высвятлялася, што некаторыя студэнты не мелі на гэта грошай, вадзіў дзяўчат і хлопцаў за свае грошы. Я не раз, наведваючы кіно ці тэатр, бачыў Коласа ў акружэнні моладзі..."

Многа цёплых слоў выказвае ў адрас свайго любімага настаўніка былая студэнтка Белпедтэхнікума Ніна Загурская. Неяк была яна з сяброўкай запрошана Коласам у госці. Той вечар застаўся ў памяці незабыўным.

"Калі мы апраналіся ў пярэдняй, — успамінае яна, — Марыя Дзмітрыеўна вынесла кожнай з нас па вялізнаму пакунку. Мы, хоць і адмаўляліліся, але памяталі просьбу сяброўак і ўзялі. Якуб Колас крыху правёў нас, прахожыя азіраліся на нашу вясёлую кампанію. Вярнуліся дадому а 12-й гадзіне. Калі разгарнулі пакункі, нашы дзяўчаты, убачыўшы так багата ежы, ахнулі... Доўга мы не маглі заснуць, успамінаючы вечар, які правялі ў Коласа. Усе сышліся на адным: жонка ў Коласа прыгожая, добрая і сардэчная жанчына, яна ва ўсім падыходзіць яму".

Блізка знаўся народны паэт з прафесарам Іванам Замоціным. З ім працаваў у БДУ, Акадэміі навук, бывалі адзін у аднаго дома. Не стала вучонага — Якуб Колас не пакінуў яго сям'ю.

"Некалькі разоў у цяжкі для мяне час, — піша дачка прафесара Т. Замоціна,— ён пасылаў грошы і мне з такой жартаўлівай прыпіскай: "Дарагая Таня! Пасылаю, колькі магу. Спяшацца вяртаць не трэба. Буду бедны, тады падтрымаеце".

У адным з пісьмаў пясняр папярэджваў свайго адрасата:

"Дарагая Таццяна Іванаўна!

У далейшым падобных высылак не рабіце: я поўнасцю забяспечаны чалавек, і не толькі я, але і мае сыны.

Пішыце мне наогул — мне будзе вельмі прыемна прачытаць пісьмы дачкі прафесара Івана Іванавіча Замоціна, якога я вельмі люблю і паважаю".

Спрыяў матэрыяльна дзядзька Якуб і зусім незнаёмым людзям.

З успамінаў Андрэя Макаёнка:

"Да яго часта звярталіся з просьбамі, нават дакучалі. А бывала і так, што Якуб Колас разумеў сам, бачыў сам, у чым чалавек мае патрэбу, і раптам нечакана, як бы знянацку гэта дапамога прыходзіла. І я вам скажу, любіў ён падобныя сюрпрызы. Бывала, зробіць такое (чалавек нават і не ведаў, не чакаў), а потым з усмешкай добрай, з дзядоўскай усмешкай паглядае. І цяжка было сказаць, каму болей прыемна — ці таму, каму ён дапамог, ці яму самому".

Яшчэ раз пра шчодрасць Коласа і яго сям'і.

Успамінала аднакурсніца Коласавага сына Юркі па вучобе ў Белдзяржуніверсітэце Марына Казлова:

"Паступілі мы ўсе ў 35-м годзе ва універсітэт і закончылі першы курс паспяхова. На другім курсе бліжэй пазналі адзін аднаго. Былі вельмі дружныя паміж сабой. Гэтае пабратымства перайшло як бы ў радство. Калі б цяпер дружылі так, як тады!.. Новы 1937 год вырашылі сустрэць разам. Але дзе ж знайсці месца? І вось Юрка запрапанаваў свой дом. І мы, увесь курс, 60 чалавек, апынуліся ў Коласавым доме, што стаяў у парку імя Горкага. На другім паверсе — зала. Як жа ўвайсці, як сябе паводзіць, што гаварыць? Як сядзець за сталом? Гэта ж дом вялікага пісьменніка, якога ведалі са школы па яго творах. Прыйшлі і прапанавалі дапамогу хоць на кухні. Нам сказалі: "Нічога не трэба. Вы — госці". Селі за стол. Нагатавана ўсяго было як для самых дарагачаных гасцей. Кожнаму — прыбор, чарка. А якія напіткі! Мы тады жылі толькі на стыпендыю, і для нас гэты пачастунак быў "царскі".

Вельмі запомнілася мне Марыя Дзмітрыеўна, маці Юркі. Яна была гаспадыняй усяго застолля. Даглядала кожнага, хадзіла вакол. Калі закончылася частаванне, мы пачалі паказваць сваю самадзейнасць. Нам дазволілі і спяваць, і танцаваць, і іграць. Весяліліся колькі хацелі. Разышліся пасля поўначы".

У музеі Якуба Коласа захоўваюцца сотні квітанцый да паштовых пераводаў — куды і каму пясняр слаў грошы.

З успамінаў Коласавага сына Данілы:

"Эпісталярная спадчына Я. Коласа вельмі багатая і змястоўная. Вядома, сярод мноства пісьмаў да яго былі і кур'ёзныя. Я прыгадваю, як у канцы 40-х гадоў з Заходняй Беларусі было атрымана пісьмо ў такім тэлеграфным стылі: "Глыбокапаважаны Канстанцін Міхайлавіч! Мне трэба купіць каня. Вышліце чатыры тысячы рублёў. Вось і ўсё". Далей ішоў подпіс. Адказ быў такі: "Паважаны таварыш! Уступайце ў калгас. Будзеце забяспечаны канём. Вось і ўсё. Якуб Колас". Але вось да яго звяртаецца хворы чалавек. Просіць дапамагчы. Абяцае, што, як толькі выздаравее, адразу ж разлічыцца. Выслаўшы адпаведную суму, Колас піша: "Папраўляйцеся, станавіцеся на ногі. Аддасце, калі буду бедны я".

Іван КУРБЕКА

На здымку: Якуб Колас з землякамі, 1952 год.

Мой родны кут...

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі я пайшоў вучыцца ў беларускую сямігадовую школу, дзе ўпершыню выкладанне вялося на роднай мове. Там я пачаў вывучаць творчасць Якуба Коласа і Янкі Купалы. Працягваў вывучаць творы беларускіх пісьменнікаў у Нясвіжскім педагагічным вучылішчы (1947—1948). А класным кіраўніком быў у мяне паэт Паўлюк Прануза. Ён жа выкладаў родную мову і літаратуру. Затым вучоба ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У.І. Леніна (філалагічны факультэт), дзе ў поўным аб'ёме вывучалі творчасць Якуба Коласа і Янкі Купалы.



Дыпломную работу абараняў па рамане Я. Коласа "На ростанях" (кіраўнік Вольга Васільеўна Казлова). У мяне ў кватэры вісяць партрэты Я. Коласа і Я. Купалы. Я кожны дзень іх бачу, вітаюся з імі, успамінаю іх творы: паэмы "Новая зямля", "Сымон-музыка", "Рыбакова хата", раман "На ростанях"... Я. Коласа, п'есы Я. Купалы: "Паўлінка", "Тутэйшыя", паэму "Курган" і вершы. Творы народных паэтаў — гэта энцыклапедыя жыцця беларускага народа... У іх творах усё беларускае, наша блізкае і добра нам зразумелае. Чытаеш іх, і душа радуецца за наш народ, за нашых пісьменнікаў і паэтаў.

Мне пашчасціла хоць раз, але бачыць Я. Коласа на III-м з'ездзе пісьменнікаў Беларусі, што праходзіў 18—20 верасня 1954 года, які адбыўся ў будынку тэатра імя Я. Купалы.

Я. Колас адкрыў з'езд. Я, як цяпер, яго бачу. Гром апладысментаў. Ідзе павольна, надзяе акуляры і гаворыць уступнае слова, цытуе верш А. Пушкіна "Прарок". Выбралі рабочы прэзідыум. Слова для даклада атрымаў Пятрусь Броўка, старшыня беларускай пісьменніцкай арганізацыі. У прэзідыуме разам з Коласам сядзеў першы сакратар ЦК КПБ Мікалай Патолічаў. Колас трымаў перад сабой часопіс "Полымя". У час перапынкаў ля Коласа было многа пісьменнікаў. Так мне і не ўдалося даступіцца да яго і пагутарыць. Шкада! Я і мая жонка, Міцкевіч Дзіна Канстанцінаўна (лінія па Коласавай радні, родам з вёскі Мікалаеўшчына) не раз былі ў музеі Я. Коласа. За Коласам у свой час даглядала яго родная сястра Лена. Калі яна даведалася, што мая жонка з Мікалаеўшчыны (яна добра знала яе бацькоў), то многа расказвала пра брата, паказала нам рабочы кабінет паэта, нават яго спальню. За гэтым сталом ён і памёр 13 жніўня 1956 года. У гэты дзень Я. Колас быў у ЦК КПБ са сваім лістом аб стане беларускай мовы ў краіне. Яго там чамусьці ніхто не прыняў, ліст зарэгістравалі. Ён і паехаў дамоў. Пазней гэты ліст быў надрукаваны ў "ЛіМе" ці "Звяздзе". Чытаў. Варта было б яго надрукаваць у юбілейны 125 год Коласава нараджэння. Аб смерці Я. Коласа даведаўся з газеты "Правда", дзе быў змешчаны некралог, што памёр народны пісьменнік Беларусі. У гэты час я быў на афіцэрскіх курсах у горадзе Пенза. Не змог быць на яго пахаванні. А так хацелася пабачыць. Я вельмі добра ведаў малодшага брата Коласа Юзіка, некалькі раз сустракаліся, гутарылі. Ён чытаў паэму "Новая зямля" на памяць. Да Коласа часта звярталіся землякі з рознымі просьбамі і дапамогай. Уважліва слухаў, ніколі не адказваў у дапамозе.

"Дзядзька Юзік" (так звалі яго ў народзе) расказаў мне пра такі выпадак. Пасля вайны ў яго нехта ўкраў карову. І хтосьці падказаў, што бачыў яго карову ў Стоўбцах на двары... Паехаў, знайшоў, убачыў. І адразу паехаў у Мінск да свайго брата Я. Коласа. Расказаў яму пра сваё вялікае гора — укралі карову, знайшоў на двары... (назваў у каго). Колас выслухаў уважліва і кажа Юзіку: "Каровы ты свае не бачыў, на табе грошы і купі сабе карову, даі яе і пі малако і маўчы"... І грэшна, і смешна! Але факт быў. Я быў запрошаны на ўстаноўчы сход у музей Я. Коласа ў Мінску, на якім быў утвораны Міжнародны літаратурны фонд Я. Коласа. Старэйшы сын паэта Даніла быў цяжкахворы, таму не быў на сходзе. Але дазволіў удзельнікам сходу наведаць яго дома. І мы пабылі, пагутарылі. Я не раз з Данілам сустракаўся ў Мікалаеўшчыне, Смольні, Акінчыцах... Расказваў пра бацьку, адказваў на пытанні. Слухаў не раз малодшага сына Я. Коласа Міхася, які выдатна чытае на памяць творы бацькі, расказвае пра яго жыццё і літаратурную працу.

Часта бываў на "Каласавінах", якія праводзяцца штогод у Мікалаеўшчыне і Стоўбцах. У гэты час можна было сустрэцца з беларускімі пісьменнікамі, што я ахвотна рабіў.

Што адносна брата Міхася, то гэты беларускі празаік, па волі лёсу жыў у ЗША, дзе і памёр, маючы больш за 90 гадоў. Пісаў ён прозу, публіцыстычныя артыкулы, займаўся перакладамі, педагогікай. Яго літаратурны псеўданім Антось Галіна. У гэтым годзе спаўняецца 110 гадоў з дня яго нараджэння. Пара выдаць на Бацькаўшчыне яго выбраныя творы і напісаць пра яго жыццёвы і творчы шлях. Ён гэта заслужыў.

Якуб Колас — вялікі беларускі пісьменнік, вядомы дзяржаўны дзеяч, яго творы перакладзены на многія мовы краін свету, творчасць яго вывучаецца і даследуецца на філфаках ВНУ славянскіх краін, яго шануюць і паважаюць, сярэдняя школа ў Мікалаеўшчыне носіць яго імя, калгас носіць назву "Радзіма Я. Коласа", яго імем названы вуліцы... М. Горкі ў 1910 годзе напісаў украінскаму пісьменніку М. Кацюбінскаму: "У Беларусі два паэты: Якуб Колас і Янка Купала — вельмі цікавыя хлопцы! Так прымітыўна — проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым бы трошкі такіх якасцей! О Божа! Вось добра было б. А ў лісце да А. Чарамнога так піша пра нашых песняроў: "Ці ведаеце вы беларускіх паэтаў Я. Коласа і Я. Купалу? Я нядаўна пазнаёміўся з імі — падабаюцца! Проста, задушэўна і, відаць, сапраўды — народна".

Вікенцій МАРОЗ

Фота Віктара Кавалёва

Наста КУДАСАВА. *Нарадзілася ў горадзе Рагачове ў 1984 годзе. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вучылася ў магістратуры. Жыве ў Гомелі. Друкавала вершы ў шматлікіх выданнях.*

У мінулым годзе выйшаў у свет яе першы паэтычны зборнік (**"ЛІСЬЦЕ МАІХ РУК"**, Мінск, выдавец І. П. Логвінаў, 2006, 75 стар., 300 экз.)



"Моим стихам, как драгоценным винам, Настанет свой черёд."

Марына ЦВЯТАЕВА

"З еўрапейскай паэзіі прапаў крык. Засталося жангліраванне словамі, майстэрства акрабатаў і эстэтаў. Эквілібрыстыка спустошаных."

Эміль ЧАРАН

Напершапачатку ў мяне быў адзін эпіграф да свайго тэксту, але днямі, пазнаёміўшыся з новымі кніжкамі, я вырашыў дастасаваць і другі. Кніжкі тыя называліся проста: **А. Глобус** *"Казкі"* і **калектыўны зборнік** маладых аўтараў пад хадановічаўскай назвай-перафразам *"in Вільня veritas"*.

Апроч усяго іншага ўдосталь я начытаўся там лаянкавай і вобразнай вульгаршчыны ды цынічнасці, ад пратэсту да якіх паўстаў не толькі мой чалавечы інстынкт, але і гарманічна арганізаваны чалавечы мозг... Але ўсё тое замешана, як рэдкі цэментны раствор для калектыўнай забудовы чарговага літаратурнага комплексу, — на абсурдзе і правакацыях... Няхай. Разбяромся з гэтым трохі пазней, магчыма, і *кулуарна*...

А пакуль пра заяўленае вышэй.

Колькі гадоў таму з дабрадзейнага пасыла В. Аксак я пазнаёміўся з вершамі студэнткі БДУ Насты Кудасавай. Мне яны падаліся вартымі ўвагі, таму, асцярожна адрэдагаваўшы, я перанабраў іх з яе школьнага сшытка на свой хатні камп'ютэр, каб нарэшце выдрукаваць асобнай нізкай у тыднёвіку "ЛіМ". Пасля таго Наста трохі "задрала нос", забылася на свайго *рэдактара* і пайшла ў мастацкі свет **сваім** шляхам. Рэдка такія **натуральныя** шляхі бываюць простымі, найчасцей — небяспечнымі як для ўласнага духу так і для мастацкай выявы аўтарскай творчасці. Прыкладна такім шляхам старажытныя паэты *даходзілі* да астравоў Ітака і Лесбос, зачараваныя галасамі сірэн і міфалагічных багоў — адны, каб выжыць, другія, каб загінуць... Для Насты ж галоўным было — не размінуцца з Парнасам... Сёння можна сказаць, што яна дапяла яго, выстаяла, дамаглася пэўных "паэтычных прэферэнцый" і нават прэтэндуе на большае...

Чаму я абраў менавіта яе за своеасаблівы сімвал апошняга паэтычнага пакалення ў сучасным беларускім літаратурным працэсе, сказаць цяжка. Хутчэй за ўсё, за неардынарную вольналюбівую вобразную скіраванасць.

Гэта той выпадак, калі **паэт**(ка) на самым пачатку свайго творчага шляху ставіць перад сабой не толькі мройна-тэарэтычныя планы, але і намагаецца выяўляць высокія творчыя задачы, як, да прыкладу, у гэтым вершы, дзе яна спрабуе вызначыць сутнасць самой паэзіі:

Мы пішам прозу.
Так бяспола
І так сур'ёзна:
Толькі розум —
Разгром паэзій.
Пішам прозу:
Аз, букі, ведзі...
Дома водар
Жыцця і піва,
Пенны подых
Радкоў крыклівых.
Злыя дозы
Нам піць дарэшты...
Пішам прозу,
А самі — вершы...

Тут, як мяркую, Н. Кудасава хоча сказаць, што сёння нашы (намі названыя) *паэты* не выяўляюць у сваіх вершаваных тэкстах усёй сваёй чалавечай сутнасці і паўнаты, ціха скажам, не распранаюцца перад чытачом да апошняга фігавага лістка, каб даастатку выявіцца ў сваіх паэтычных вобразах, не выказваюць усёй шчырасці ўласнай душы і розуму, як таго вымагае высокае мастацтва. Але ж служэнне Паэзіі палягае ў ахвяраванні сабой дзеля Яе бессмяротнасці. Усё іншае ёсць несапраўднае — штучныя падробкі рамеснікаў, якія прагнуць ад літаратуры часовых матэрыяльных выгод і бутафорскай славы.

Дазволю сабе невялікае адступленне. Зусім нядаўна зайшла да мяне ў рэдакцыю адна паэтка і пачала чытаць мне літаратуразнаўчую лекцыю, зыходзячы з таго, што тры гады таму (?!) я неаб'ектыўна і па сутнасці памылкова *"ЛеГАЛізаваў"* яе зборнік вершаў... Я, не асабліва запальваючыся, стаічна выслухаў яе напраўду грунтоўную навуковую "натацыю". Прытаміўшыся (у тым ліку і асабістым няскладным жыццём), яна падпісала мне свой, усё той жа, зборнічак, прымірэнча параіўшы на развітанне перачытаць яго больш уважліва яшчэ раз, каб нарэшце заўважыць не толькі аўтарскія, але і свае ўласныя філалагічныя хібы... Пасля таго, як яна выйшла, я адгарнуў вокладку і, ужо загадзя настроіўшыся на "адэкватны ўдар у адказ", прачытаў надпісаны мне аўтограф: *"Леаніду Галубовічу — Паэту — ад аўтара."* Пэўна, паэтка тым самым разлічвала *ўкалоць* маё **крытычнае** самалюбства, але каб ведала яна (а мо й ведала), які ўнутраны прыліў творчай самапавагі выклікаў у мяне гэты подпіс пасля дзесяці гадоў як я пакінуў пісаць вершы! Аказваецца, на яе разуменне, у крытыцы я — паэт. Ды ўсё ж, спадзяюся, што пішучы і ў такім, названым ёй стылі, я застаюся аб'ектыўным па сутнасці і не надта памылковым у сваіх поглядах на паэзію і на паэтаў у прыватнасці. Зрэшты, час пакажа... Як пісала М. Цвятаева: *"Першы абавязак крытыка паэзіі — не пісаць самому дрэнных вершаў. Ва ўсякім разе — не друкаваць. Як я магу верыць голасу, да прыкладу, N., які не заўважае пасрэднасці ўласных вершаў?"* А калі казаць яшчэ больш шчыра, то я пішу ад імя сярэднестатыстычнага беларускага чытача, прыхільніка нацыянальнай паэзіі, а не ад імя штатнага супрацоўніка Інстытута літаратуры, якому найперш цікава літаратуразнаўчая проза вакол яе вялікасці Паэзіі.

Вось і Н. Кудасава, калі б яна, рыхтуючы гэты зборнік да выдання, прыслухалася да сваёй унутранай самакрытычнай рэфлексіі, то даверылася б больш вопытнаму рэдактару, чым сама... Шкада, бо ў свет выйшла тое, што маем. Зрэшты, і з тым маем адметны і арыгінальны паэтычны зборнік...

Скарыстаўшы творчы вопыт сваіх папярэдніц, яна па меры здольнасці згарманізавала ў сабе інтэлект Рублеўскай і прыродную стыхію Баравіковай (зрэшты, тут могуць фігураваць іншыя імёны, што не мяняе самой сутнасці літаратурнай вучобы). Іншая справа, што Н. Кудасава па-маладому безразважна і апантана захоплена непадробным талентам выдатнай расійскай паэткі М. Цвятаевай. Нярэдка такое захапленне дае адмоўны эфект, як у гэтым вось абсурдным і самапрысудным выпадку: *"заМАРЫНАваная Вашымі вершамі"*. Чамусьці многія з беларускіх паэтаў захопліваюцца (ці, як колісь пазначаў цяперашні *віленскі* паэт А. Мінкін, *"наследуюць"*) а прасцей скажам, падпадаюць пад уплыў рускай класікі: Ясеніна, Маякоўскага, Ахматавай, Пастэрнака, Мандэльштама, Рубцова, Бродскага і г. д. Ды рэдка хто "наследуе" беларускую нацыянальную класіку (за выняткам такіх імён як Багдановіч і Разанаў). Янку Купалу, да прыкладу, адкрыта не наследуюць, а калі наследуюць, то прымітыўна, слепа, да непрыхаванага асацыятыўнага плагіяту... Пад Купалу (да 1929 года) падрабіцца ўвогуле немагчыма, паколькі гэта **натуральны** нацыянальны талент, а Прыроду, як вядома, ніякай штучнасцю і версіфікацыйнымі вымогамі не падменіш...

Унутраны свет і псіхалогія жаночай прыроды — вось асноўныя кропкі чалавечага болевыяўлення паэзіі Н. Кудасавай. Тэма набліжаная да цвятаеўскай, але, скажам вобразна, у дадзеным выпадку пальцы піяніста аказаліся не настолькі доўгімі, каб сыграць Баха поўным рэгістрам...

Адразу без асаблівага націску чорным шрыфтам акрэслю, найперш для самой паэткі, відавочныя хібы.

Трэба няшчадна вычышчаць русізмы. Назаву некаторыя. На старонцы трэцяй: *"колькі ж нам маёвым, **намаяцца**"* (пэўным чынам яго можна назваць "цвецізмам" ад прозвішча М. Цвятаевай). Тым больш, што на чацвёртай старонцы той жа месяц **май** ужо называецца *траўнем.* А верш на шостай старонцы, складваецца ўражанне, увогуле напісаны дзеля рыфмы; тут, як кажуць, наварочана ўсяго ўсякага, ад арыгінальных знаходак да пустаслоўных бразготак:

Тваю вольніцу
Адным махам
Скарыць юру,
Дажду спеламу...
Мы звар'яцелыя
Каламбуры!
Мы простора
Беспакараная —
Жывы ранак...
*Жывая **тора**...*

Дарэчы, "Тора" чамусьці з малой літары. Паэзія — гэта каханне без узаемнасці, астатняе — проза (пра што вельмі цьмяна на старонцы сёмай). Але што такое *"**няздзейсненае** каханне"*?!

Нярэдка Кудасава, як падбітая птушка, правальваецца ў паветраныя ямы — і тады абрываецца рытм, рыфма а падчас і сэнс наступнага радка, якому не пакідаецца іншага выбару, апроч як чапляцца за рэльефны абрыс чарговай страфы, бы адчайнаму альпіністу за выступ скалы... Да прыкладу, у вершы "На тым баку" (г.зн. па-за зямным жыццём):

На тым баку я ўсплыву шчасліва
*ў **бязмернасці безмаральнасці**.*
На тым баку я зраднюся з нівай,
каб з новым сэрцам наверх расці.
Я буду чакаць Вас —
наскрозь жывая.

Альбо ў вершы прысвечаным Шагалу:

І ўпэўнена бачу
ў вільготнай прасторы
*няскоранасць **Торы***
ў бязвыйгрышным матчы...

Тут, заўважце, Тора ўжо з вялікай літары. Вершы на старонках 10, 11, 12, 13, 14, 15, 16 — гэта шкалярская стружка з вучнёўскага пісьмовага стала.

І на тым досыць псаваць настрой прыгожай дзяўчыне.

Цяпер пра галоўнае. Хто ўдумна ўчытаецца ў вершы Кудасавай, той уловіць па-за агучаным мной "цвецізмам" і яе ўласны адметны голас. Скажам, гэтыя тры геніяльна-простыя радкі:

Вясна.
Вуснам
Цесна.

Тут зместу на цэлую паэму (не тое, што ў В. Брусава: *"О, закрой свои бледные ноги!.."*) Паэтычны цуд з трох словаў (а не літар, як у некаторых нашаніўскіх канкурсантак). Такі вобраз з галавы не *выцягнеш*, ён злятае з Таго, што над ёй. Альбо вось гэты выдатны верш (выяўлены з прадчуванняў, як душэўных так і цялесных):

Дотык вуснаў і ...знікні!
Толькі сплю,
Толькі сплю...
Разам з ранкам стазыкім
Я свой боль наталю
Нахілюся лісьліва
Перад лёсам маім...
Можа, стану шчаслівай?
Толькі дым...
Толькі дым...
За ўсе скарбы і грошы
Я цябе не куплю...
Дотык вуснаў... Навошта
Толькі сплю?..
Толькі сплю...

Бадай, інтрыгуючай для нашага цнатлівага чытача падасца і тэма лесбіянства, пазначаная ў зборніку Кудасавай. І тут не трэба іранічна пацепваць плячыма, бо менавіта зварот праз сябе да міфічных вобразаў эпохі Сапфо ўяўляецца мне тэмай вельмі арганічнай, высока пачуццёвай і духатвотворнай, вядома, калі яна не выходзіць за межы мастацтва, эстэтыкі і маралі. Хіба гэта не паэзія:

А на Лесбасе сёння восень
І на ростанях нашых сцёгнаў
Агаломшана млеюць стогны
І хмялее радок рукі

І гэты, адзін з лепшых у сённяшняй беларускай паэзіі верш пра каханне я прачытаў менавіта ў Н. Кудасавай:

Табой
Напоўніцца
Бяссоніца,
Маўчанне загучыць —
Табой.
Вачамі прачытай
Жаданне
І будзь са мной
Да развітання —
Да скону ночы
Будзь са мной!
Вазьмі мяне ў свой
Вір ці вырай,
Да беспрытомнасці —
Бяры!
Няхай згарыць душа жывая
За недазволены парыў...
Пакуль не пакарае ранне
За грэх салодкі —
Будзь са мной!
Па вуснах прачытай жаданне
І будзь са мной
Да развітання —
Да ночы скону
Будзь са мной!

Якая, блізкая да фізічнай, узнёсласць чалавечых пачуццяў вырываецца вулканічнай лавай з гэтага верша! Усімі фібрамі душы і плоці чытач адчувае, што верш *здарыўся*, што ён мусова не вытужваўся вонкі з аўтарскай істоты. Што паэту была іскра божая... Я абсалютна ўпэўнены, што калі Н. Кудасава будзе сама ткаць палатно свайго ўласнага *мастацкага* лёсу, які будзе вынікаць з яе жыццёвага выраку — абавязкова да яе прыйдуць новыя творчыя ўдачы, а неўзабаве выявіцца і адметны паэтычны плён. Паэту грэх хавацца ў сабе ад сябе самога. Ён павінен выйсці з лабірынтаў празаічнага быцця на творчую, адным Богам абмежаваную, волю... Каб ужо тады, як апошнія, вышаптаць спраўджаныя жыццём словы:

"Вышывала — вышыню
вышыла..."

Таму наастатку маю сказаць, што зборнік Насты Кудасавай хоць і ўспрыняўся неадназначна, аднак прыйшоўся мне па духу. Не ўразіў гэтак ярка, як начное неба маланка, але адназначна запаў у памяць. На мой погляд, гэта адзін з найбольш адметных і сур'ёзных дэбютаў апошняга часу ў сучаснай нацыянальнай паэзіі. І таму нашай камернай паэтычнай аўдыторыі (калегам і прыхільнікам краснага пісьменства) трэба ўслухацца ў гэты праніклівы голас і ўрэшце азвацца яму — каб не пакінуць яго ўладальніцу на перыферыі ў элегічнай скрусе і бязмоўна-немачнай адзіноце...

ЛеГАЛ

(legal@lim.by)

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"
РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Леанід ГАЛУБОВІЧ
Віктар КАВАЛЁЎ
Янка ЛАЙКОЎ
Жана МАЛЕВІЧ (адказны сакратар)
Мікола СТАНКЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара)
Ірына ШАЎЛЯКОВА

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-66-71
літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі— 284-44-04
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: LiM_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнеце: www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ". Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый. Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3417
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 31.10.2007 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ —5891

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686